Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
26 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 120 (27978) Кошт 2300 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як выбраць добры «гарачы» тур?

СТАР. 5



Афіцэрскі гонар Яўгена Мікульчыка

СТАР. 6



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Мы разумеем, што сёння ў моладзі ёсць патрэба падарожнічаць, сустракацца з чымсьці новым. Давайце будзем ёй больш паказваць. Звяртаюся да прафсаюзных арганізацый нашых навучальных устаноў. Давайце не менш як 15 працэнтаў бюджэту прафсаюзных сродкаў будзем траціць на тое, каб арганізоўваць турыстычныя паездкі. У Беларусі сёння больш за тысячу арганізацый, якія займаюцца турызмам. Большасць з іх прапануюць выезд за мяжу. У той жа час ёсць шмат цікавых мясцін і ў нашай краіне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15380,00 | ▲ |
| Еўра | 17186,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 281,80 | ▼ |
| Укр. грыўня | 727,19 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# БОНДАРАЎ УНУЧАК



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Аляксандр АЛЬХОВІК, бондар з вёскі Паўстынь Слуцкага раёна, пры сустрэчы заўсёды паказвае свае новыя вырабы — бочачкі, балеі, цэбры. У вольны час, а Аляксандр Уладзіміравіч выкладае працоўнае навучанне ў мясцовай школе, ён робіць і сувеніры, і сапраўдны посуд для гаспадаркі — на 50, 100, нават на 200 літраў.**

**А яшчэ Аляксандр Уладзіміравіч вучыць свайго ўнука (дарэчы, поўнага цёзку) сямігадовага Аляксандра, які праводзіць у дзеда ўсё лета, усім прыёмам бондарства: і трымаць у руках кіянку і стальвагу, і збіраць і замацоўваць разам дубовыя клёпкі, а галоўнае — адносіцца да працы з душой.**

■ Прыёмная кампанія—2015

## ЧАМУ АБІТУРЫЕНТЫ НЕ МОГУЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЬ ПЛОШЧУ КУХНІ?

**Цэнтралізаванае тэсціраванне ў нашай краіне набліжаецца да свайго завяршэння: абітурыентам засталося здаць толькі тры дысцыпліны. А ў Расіі тым часам ужо актыўна абмяркоўваюцца вынікі Адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ).**

Напрыклад, той факт, што сярэдні бал АДЭ па фізіцы істотна вырас, парадаваў не ўсіх. Ёсць меркаванне, што кантрольна-вымяральныя матэрыялы па гэтым прадмеце аказаліся надзвычай простымі і шаблоннымі. Між іншым, сёлетнія тэсты стануць кропкай адліку пры падрыхтоўцы абітурыентаў будучага года. Таму дэманстратыўнае зніжэнне іх складанасці можа пацягнуць далейшую дэградацыю ведаў выпускнікоў.

Паказчык па профільнай матэматыцы, патрэбнай тым, хто здае гэты прадмет пры паступленні, вырас больш чым на тры балы. Істотна выраслі таксама сярэднія тэставыя балы па грамадазнаўстве, хіміі, рускай мове і літаратуры. Дарэчы, расійскі міністр адукацыі ўжо



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

выказаўся за ўвядзенне ў перспектыве на экзамене па гісторыі і рускай літаратуры вуснага кампанента. «Безумоўна, гэта яшчэ патрабуе абмеркавання прафесійнай супольнасцю, паколькі першачарговая задача АДЭ — аб'ектыўная ацэнка вучэбных дасягненняў выпускнікоў школ.

СТАР. 7

■ Надвор'е

## НАВАЛЬНІЦЫ З АТЛАНТЫКІ

### А ў суботу на ўсходзе чакаецца моцны парывісты вецер

**У пятніцу надвор'е на тэрыторыі нашай краіны ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. Пра гэта паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды.**

Таму будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у многіх раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей пройдуць дажджы. Чакаецца ўмераны паўночны вецер, а максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 18-24 градусы. Атмасферны ціск будзе падаць.

У выхадныя тэрыторыя Беларусі трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску, калі да нас завітаюць умерана цёплыя атлантычныя паветраныя масы. Месцамі пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Вецер паўночна-заходні ўмераны, аднак у суботу па ўсходзе краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы будзе трымацца ў межах 7—14 цяпла, а ўдзень паветра прагрэецца да плюс 17—24 градусаў.

### РЭКІ ПРАЦЯГВАЮЦЬ МЯЛЕЦЬ

Спецыялісты гідраметцэнтра краіны адзначаюць, што і напрыканцы тыдня на большасці рэк Беларусі будзе працягвацца спад узроўняў вады з сутачнай інтэнсіўнасцю 1-11 сантыметраў. Праца рачнога транспарту будзе ўскладнена на Заходняй Дзвіне на ўчастку Сураж — Віцебск і ў Полацку, на Нёмане каля Гродна, на Дняпры на ўчастку Магілёў — Рэчыца, на Бярэзіне ў Барысаве і Светлагорску, на Сожы каля Гомеля, на Прыпяці ў Мазыры і Піне ў Пінску. Тэмпература вады ў рэках і вадаёмах знаходзіцца ў межах ад 16 да 22 цяпла.

СТАР. 3

# ПАТРАБУЮЦЦА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ І АДДАНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЕ

**Прэзідэнт разгледзеў кадравыя пытанні, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

Каўхуту Андрэя Марленавіча — міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

Ахрамовіча Генадзя Уладзіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Азербайджанскай Рэспубліцы;

Назарука Ігара Васільевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Арменія;

Аляксандрава Аляксандра Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Куба;

Курдзюкова Валерыя Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Чэшскай Рэспубліцы;

Турчына Аляксандра Генрыхавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Гомельскай вобласці;

Раўнейку Сяргея Васільевіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Гродзенскай вобласці;

Доўнар Вольгу Аляксандраўну — намеснікам старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта;

Машніну Алену Мікалаеўну — членам праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на прызначэнне:**

Фёдаравай Алы Генадзьеўны — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у горадзе Беластоку (Рэспубліка Польшча);

Токара Мікалая Васільевіча — першым намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

Сяркова Міхаіла Мікалаевіча — намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

Крэйдзіча Міхаіла Мікалаевіча — старшынёй Пружанскага райвыканкама;

Пачко Аляксандра Мікалаевіча — старшынёй Лунінецкага райвыканкама;

Белавуса Уладзіміра Мікалаевіча — намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама;

Харытончыка Дзмітрыя Іванавіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

Карабача Пятра Пятровіча — старшынёй Гарадоцкага райвыканкама;

Шастакова Аляксандра Генадзьевіча — намеснікам міністра архітэктуры і будаўніцтва;

Шаўчэнка Святланы Аляксандраўны — намеснікам міністра па падатках і зборах;

Лабовіча Андрэя Валянцінавіча — першым намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны;

Татарыцкага Валянціна Баляслававіча — першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі;

Самасейкі Мікалая Леанідавіча — першым намеснікам адказнага сакратара Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі;

Сянько Віктара Сяргеевіча — членам Віцебскага аблвыканкама;

Яўсеева Ігара Уладзіміравіча — членам Мінскага аблвыканкама;

Чачукевіча Юрыя Валер'евіча — членам Мінскага гарвыканкама.

Звяртаючыся да дыпламатаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўнае ў іх працы — гэта прафесіяналізм і адданасць дзяржаве. «Але галоўная задача, вы гэта добра разумееце, мы не гуляем ні ў якую геапалітыку, для нас важна, каб была нармальная краіна, ціхая, спакойная, зручная для жыцця людзей, і павінна развівацца эканоміка. Эканоміка — гэта вырабіў і прадаў. Таму экспарт для нас — найважнейшая задача», — падкрэсліў Прэзідэнт, звярнуўшы ўвагу, што ў працы паслоў павінен быць эфект — рост эканамічных паказчыкаў. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што дыпламаты павінны вызначыць некалькі канкрэтных напрамкаў супрацоўніцтва Беларусі з замежнымі дзяржавамі, на якіх краіна засяродзіць намаганні.

Прызначаючы памочнікаў Прэзідэнта — галоўных інспектараў па Гомельскай і Гродзенскай абласцях, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ім трэба будзе ў звязцы з мясцовымі органамі ўлады забяспечыць арганізацыю выбарчай кампаніі. «Арганізоўваць выбары, працаваць на канчатковы вынік вы павінны найцяснейшым чынам з губернатарам. Гэта ваша найпершая задача», — падкрэсліў ён. Паралельна памочнікам Прэзідэнта неабходна адсочваць, наколькі перадвыбарчы працэс адпавядае заканадаўству і ўстаноўкам, дадзеным на нарадзе па актуальных унутрыпалітычных пытаннях. «Вы павінны жорстка гэта кантраляваць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Трэба акуратна, спакойна правесці гэтыя выбары». У непасрэдней адказнасці памочнікаў Прэзідэнта застаецца работа з кадрамі ў рэгіёнах. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў наладзіць кантакты з усёй вертыкаллю мясцовай улады.

Звяртаючыся да новага кіраўніцтва мясцовых выканаўчых камітэтаў, Прэзідэнт заклікаў іх як мага хутчэй уваходзіць у курс справы і перасцярог ад папулізму ў перыяд правядзення выбарчай кампаніі, у тым ліку ў частцы заробкаў. «Давайце перажывем спакойна гэтыя выбары, паглядзім, на што мы здольныя», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ўладзе трэба надаць больш вагі. Недапушчальная сітуацыя, калі кіраўнік ставіць задачу, а потым сам жа яе за адказную асобу выконвае. «Улада павінна займацца сваімі пытаннямі. Але выканаўчасць патрэбна найжорсткая. Сказаў, прыняў рашэнне ў выканкаме — гэта павінна быць неадкладна выканана», — лічыць Прэзідэнт.

У Гродзенскай і Гомельскай абласцях літаральна праз 2-3 тыдні пачнецца ўборачная кампанія. «Гэта самае галоўнае. Трэба добра прыбраць, нарыхтаваць, забяспечыць дысцыпліну, каб людзі працавалі і атрымлівалі зарплату — вось уся наша перадвыбарная кампанія. А калі тут не будзе выніку, а мы будзем хадзіць да людзей і спрабаваць што-небудзь сказаць, атрымаецца мыканне і не больш», — сказаў Прэзідэнт.

## Каўхута Андрэй Марленавіч



**Нарадзіўся ў 1960 годзе ў Магілёве. Скончыў у 1983 годзе Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна, у 2007 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

З 1983 года працаваў стажорам-даследчыкам у Інстытуце геалогіі і геаграфіі Акадэміі навук БССР, з 1985 па 1996 год — стажорам-даследчыкам, малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам Інстытута геалогіі, геахіміі і геафізікі Акадэміі навук Беларусі.

З 1996 па 2004 год — старшы навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар Інстытута геалагічных навук Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 2004—2010 гадах займаў пасаду намесніка дырэктара Дэпартамента па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

З 2010 па 2013 год узначальваў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут».

У 2013—2014 гадах быў першым намеснікам генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі», а затым дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі дзяржаўны геалагічны цэнтр».

Да прызначэння міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя працаваў генеральным дырэктарам РУП «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі».

# ЯСНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ І КРЫТЭРЫІ

**Наша краіна гатова да нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з дзяржавамі з розных куткоў зямнога шара. Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы даверчыя граматы паслоў замежных краін, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць таго, што сустрэча праходзіць напярэдадні нацыянальнага свята — Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Аляксандр Лукашэнка адзначыў таксама значнасць таго, што дыпламаты пачынаюць працу ў вельмі важны і дынамічны перыяд часу, калі Беларусь выходзіць на новы ўзровень інтэграцыйных працэсаў.

На думку Прэзідэнта, стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза істотна пашырае дыяпазон гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Беларуссю і павышае яе інвестыцыйную прывабнасць. Паводле яго слоў, асаблівую ўвагу Беларусь надае ўзаемадзеянню з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Прымаючы даверчыя граматы пасла Туркменістана, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за апошнія пяць гадоў удалося вывесці двухбаковыя адносіны з гэтай дзяржавай на ўзровень стратэгічнага партнёрства.

Беларусь лічыць адным з важных вектараў знешняй палітыкі развіццё ўзаемавыгадных сувязяў з дзяржавамі Еўрапейскага саюза. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што наша краіна зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Бельгіяй, наданні двухбаковым сувязям сістэмнасці і паслядоўнасці. Беларусь таксама бачыць магчымасці для нарошчвання ўзаемадзеяння ў розных сферах з Даніяй, перш за ўсё на эканамічным кірунку. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што наступіў час аднавіць поўнафарматнае супрацоўніцтва са Швецыяй. Як пагадзіўся з ім пасол Швецыі, напярэдзе ў дзвюх дзяржаў вялікія перспектывы. Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь і Ірландыя таксама валодаюць вялікім патэнцыялам для пашырэння двухбаковых сувязяў. «Актыўныя кантакты ў гуманітарнай сферы і на міжасобасным узроўні, якія ўзніклі дзякуючы шчырай дапамозе Ірландыі ў пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы, арганізацыі аздараўлення беларускіх дзяцей з пацярпелых рэгіёнаў, ствараюць спрыяльны, пазітыўны фон для ўзаемадзеяння ў іншых галінах», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што супрацоўніцтва з краінамі Лацінскай Амерыкі набыло асаблівае значэнне ў беларускай знешняй палітыцы. Прэзідэнт адзначыў даўнія сувязі і вопыт паспяховага ўзаемадзеяння з Аргенцінай у рамках міжнародных арганізацый. Бразілія, на думку кіраўніка дзяржавы, можа стаць для Беларусі галоўным гандлёва-эканамічным партнёрам на паўднёваамерыканскім кантыненце, а супрацоўніцтва Беларусі і Уругвая патрабуе больш пільнай увагі з боку кіраўніцтва абедзвюх краін.

Развіццё палітычных і ўзаемавыгадных гандлёва-эканамічных сувязяў з краінамі Блізкага Усходу і афрыканскага кантынента становіцца адным з прыярытэтаў знешняй палітыкі Беларусі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў зацікаўленасць у пашырэнні палітычнага, гандлёва-эканамічнага і крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Кувейтам і запрасіў кувейцкія інвестыцыйныя фонды да рэалізацыі праектаў на тэрыторыі нашай краіны. Прэзідэнт звярнуў увагу на істотны незадзейнічаны патэнцыял для нарошчвання ўзаемавыгадных адносін з Іарданіяй і падкрэсліў, што Беларусь гатова экспартаваць сваю прадукцыю, у тым ліку калійныя ўгнаенні, аўтатрактарную і іншую тэхніку для патрэб сельскай гаспадаркі і іншых галін Беніна.

Звяртаючыся да дыпламатаў, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Калі нейкая дзяржава хоча з намі супрацоўнічаць, у нас вельмі ясныя прыярытэты і крытэрыі. Прыходзьце, будзем супрацоўнічаць цесна і адкрыта. Формула зразумелая: калі мы з вамі дамовімся, мы выканаем свае абавязацельствы».

Закранаючы тэму бяспекі і міру ў рэгіёне, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Нашу ролю не варта перабольшваць. Мы проста людзі, якія хочуць жыць у міры са сваімі суседзямі. Тым больш калі вайна ідзе ля нашага парога, не проста ў нашых суседзяў — у нашых братоў, мы не можам быць у баку ад гэтага — вось наша простая формула і сутнасць нашай палітыкі».


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА
## от «23» июня 2015 г.

**Сведения о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «Триумфстрой», зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом решением от 9 июля 2003 г. №1124. Свидетельство о государственной регистрации №190465926 выдано 15 июля 2003 г.

**Местонахождение:** 220121, г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, дом 1, офис №117а, кабинет 12.

**Режим работы:** Понедельник – Пятница 8.30 – 17.00; перерыв на обед 12.30 – 13.00.

**Сведения о проектах строительства жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние три года:

- 16-этажный двухсекционный, 111-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е.Полоцкой, 1, площадью – 13699,6 м$^2$;

- 10-этажный двухсекционный, 49-квартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по ул. Е.Полоцкой, 3, площадью – 5467,9 м$^2$;

- 10-этажный трехсекционный, 124-квартирный жилой дом по ул. Жуковского, 29Б, площадью 9933,8 м$^2$.

**Цель проекта:** строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями бытового обслуживания и гараж-стоянкой по ул. П.Глебки» (без инженерных сетей).

**Сведения об этапах и сроках реализации:** Начало строительства – август 2014 г.

Нормативный срок ввода в эксплуатацию – февраль 2016 г. Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – сентябрь 2016 г.

Сведения о генеральной подрядной организации – СУ-26 ОАО «Стройтрест № 4». Договор № 01/26-2014 от 21.07.2014 г.

Застройщиком получены:

- акт выбора места размещения земельного участка площадью 0,4713 га утвержденный Председателем Минского городского исполнительного комитета 31.10.2012 г.;

- решения Минского городского исполнительного комитета от 27.02.2014 г. №458;

- разрешение на организацию стройплощадки №2-208Ж-038/14 от 04.08.2014 г., разрешение на производство строительно-монтажных работ №2-208Ж-038/14 от 01.09.2014 г. Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску;

- заключение КАиГ МГиК от 29.07.2013 г. №07-29/115 Ф, от 28.02.2014 г. № 02-28/80 Ф;

- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка № 500/1312-3071 от 04.04.2014 г.

**Застройщиком получены положительные заключения по проекту:**

- ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 949-60/13 от 31.01.2014 г.

**Местонахождение строящегося объекта:** г. Минск, Фрунзенский район, ул. Е.Полоцкой (пересечение ул. П.Глебки и ул. Притыцкого).

**Характеристика объекта:** проектом предусмотрено строительство 84-квартирного жилого дома, состоящего из трех секций со встроенными помещениями бытового обслуживания, расположенных на цокольном и первых этажах и подземным гараж-стоянкой.

**Жилой дом представляет** собой здание, которое решено по жесткой конструктивной схеме с несущими стенами из эффективного кирпича и дисками перекрытия из сборных многопустотных плит с монолитными участками. Стены наружные и внутренние – кирпич эффективный. Перегородки – из блоков ячеистого бетона, из эффективного кирпича. Фундаменты – в осях «1-9» забивные сваи с монолитными ростверками, в осях «10-17» монолитные ленточные фундаменты. Кровля – плоская, рулонная с внутренним организованным водостоком и отдельные участки – стропильная.

Общая площадь квартир: 2-комнатных – от 57,99 м кв. до 62,00 м кв.; 3-комнатных – от 99,04 до 99,37 м кв.; 4-комнатных – 144,33 м кв. Общая площадь машино-мест – от 15,7 м кв. до 19,8 м кв.

Предлагается:

- 17 квартир, из них: 1-комнатные – 4 шт., 2-комнатные – 10 шт., 3-комнатные квартиры – 2 шт., 4-комнатные – 1 шт.

Квартиры строятся без выполнения внутренних отделочных работ.

Стоимость одного квадратного метра общей площади жилого помещения для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 32 167 800 рублей, что эквивалентно 2100 долларов США по курсу НБ РБ по состоянию на 23.06.2015 г.

Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв. метра жилого помещения и 1 кв. метра машино-места в долларовом эквиваленте является фиксированной до окончания исполнения договора. Предусмотрена система скидок.

Объекты предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

**Подземный гараж-стоянка** примыкает к жилому дому, имеет сложную в плане форму с осевыми размерами 48х85,5 м, не отапливаемый, одноэтажный, на 52 машино-места, хранение газобалонных автомобилей не предусматривается.

**Элементы благоустройства:** площадка для отдыха, детская площадка, плоскостные автопарковки, газоны, озеленение, покрытие проездов к дому и автостоянок – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Состав общего имущества в жилом доме и объектов недвижимости, которые будут находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию входят:**

- внутренние инженерные сети;

- тамбура подъездов, лестничные клетки, мусоросборные камеры, лифты, машинные помещения лифтов;

- техническое подполье, водомерная, ИТП, электрощитовая.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:** по тел.: 396 30 12, +375 29 222 20 16, +375 29 222 20 41, непосредственно в ООО «Триумфстрой», г. Минск, ул. Евфросиньи Полоцкой, дом 1, офис №117а, кабинет 12.

Застройщик ООО «Триумфстрой», УНП 190465926.
Подрядчик СУ-26 ОАО «Стройтрест № 4».
Договор №01/26-2014 от 21.07.2014 г.
**ООО «Триумфстрой»**

■ Форум

# МАЛЫ БІЗНЕС БУДЗЕ РУХАВІКОМ ЭКАНОМІКІ?

## Нацбанк плануе правесці чарговае даследаванне па ацэнцы фінансавай даступнасці

**Пра гэта стала вядома на адкрыцці рэгіянальнага форуму па доступе да фінансаў для Цэнтральнай, Усходняй Еўропы і краін СНД, які прайшоў у Мінску. «Мы зацікаўлены ў правядзенні яшчэ аднаго блока даследаванняў па пытанні доступу да фінансаў і фінансавай асветы», — сказаў намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей ДУБКОЎ.**

«Думаю, мы таксама будзем абапірацца на метадалагічную дапамогу Альянсу па фінансаваму доступнасць, і спадзяюся, што працэс метадалагічнай і фінансавай дапамогі будзе працягвацца і далей», — падкрэсліў Сяргей Дубкоў. Канкрэтныя прапрацоўкі па гэтым пытанні ў рэгулятара ўжо ёсць: «Мы зацікаўлены ў тым, каб доступ да фінансаў забяспечваўся не толькі фізічным асобам, але і малому і сярэдняму бізнесу, таму што гэты сегмент можа выступіць рэальным драйверам развіцця нашай эканомікі».

Мерапрыемства можа адбыцца ўжо ў наступным годзе. «Мы правялі дастаткова сур'ёзнае даследаванне, звязанае з пашырэннем доступу да фінансаў, і хочам паглядзець, якога прагрэсу дасягнулі, — растлумачыў намеснік старшыні праўлення Нацбанка. — Гэты прагрэс будзе пацвярджацца канкрэтнымі лікавымі параметрамі. Адна справа — разважаць пра колькасць адкрытых пунктаў продажу банкаўскіх, фінансавых і іншых прадуктаў, а іншая — ацаніць аб'ём рынку, а таксама стаўленне спажыўца да якасці паслуг».

Нагадаем, што Нацбанк у 2011—2013 гадах рэалізаваў з Альянсам за фінансавую даступнасць першы праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі за кошт вылучанага гранта «Ацэнка ступені доступу да фінансаў: развіццё абгрунтаванай палітыкі доступу да фінансаў у Беларусі». Бюджэт склаў больш за 275 тысяч еўра. Было праведзена комплекснае нацыянальнае даследаванне па ацэнцы фінансавай даступнасці ў краіне. У выніку атрыманы звесткі аб карыстанні фінансавымі паслугамі насельніцтвам і суб'ектамі малога прадпрымальніцтва, пра давер насельніцтва да фінансавай сістэмы краіны і ўзровень фінансавай адукаванасці карыстальнікаў на розных тэрыторыях і гэтак далей.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

■ Сталічны час

# ХТО НЕ ПАСПЕЎ, ТОЙ НЕ ПАТРАБУЕЦЦА...

## На якія вакансіі ў Мінску ўладкавацца ўжо не атрымаецца

**Так званы «дэкрэт аб дармаедах» (дэкрэт Прэзідэнта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрымanства») зрабіў сапраўдную рэвалюцыю на сталічным рынку працы. Беспрацоўныя сталі займаць любыя вакансіі, абы толькі не плаціць прадугледжаны дакументам падатак. У выніку ўтварылася канкурэнцыя нават сярод нізкакваліфікаваных відаў працы, а па некаторых прафесіях работнікаў ужо налічваецца больш, чым трэба. Мы даведаліся, чым гэта пагражае, а таксама колькі вакансій засталося ў сталіцы, якія прафесіі самыя канкурэнтныя і якія заробкі прапануюць у гарадской службе занятасці.**

Па словах **начальніка ўпраўлення занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Таццяны КУДЗЕВІЧ**, з пачатку года колькасць заявак ад працадаўцаў зменшылася ў 2,5 раза ў параўнанні з тым жа перыядам 2014-га. Калі з пачатку 2015 года ў базе звестак службы занятасці налічвалася амаль 8 тысяч вакансій, то за такі ж перыяд 2014-га гэтая лічба складала каля 20 тысяч.

Адметна, што самая вялікая канкурэнцыя назіраецца сярод станочнікаў дрэваапрацоўчых станкоў, грузчыкаў, вартаўнікоў, вадзіцеляў, ахоўнікаў, укладчыкаў-пакавальнікаў, кладаўшчыкоў. Разам з тым у сталіцы захоўваецца попыт і на прафесіі будаўнічага профілю: муляроў, тынкоўшчыкаў, маляроў, арматуршчыкаў, абліцоўшчыкаў-плітачнікаў, цесляроў-бетоншчыкаў. А вось прыбіральшчыкаў памяшканняў, прадаўцоў, кухараў, кантралёраў-касіраў, слесараў-сантэхнікаў, мантажнікаў будаўнічых канструкцый, электраманцёраў і аператараў сувязі не хапае.

Колькасць ахвотных уладкавацца дворнікамі сярод мінчан павялічваецца асабліва хутка. Як адзначаюць спецыялісты, лішак жадаючых працаўладкавацца рабочымі па комплексней уборцы (РКУ) можа спарадзіць некаторыя праблемы для жыллёвых службаў. На 1 студзеня 2015 года ў ЖЭС (ЖЭУ) Мінска налічвалася 1055 вакансій. Гэта значыць, у сярэднім у кожнай са 131 ЖЭС не хапала прыкладна 8 РКУ. Да красавіка колькасць вакансій паменшылася да 783, а на 1 чэрвеня заставаліся толькі 72 вакансіі, пра што паведамілі ў арганізацыі «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (МГЖГ).

**Самая вялікая канкурэнцыя назіраецца сярод станочнікаў дрэваапрацоўчых станкоў, грузчыкаў, вартаўнікоў, вадзіцеляў, ахоўнікаў, укладчыкаў-пакавальнікаў, кладаўшчыкоў.**

Як патлумачылі ў ЖРЭА Савецкага раёна, большасць РКУ выконваюць 1,5 нормы. Гэта значыць, паміж імі часткова размяркоўваюцца наяўныя вакансіі. Напрыклад: у ЖЭС павінна быць 60 РКУ па штатным раскладзе, але фактычна працуюць 40 на 1,5 нормы. У выніку яны выконваюць неабходны аб'ём работ. Гэта дазваляе кожнаму зарабляць да 4 млн рублёў.

Пры выкананні 1 нормы не выходзіць і 3 млн. На такую зарплату пагодзяцца няшмногія. Праблема ў тым, што ЖЭС абавязана паведамляць аб наяўных згодна са штатным раскладам вакансіях у раённы аддзел працаўладкавання і прымаць на працу накіраваных адтуль суіскальнікаў. Атрымліваецца, што жыллёвыя службы не адчуваюць неабходнасці быць цалкам укамплектаванымі РКУ. Калі ж гэта адбудзецца, існуе рызыка адтоку дворнікаў з прычыны нізкага заробку.

Паводле інфармацыі МГЖГ, сярэдняя заработная плата РКУ на 1 чэрвеня складала 3 млн 846 тыс. рублёў (з улікам таго, што большасць РКУ працуюць на 1,5 стаўкі).

Што да заробкаў па іншых вакансіях, то ў гарадской службе занятасці служачым прапануюць у сярэднім 4,9 млн рублёў, а рабочым — 4,4 млн рублёў. Кожная пятая вакансія нізкааплатная і з'яўляецца малапрывабнай для суіскальнікаў (да 3 млн рублёў у месяц). Аднак ёсць у базе звестак больш за сотню вакансій з заробкам, які перавышае 20 млн рублёў у месяц. У асноўным гэта пасады кіруючага звяна: дырэктар, галоўны бухгалтар, камандзір паветранага судна, начальнік упраўлення.

Дворнікі, санітаркі, вартаўнікі могуць разлічваць на заробак ад 2 да 3 млн рублёў у месяц, у той час як электрагазазваршчыкі і слесары механазборачных работ — да 13 млн, менеджары — да 15 млн, інжынеры — да 12 млн рублёў.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

# НАВАЛЬНІЦЫ З АТЛАНТЫКІ



### СЮРПРЫЗ АД СОНЦА

Эксперты ўпэўнены, што ў трэцяй дэкадзе чэрвеня назіралася самая магутная за апошнія 12 гадоў магнітная бура. Яна выклікала палярнае ззянне, якое маглі назіраць жыхары розных краін свету. А саму буру справакаваў двайны выкід плазмы з боку сонечных плям. Яны праходзяць праз цэнтральную частку Сонца, а дзве плямы, самыя велізарныя, размешчаны вельмі блізка адна ад адной. Таму спакойны геамагнітны фон усталюецца на тэрыторыі планеты толькі яшчэ праз тыдзень — недзе ў пачатку ліпеня, калі гэтая група плям схаваецца за краем сонечнага дыска.

Моцная і працяглая магнітная бура ў чэрвені ацэньваецца навукоўцамі як відавочная анамалія. Звычайна сонечныя плямы з'яўляюцца ў сакавіку-красавіку і верасні-кастрычніку. Папярэдняя бура, роўная цяперашняй па магутнасці, была зафіксавана апошні раз у кастрычніку 2003 года, а нешта падобнае ў чэрвені ў апошні раз назіралася ў 1991 годзе. Навукоўцы канстатуюць, што папярэдняя моцная магнітная бура ў 2003 годзе дэзарыентавала пералётных птушак. Вядома, што магнітнае поле Зямлі для іх з'яўляецца дакладным арыенцірам на вялікай вышыні палёту і ўначы. Тады фламінга, якія накіроўваліся ў Егіпет, з прычыны магнітнай буры заляцелі ў Новасібірскую вобласць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ЦЕРПІЦЬ ТЭХНІКА І ЛЮДЗІ

Буры ўяўляюць небяспеку для спадарожнікаў, ліній электраперадач і чыгуначнай аўтаматыкі. Ва ўсіх гэтых сістэмах патокі сонечнага рэчыва выклікаюць кароткія замыканні і блукаючыя токі, што можа сапсаваць апаратуру. Трубаправоды пад уздзеяннем накіраванага патоку зараджаных часціц церпяць ад узмоцненай карозіі.

Падчас магнітных бур у жыхароў планеты рэзка павялічваецца згусальнасць крыві, што асабліва неспрыяльна для людзей з сардэчнай арытміяй. Здаровыя людзі адчуваюць магнітную буру як дадатковы стрэсавы фактар. Змяненні геамагнітнага поля Зямлі, якія адбываюцца праз выкід плазмы на Сонцы, прыводзяць да ўзнікнення палярнага ззяння.

Убачыць гэтую дзіўную і прыгожую прыродную з'яву на гэтым тыдні ўначы маглі жыхары паўночных рэгіёнаў Еўропы і Амерыкі. Відавочцы таксама паведамляюць аб паўночным ззянні ў Валгаградзе, Екацярынбургу, Новасібірску, Пярмі, Омску і Маскве.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

## СКІДВАЙЦЕ 50-РУБЛЁЎКІ!

**Нацыянальны банк Беларусі нагадвае, што з 1 ліпеня спыняецца прыём банкнот наміналам 50 рублёў пры ўсіх відах плацяжоў усімі суб'ектамі гаспадарання, у тым ліку банкамі.**

«З гэтай даты банкі і суб'екты гаспадарання спыняць выдачу названых банкнот фізічным асобам, у тым ліку і ў якасці рэшты. Пры гэтым прыём банкнот наміналам 50 рублёў банкамі ад суб'ектаў гаспадарання будзе весціся да 1 верасня 2015 года», — гаворыць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. Абмен банкнот наміналам 50 рублёў можна будзе выканаць без абмежаванняў і без спагнання камісійнага ўзнагароджання ў любой суме, кратнай 100 рублям: у перыяд з 1 ліпеня па 31 снежня 2015 года ўключна — у Нацыянальным банку і банках краіны; у перыяд з 1 студзеня па 30 чэрвеня 2016 года ўключна — у Нацбанку. З 1 ліпеня 2016 банкноты наміналам 50 рублёў будуць выключаныя са звароту і лічыцца несапраўднымі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.** *kuletski@zviazda.by*

■ Крымінал. Здарэнні

## ЧУЖОЕ НЕ АШЧАСЛІВІЦЬ

**Жыхарка Гродна знайшла банкаўскую пластыкавую картку, аднак вырашыла не вяртаць яе ўладальніку.**

З гэтай карткай 48-гадовая жанчына накіравалася... па крамах і кіёсках, дзе на працягу чатырох дзён разлічвалася за пакупкі чужымі грашыма. Увогуле яна «пазычыла» з рахунку больш за паўмільёна рублёў, пакуль уладальнік карткі, работнік аднаго з гродзенскіх прадпрыемстваў, не заўважыў прапажу. Пасля чаго супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС г. Гродна аператыўна раскрылі злачынства. У дачыненні да жанчыны завялі крымінальную справу. За крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі яна можа пазбавіцца волі на пяць гадоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

## ХАЦЕЎ ЗАПЯЧЫ КУРЫЦУ...

**У Мінскім раёне мужчына ўпаў у вогнішча.**

У аддзяленне апёкавай рэанімацыі шпіталізавалі мужчыну 1941 года нараджэння, мінчаніна. Паводле слоў сына пацярпелага, ранкам яго бацька пайшоў у лес каля вёскі Новы Двор, каб прыгатаваць на вогнішчы курыцу. Развёўшы агонь, мужчына вырашыў яшчэ падсабраць дроў і падкінуць іх у полымя, спатыкнуўся і ўпаў у вогнішча. У выніку ён атрымаў тэрмічныя апёкі твару, тулава, рук першай-трэцяй ступеняў 56% цела. А выратавальнікі-пажарныя нагадваюць у чарговы раз: будзьце пільнымі з агнём. У перыяд забароны на наведванне лясоў штраф за парушэнне заканадаўства аб пажарнай бяспецы можа складаць да 25 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *sr@zviazda.by*

# Ці можа на мытні служыць ваўкасаб?

**Студэнты чацвёртага курса факультэта мытнай справы Расійскай мытнай акадэміі цягам двух тыдняў будуць праходзіць практыку ў Дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі мытных органаў Рэспублікі Беларусь і на мытнях нашай краіны.**

У першую чаргу студэнты наведалі прадпрыемства «Белмытнясэрвіс» — найбуйнейшага лагістычнага аператара, і ведамасны Інстытут мытных органаў, дзе будучых мытнікаў пазнаёмілі з дзейнасцю лабараторый навучальнай установы і з асаблівасцямі падрыхтоўкі спецыялістаў-кінолагаў на кафедры кіналогіі.

Лекцыю па ўвядзенні ў службовую кіналогію для студэнтаў правёў загадчык кафедры Яўген Кобец, які расказаў пра гісторыю паходжання сабак і магчымае выкарыстанне са службовымі мэтамі ваўкасабаў (помесі ваўка і сабакі). У практыкантаў была магчымасць убачыць новага гадаванца пітомніка — ваўчаня Альфу. Пасля тэарэтычнай часткі лекцыі супрацоўнікі кіналагічнай службы правялі для студэнтаў паказальныя выступленні па дрэсіроўцы службовых сабак, пошуку зброі, наркотыкаў у аўтатранспарце і бытавых прадметах, а таксама па пошуку наркатычных рэчываў, схаваных на чалавеку.




Як распавялі ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта, у наступныя дні студэнты наведаюць Мінскую рэгіянальную мытню, Брэсцкую мытню, мытню «Мінск-2», транспартна-лагістычны цэнтр «Мінск-Белмытнясэрвіс-2».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ З нагоды

# У ДЗЯСЯТАЧКУ!

## Шклоўскі завод газетнай паперы адзначае свой першы значны юбілей



**Для шараговага чытача газеты цікавасць перш за ўсё прадстаўляе пэўны аўтар або тэкст. Пра тое, на якой паперы надрукавана гэтая публікацыя, ён нават і не задумваецца. Таму, напэўна, будзе цікава даведацца, што «Звязда» выходзіць менавіта на «шклоўскай» паперы. Як, дарэчы, і большасць іншых беларускіх газет. Магутнасцяў прадпрыемства хапае, каб забяспечыць сваёй прадукцыяй усіх айчынных спажыўцоў і нават частку замежных. Напярэдадні юбілею мы разам з галоўным тэхнолагам прадпрыемства Аленай КАТАШЭВІЧ успомнілі, з чаго ўсё пачыналася, чым дыхае сёння галоўны вытворца айчыннай паперы і якія задачы ставіць перад сабой.**

— А пачыналася ўсё менавіта 27 чэрвеня, 10 гадоў таму, — распавядае Алена Леанідаўна. — Прадпрыемства было пабудавана ў чыстым полі з нуля па так званым праекце greenfield. Нават не верыцца, што зусім нядаўна тут нічога не было. Цяпер завод працуе ў поўную магутнасць, выпускае 40 тысяч тон паперы за год. І наша вытворчасць цалкам безадходная. Усё, што застаецца пасля апрацоўкі (пілавінне, кара, паліўныя трэскі), мы выкарыстоўваем для атрымання цяпла і пары.

***— Можна сказаць, што сёння вы адзіныя ў Беларусі спецыялізуецеся на выпуску газетнай паперы?***

— Сёння мы адзіныя на постсавецкай прасторы вырабляем газетную паперу выключна з тэрмамеханічнай масы. Але нейкімі там перавагамі перад іншымі вытворцамі не карыстаемся. У тэндарах на закупку газетнай паперы ўдзельнічаем на агульных умовах. Хоць з лёгкасцю маглі б забяспечваць сваёй прадукцыяй увесь беларускі рынак. Сёння мы паспяхова канкуруем з замежнымі вытворцамі паперы, дзве трэціны нашай прадукцыі ідзе на экспарт. Працуем з Расіяй, Украінай, Польшчай, Турцыяй, Сербіяй і іншымі краінамі.

***— Якія існуюць планы па пашырэнні асартыменту папяровай прадукцыі?***

— Сёлета пачалі выпуск тонкай газетнай паперы. Асабліва яна запатрабавана за мяжой, дзе прывыклі лічыць грошы. Гэтая папера больш далікатная, але дае магчымасць крыху сэканоміць. Яна каштуе даражэй, але ў пераліку на метр квадратны атрымліваецца танней. Плануем да канца года запусціць новы цэх па вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі — паперы-асновы для дэкаратыўных абліцовачных матэрыялаў. Яна вельмі складаная па сваёй тэхналогіі, але вельмі запатрабаваная і ў нас, і за мяжой. Будзем выпускаць да 30 тысяч тон у год такой паперы, прычым дзве трэціны аб'ёму плануем пастаўляць на экспарт. З гэтай асновы вырабляюцца меламінавыя плёнкі, якімі, у прыватнасці, ламінуецца ДСП. У нас такой паперай карыстаюцца прадпрыемствы, якія спецыялізуюцца на дрэваапрацоўцы. Спадзяёмся стаць для іх пастаўшчыкамі.

***— Газетная папера — не адзінае, на чым зарабляе ваша прадпрыемства. Сімпатычныя дамкі, якія збіраюцца па прынцыпе канструктара, таксама вынік вашай дзейнасці.***

— Так. Наш філіял «Домабудаванне» займаецца вытворчасцю каркасна-шчытавых домікаў. Менавіта гэты напрамак складае трэць нашай валавой прадукцыі.

Робім з драўніны профільныя дэталі і запатрабаваны на рынку клеены брус. Ён жа з'яўляецца асноўным матэрыялам для нашых дамкоў. Прадукцыя спрэс экалагічная, ніякіх сінтэтычных складнікаў. Усе адходы, якія застаюцца пасля перапрацоўкі драўніны, таксама выкарыстоўваюцца для ацяплення памяшканняў. Працэс, як і з паперай, цалкам замкнуты. Актыўна працуем па рэалізацыі нашых домікаў у Францыю. Першыя два туды ўжо паступілі, іх якасць была высока адзначана, засталося замацавацца на гэтым рынку. Запатрабаваны гэтыя домікі і ў нас, але ў асноўным пакуль паступаюць прыватныя заказы. Зараз у Шклове рэалізуецца пілотны праект «Утульны дом», па якім мы будзем будаваць нашы дамы для льготных катэгорый грамадзян. У ліпені будуць узведзены першыя дамы па гэтым праекце.

Акрамя гэтага, у канцы мінулага года ў нас была наладжана вытворчасць пелет з адходаў дрэваапрацоўкі, якія мы таксама прадаём за мяжу.

***— Сучаснае прадпрыемства патрабуе высокапрафесійных спецыялістаў. Наколькі я ведаю, вы былі запрошаны сюды з іншага прадпрыемства.***

— Сапраўды, я сюды прыехала па запрашэнні. Наогул у нас працуе вельмі прафесійная і дастаткова маладая каманда. Мы сучаснае прадпрыемства, дзе выкарыстоўваюцца вядучыя тэхналогіі і падыходы да працы. Імкнёмся па поўнай праграме выкарыстоўваць IT-тэхналогіі. На прадпрыемстве распрацавана, дакументальна афармлена, укаранёна і падтрымліваецца ў працоўным стане сістэма менеджменту якасці ў адпаведнасці з патрабаваннямі СТБ ISO 9001-2009. Яна распаўсюджваецца на праектаванне, распрацоўку і вытворчасць паперы і прадукцыі дрэваапрацоўкі. Атрыманы сертыфікат, які пацвярджае, што сістэма кіравання навакольным асяроддзем на прадпрыемстве адпавядае запатрабаванням СТБ ISO 14001-2005.

Наш завод імкнецца максімальна адпавядаць міжнародным прынцыпам устойлівага кіравання лясными рэсурсамі, у тым ліку не закупляць нелегальна нарыхтаваную драўніну і падтрымліваць ініцыятывы па выяўленні лясоў высокай прыродаахоўнай каштоўнасці. У сувязі з гэтым на прадпрыемстве праведзены работы па сертыфікацыі ланцуга паставак на адпаведнасць прынцыпам і крытэрыям Лясного гаспадарчага савета (FSCTM) і атрыманы адпаведны сертыфікат.

***— Што хацелі б пажадаць сваім калегам і наогул прадпрыемству?***

— Хацелася б пажадаць, безумоўна, росквіту, развіцця і паспяховага асваення новых вышынь. Сваім калегам — дабрабыту, здароўя і, вядома, паспяховай работы і рэалізацыі ўсіх задуманых планаў. І святочнага настрою!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by ■




■ Погляд



# СЫТЫ ГАЛОДНАМУ НЕ СПАГАДАЕ

## Харчовая бяспека — складнік нацыянальнай

**У гэтым годзе Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO) спаўняецца 70 гадоў. Галоўнай задачай арганізацыі з'яўляецца барацьба з голадам, і гэтая праца паступова дае свой плён: за апошнія 25 гадоў колькасць галадаючых людзей у свеце зменшылася з 1 мільярда да 800 млн чалавек. Асаблівую ўвагу FAO надае рэгіянальнай і нацыянальнай харчовай бяспецы, якая з'яўляецца традыцыйным прыярытэтам і для нашай краіны.**

Мы ўжо прызвычаіліся да шырокага выбару харчовых тавараў у крамах і таму неяк забываемся, што гэтае багацце дасягаецца вельмі няпроста. Беларусь знаходзіцца ў зоне рызыкоўнага земляробства, якасць нашых зямель кульгае, а больш за 50% тэрыторыі не прыстасавана для сельскай гаспадаркі. Нічога дзіўнага, што беларускі ўрад вымушаны актыўна падтрымліваць аграрыяў: за апошнія 12 гадоў прамая і ўскосная дзяржаўная дапамога сельскай гаспадарцы склала каля 50 млрд долараў.

Такая сума прымушае задумацца: а для чаго наогул патрэбна нацыянальная сельская гаспадарка? Можа, лепш цалкам увайсці ў глабальную сістэму падзелу працы, дзе прадукты харчавання будуць вырабляць краіны са спрыяльным кліматам, а беларусы знойдуць сабе больш выгадны занятак?

Аднак у гэтым пытанні далёка не ўсё вымяраецца фінансавай выгадай, бо ёсць паняцце «харчовая бяспека». Наш свет зараз незвычайна складаны і далікатны, і ў нестабільных умовах забяспечанасць харчаваннем пераўтвараецца ў фактар нацыянальнай бяспекі: беларускія старыя дагэтуль памятаюць кошты «пад немцам» у часы Вялікай Айчыннай, калі бохан хлеба мяняўся на залаты пярсцёнак.

Застрахаваць гэтыя рызыкі можна, толькі трымаючы ўласную сельскую гаспадарку. Развіваць яе, як паказвае вопыт Латвіі ці расійскага Нечарназем'я, — справа некалькіх гадоў, а аднаўленне тэхналогій, інфраструктуры, чалавечага патэнцыялу расцягваецца на дзесяцігоддзі. Прычым пагоня за камерцыялізацыяй і поўная лібералізацыя здольны прывесці да згубных наступстваў нават у ідэальных умовах: так, чарназёмная Украіна ўсе часы незалежнасці парадаксальна адстае ад беларускіх паказчыкаў ураджайнасці збожжавых, гародніны, бульбы, цукровых буракоў. Таму не трэба спяшацца з прыватызацыяй калектыўных гаспадарак і іх падзелам на дробныя кавалкі дзеля задаволеных усмешак замежных экспертаў. Занадта вялікі кошт памылкі.

Такім чынам, прыярытэт нумар адзін па-ранейшаму — прадуктовая бяспека краіны, і для яе забеспячэння неабходна прыкладаць усе намаганні, уключаючы дзяржаўную падтрымку сельгасвытворцаў. Наша краіна пакуль паспяхова вырашае гэтую задачу: паводле FAO, узровень самазабеспячэння Беларусі ў 2012 годзе мясам склаў 128,4%, малочнымі прадуктамі 195,1%, яйкамі 120,9%, задаволена патрэба ў бульбе, ёсць поспехі ў вытворчасці агародніны і садавіны. Традыцыйныя праблемы назіраюцца толькі ў самазабеспячэнні рыбай і некаторай садавінай.

Аднак пасля забеспячэння прадуктовай бяспекі ўзнікае пытанне экспарту лішкаў сельгаспрадукцыі. Гэта добры спосаб зарабіць валюту, і таму беларускі сельскагаспадарчы экспарт набліжаецца да 7 млрд долараў, забяспечваючы станоўчае сальда знешняга гандлю каля 1,5 млрд долараў. Але менавіта ў гэтым пытанні дзяржаўныя датацыі робяцца недарэчнымі і нават шкоднымі, паколькі ў гэтым выпадку наш бюджэт пачынае фінансаваць замежных спажыўцоў, хоць павінна быць роўна наадварот. Экспартаваць трэба толькі тую прадукцыю, вытворчасць якой у Беларусі арганізавана настолькі эфектыўна, што яна можа паспяхова канкураваць на сусветным рынку без дадатковых субсыдый.

Пры гэтым вельмі важна, каб на сусветным рынку існавалі роўныя ўмовы для канкурэнцыі, чаго пакуль не назіраецца. Напрыклад, калі беларусы паспрабуюць прапанаваць свае тавары Еўрасаюзу, то ў нас нічога не атрымаецца: ёсць шматлікія практычныя прыклады. Праблема зусім не ў тым, што нашы прадукты горшыя, але яны не вытрымліваюць канкурэнцыі з еўрапейскім танным харчаваннем. На гэты факт часта з'едліва паказваюць крытыкі беларускай мадэлі, забываючыся, што еўрапейская таннасць дасягаецца магутным лабізмам і каласальнымі датацыямі сельскай гаспадарцы.

Аднак цяпер пад уплывам крызісу Еўрасаюз няўхільна скарачае ўзровень падтрымкі сваіх аграрыяў. Беларусь павінна быць гатова скарыстацца гэтым шанцам, каб увайсці і замацавацца на велізарным еўрапейскім рынку харчавання. Трэба тэрмінова павышаць эфектыўнасць свайго аграсектара, старанна выбіраць кірункі яго мадэрнізацыі, выключаць любыя магчымасці разбазарвання выдзеленых сродкаў. Рэзервы для памяншэння сабекошту ў беларускай прадукцыі маюцца: дастаткова прыгадаць, што на вытворчасць 1 кг мяса ў нас ідзе да 10 разоў больш электраэнергіі, чым у ЕС.

Праводзіць працу па аптымізацыі дзяржпадтрымкі аграсектара давядзецца ў любым выпадку, бо Беларусь яшчэ ў 2011 годзе ўзяла на сябе абавязацельствы перад Мытным саюзам знізіць узровень дзяржпадтрымкі з 16% ад аб'ёму выручкі сельгасвытворцаў да 10% у 2016 годзе. Прадпрыемствам, не задзейнічаным у забеспячэнні харчовай бяспекі і не здольным арганізаваць прыбытковы экспарт, варта сур'ёзна задумацца над сваёй стратэгіяй развіцця, адшукаць для сябе новыя перспектыўныя нішы. У прыватнасці, для Беларусі адным з самых цікавых кірункаў могуць стаць навукова-практычныя распрацоўкі ў сферы біятэхналогій і альтэрнатыўнай энергетыкі. Гэта дазволіла б нашай краіне экспартаваць не проста гатовую прадукцыю, а перадавыя тэхналогіі па яе вырабе, што стала б яшчэ адным крокам да новага тэхналагічнага ўкладу, які ідзе на змену сённяшняй аграрна-індустрыяльнай гаспадаркі.

**Аляксандр СІНКЕВІЧ,**
**эканаміст** ■


Фота БЕЛТА.

■ Карысныя парады

# КУДЫ ХАЧУ, ТУДЫ ЛЯЧУ

## Як выбраць добры «гарачы тур» і не сапсаваць сабе адпачынак?

**Лета мы заўсёды чакаем. А прыходзіць яно ўсё роўна неспадзявана. І ўвогуле, жыццё наша — адна неспадзяванка. Зрэдку мы можам на 100% быць упэўнены ў нашых планах на пагоду. Таму і планаваць адпачынак загадзя цяжка і нявыгадна (можна трапіць на штрафныя санкцыі ў выпадку адмовы). Яшчэ больш цяжка гэта рабіць, калі ў цябе ёсць дзеці. Непрадказальнасць падвойваецца. Менавіта для такіх сем'яў выдатна падыходзіць адпачынак па «гарачых турах», як кажуць спецыялісты, вынаходніцтва выключна постсавецкай прасторы. Падыдзе такі варыянт і калі ваш адпускны бюджэт надта абмежаваны, бо звычайна цана падобнага тура можа быць ніжэйшай на 50% і болей.**



### СЁННЯ І Ў НАС

Прагматычныя еўрапейцы карыстаюцца раннім браніраваннем, што таксама дазваляе сэканоміць значныя сумы. Але наш чалавек больш рамантычны і лёгкі на пад'ём — што нам сабрацца за суткі ды рвануць на мора? У немца ад такога, як той казаў, праграма завісне. І няхай. Нам болей застанецца...

Гэта я намякаю, што сапраўдны «гарачы тур» — гэта пуцёўка на найбліжэйшыя даты, якія тураператару не ўдалося прадаць. «Чым бліжэй да дня вылету, тым мацней «гарыць» тур. Таму ў апошнія перад ад'ездам дні пуцёўку можна купіць са значнай зніжкай — да 50%. Крайні тэрмін, пасля якога тур «падгараваецца», складае 2-5 дзён у безвізавыя краіны і ад 7 да 10 дзён у краіны з візавым рэжымам», — распавялі мне ў адным з мінскіх турыстычных агенцтваў, пажадаўшы застацца інкогніта.

### АДКУЛЬ ЯНЫ ЎЗЯЛІСЯ?

З'яўленне «гарачых тураў» непазбежна, таму што турфірмы яшчэ да пачатку сезона выкупляюць месцы ў гатэлях і самалётах. «Ніхто не ведае, колькі месцаў застанецца, ды і ці застануцца наогул. Каб хаця б часткова вярнуць выдаткаваныя сродкі, тураператары прадаюць пуцёўкі па дэмпінгавых цэнах. Гэтым карыстаюцца не толькі сціплыя ў сваіх фінансавых магчымасцях турысты, але і заможныя. І, праўда, чаму б не сэканоміць?» — разважаюць у турфірме.

Адзінае, што спецыялісты раяць, — мець у запасе дастаткова дзён адпачынку: «Калі, напрыклад, у вас усяго 2 тыдні, пра «гарачыя туры» можаце забыцца. Але калі наперадзе яшчэ цэлы месяц, вы маеце ў рэзерве 2 тыдні на пошук. Праўда, расслабляцца ў любым выпадку не варта. Бо можа так здарыцца, што ўжо заўтра вы знойдзеце на сайце тураператара запаветную пуцёўку, а ўжо праз 3 дні паляціце на курорт. У любым выпадку рэчы лепш запакаваць загадзя».

### АДПАЧЫНАК ЗА МІЛЬЯРД

Павалэндаўся цягам вечара па сайтах турфірм, каб паглядзець, за якія грошы прапануюць «гарачыя туры» менавіта сёння. Вынік аказаўся цікавы. Напрыклад, праз дзень мяне запрашалі ляцець у Егіпет на 11 начэй у розныя віды гатэляў — ад 2 да 5 зорак. Я выбраў у пошукавіку пражыванне двух дарослых з малым дзіцем і харчаванне «толькі сняданак». Выбар быў багаты. Больш за ўсё ўразілі цэны. Самы танны тур прапаноўвалі за 6 млн 700 тысяч рублёў (каля 435 долараў), а самы дарагі — за амаль 1 мільярд 180 млн рублёў (каля 77 тысяч долараў).

Дарэчы, многія тураператары прапануюць дадаткова зніжку 3% пры самастойным падборы пуцёўкі.

### ТЭРМІН ПРЫДАТНАСЦІ СКОНЧЫЎСЯ

Тураператары сцвярджаюць, што «гарачы тур» — гэта не нейкі неліквідны тавар, які збываюць за бясцэнак, а «прадукт з тэрмінам прыдатнасці». Не распрадала турфірма ўсе свае білеты за 10 дзён да даты вылету — пачынаецца зніжэнне коштаў. А калі гэта не тавар другога гатунку, заляжалы на складзе, патрабаваць вы можаце роўна столькі ж, колькі і з тура па звычайнай цане. «Гэта значыць, што ў дагаворы, які вы падпісваеце, павінны быць дакладна прапісаны ўсе ўмовы — даты пералёту, гатэль (уключаючы колькасць зорак), харчаванне і гэтак далей. Не саромейцеся задаваць любыя хвалюючыя вас пытанні — толькі так вы можаце атрымаць упэўненасць, што набываеце якасную пуцёўку», — раяць спецыялісты.

### ТОЛЬКІ НЕ БЛЫТАЙЦЕ

Вядома, «гарачы тур» трэба браць хутка, але не спяшайцеся адпраўляцца за першай пуцёўкай, якая трапілася. Параўнайце цэны ў іншых аператараў. Бо можа апынуцца, што заяўлены «гарачы» насамрэч толькі спрытны маркетынгавы ход. Напрыклад, вы можаце знайсці побач і сапраўдны, і падробны «гарачы тур». Скажам, калі дата вылету — кастрычнік, а сёння толькі чэрвень.

Я сам на адным з сайтаў знайшоў дзве «гарачыя» прапановы, якія стаялі побач асобнымі банерамі. Адна з іх рэальна давала магчымасць вылецець у Чарнагорыю праз 3 дні, а другая запрашала ў Егіпет на верасень.

* * *

Галоўнае — памятайце, што пры пошуку «гарачага тура» часу на разварушванне ў вас не будзе. Вашу паездку могуць перахапіць літаральна з-пад носа: пакуль дамаўляецеся пра адпачынак, афармляеце ўсе дакументы і везяце грошы ў офіс.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**
*kuletski@zviazda.by*

■ Фінансавы выдатнік

# САКРЭТЫ «ПРЫГАТАВАННЯ» ГРОШАЙ

## Для паездак за мяжу больш падыходзіць картка

**Не, мы не раім вам запіхваць свае купюры ў каструлю ці мікрахвалёўку, а проста прапануем выкарыстоўваць своеасаблівы дапаможнік для тых вандроўнікаў, хто расплачваецца карткай за мяжой. Сёння прэс-служба плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ распрацавала пяць парад аб тым, як правільна выбраць картку для адпачынку, што рабіць, каб засцерагчыся ад ашуканцаў, і ў чым перавага разлікаў пластыкам за мяжой.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### 70 на 30

З запланаванага вамі бюджэту на падарожжа бярыце з сабой 30% наяўнымі, а астатнія 70% сродкаў пакідайце на картцы.

У паездцы найлепш падстрахавацца і ўзяць з сабой не толькі картку, але і наяўныя. У некаторых краінах (у першую чаргу гэта тычыцца Азіі і Афрыкі) безнаяўны разлік не надта распаўсюджаны, таму ёсць сэнс браць з сабой яшчэ і папяровыя грошы. У развітых краінах таксама ёсць свае нюансы з безнаяўнымі разлікамі: у некаторых крамах або кавярнях тэрміналы не разлічаны на карткі з магнітнай паласой, таму лепш перад паездкай атрымаць картку з чыпам або давядзецца браць большую долю наяўных сродкаў.

### «Запасная» не пашкодзіць

Банкі не застрахаваны ад збояў, таму ёсць сэнс браць з сабой карткі розных банкаў і розных плацежных сістэм. Нават калі ў адной з іх узнікнуць праблемы з працай — другая дакладна не падвядзе. Акрамя таго, картка можа згубіцца, а другая дапаможа вам не застацца зусім без сродкаў. Дарэчы, у некаторых краінах не ўсюды прымаюцца карткі міжнародных плацежных сістэм Visa і MasterCard. Напрыклад, могуць прымацца карткі толькі іх мясцовай нацыянальнай плацежнай сістэмы.

### Выбірайце правільную валюту

Варта разумець, што пры ажыццяўленні разлікаў «рублёвай» карткай за мяжой, вы спачатку мяняеце беларускія рублі на долары ці еўра у міжнароднай плацежнай сістэме па яе курсе, а толькі ўжо потым гэтая валюта прадаецца беларускаму банку, які выдаў вам картку. Фінансавыя эксперты раяць у зоне еўра разлічвацца карткай у еўра, а ва ўсіх астатніх краінах — доларавай.

### Сачыце за камісіяй

Перад тым, як здымаць грошы з карткі ў замежным банкамаце, неабходна абавязкова высветліць памер камісіі. Здымацца яна будзе з двух бакоў: як беларускім, так і замежным банкам. Камісія ў беларускага банка будзе складаць да 2%, а ў замежнага можа даходзіць да 10%. Менавіта таму спецыялісты рэкамендуюць наогул устрымацца ад зняцця грошай праз банкамат і выкарыстоўваць безнаяўныя плацяжы ўсюды, дзе гэта магчыма.

### Падключыце інтэрнэт-банкінг

У першую чаргу даведайцеся, якім чынам можна заблакаваць картку. Не заўсёды гэта можна зрабіць аператыўна праз кол-цэнтр. Значна хутчэй у такой сітуацыі скарыстацца інтэрнэт- або мабільным банкінгам, таму падключыце іх загадзя або непасрэдна перад паездкай.

Карысна будзе падключыць і СМС-апавяшчэнне. Яно будзе сігналізаваць вам кожны раз пасля таго, як з карткі будуць спісвацца сродкі. Так вы зможаце кантраляваць і свае расходы, і заўсёды будзеце ў курсе астатку на рахунку, ну а ў выпадку несанкцыянаванага спісання сродкаў таксама імгненна будзеце праінфармаваны вашым банкам. Акрамя таго, важна даведацца, якія ліміты ўстаноўлены на картцы.

* * *

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас (kurkach@zviazda.by і kuletski@zviazda.by) ці па тэлефонах 8 (017) 292 38 02 і 8 (017) 287 17 51.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Думайце самі...

# Перавагі і недахопы палётаў лаўкост

**Калі вы хочаце ляцець на самалёце ў адпачынак не толькі танна, але якасна і бяспечна, то майце на ўвазе некалькі фактаў пра дзейнасць лаўкост-авіякампаній.**

Падобныя перавозчыкі прапаноўваюць вельмі нізкія тарыфы за кошт скарачэння традыцыйнага набору паслуг. Сярод іх — адсутнасць харчавання на борце, абмежаванні па норме правозу багажу, адсутнасць фіксаваных месцаў у салоне (хаця гэта стымулюе пасажыраў як мага хутчэй зайсці ў самалёт і скарачае прамежкі паміж рэйсамі), выкарыстанне не асноўных аэрапортаў, аднаго тыпу лайнераў у авіякампаніі (гэта дазваляе знізіць кошт абслугоўвання і навучання персаналу), адсутнасць магчымасці здаць квіткі ці змяніць даты палёту, кароткія прамыя пералёты — часта не больш за 3 гадзіны, адсутнасць авіякас (пошук квіткоў, як правіла, можна весці толькі на сайце авіякампаніі).

Аднак існуе і такое меркаванне, што некаторыя лаўкостары скарачаюць выдаткі за кошт нізкіх заробкаў персаналу. Таму працаваць у такія кампаніі ідуць не найлепшыя пілоты. А дрэнны пілот — гэта, пагадзіцеся, не надта прыемна. Лепш за ўсё перад тым, як выбраць лаўкостара, даведайцеся як мага больш пра кампаніі, якія прапануюць свае паслугі. Напэўна, буйныя авіяперавозчыкі з добрай рэпутацыяй будуць больш надзейнымі.

**Арцём НОСІК**

■ Май на ўвазе!

# А ЗА КАЛЬВАДОС ДАПЛАЦІ

**Зараз пара адпачынкаў, паездак за мяжу. Нашы людзі адтуль традыцыйна вязуць розныя незвычайныя сувеніры, магніцікі і... экзатычны алкаголь. Цягнуць яшчэ шмат чаго, але і «вадкі тавар» — абавязкова. Купляць і правозіць такія падарункі ніхто не забараняе, існуюць толькі правілы і нормы, якія трэба ведаць і выконваць. Правесці кансультацыю па гэтым пытанні сёння нам дапамагае прэс-група Ашмянскай мытні.**

### УСЯГО 200 ЦЫГАРЭТ

У прыватнасці спецыялісты паведамляюць, што згодна з пунктам 1 раздзела 1 дадатка 3 Пагаднення аб парадку перамяшчэння фізічнымі асобамі тавараў для асабістага карыстання праз мытную мяжу Мытнага саюза і здзяйснення мытных аперацый, звязаных з іх выпускам, вызваляюцца ад аплаты мытных плацяжоў тавары для асабістага карыстання, мытны кошт якіх не перавышае суму, эквівалентную 1500 еўра, і агульная вага якіх не перавышае 50 кілаграмаў. Без пытанняў правозіць на тэрыторыю Мытнага саюза алкагольныя напоі і піва (не больш за 3 літры ўключна ў разліку на адну фізічную асобу, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту), а таксама тытунь і тытунёвыя вырабы (200 цыгарэт або 50 цыгар (цыгарыл) або 250 грамаў тытуню).

### НЕ БОЛЕЙ ЗА 5 ЛІТРАЎ

Гэта тычыцца бясспэлліннага ўвозу. Аднак асобныя гурманы з грашыма падобную норму могуць і пераскочыць. Праўда, і тут існуюць абмежаванні. Фізічным асобам дазваляецца правозіць на тэрыторыю Мытнага саюза алкагольныя напоі, піва і этылавы спірт у агульным аб'ёме не больш за 5 літраў на адну асобу, якая дасягнула 18-гадовага ўзросту. Але ў такім выпадку за падобныя прыхільнасці да замежнага алкаголю трэба будзе дадаткова заплаціць.

У адпаведнасці з дадаткам 5 Пагаднення аб парадку перамяшчэння фізічнымі асобамі тавараў для асабістага карыстання праз мытную мяжу Мытнага саюза і здзяйснення мытных аперацый алкагольныя напоі і піва звыш 3 літраў, але не больш за 5 літраў уключна абкладаюцца па адзінай мытнай стаўцы 10 еўра за 1 літр у частцы перавышэння колькаснай нормы ў 3 літры.

**Сяргей КУРКАЧ**

> **Даведка «Звязды»**
>
> **Алкагольнымі напоямі пры правозе на тэрыторыю Мытнага саюза лічыцца гарэлка, лікёра-гарэлачныя вырабы, віно, каньяк, брэндзі, кальвадос, шампанскае і іншыя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 7% і больш.**

# АФІЦЭРСКІ ГОНАР ЯЎГЕНА МІКУЛЬЧЫКА


Яўген МІКУЛЬЧЫК свядома стаў вайскоўцам.

**На нашу сустрэчу Яўген Мікульчык прынёс цэлы ахапак фотаздымкаў. На адных ён яшчэ зусім малы — з бацькамі. На іншых — разам з жонкай і дзецьмі. Фатаграфіі, зробленыя на афіцыйных мерапрыемствах і ўрачыстасцях, з калегамі, сябрамі... і нават з гармонікам.**

**Аказваецца, генерал любіць выконваць прыпеўкі. Прага да народнай творчасці — з дзяцінства. Адтуль і іншыя ўспаміны. Вайна. Зусім хлопчыкам Яўген Васільевіч зведаў ліха нямецкай акупацыі, пайшоў у партызаны, каб разам з усімі абараняць Радзіму. Відаць, гэта і прадвызначыла яго далейшы лёс. Ён заўсёды хацеў стаць афіцэрам і стаў ім. Прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да члена ваеннага савета Сібірскай ваеннай акругі. Па службе аб'ездзіў, пэўна, увесь Савецкі Саюз. Узначаліўшы Беларускі саюз афіцэраў, не пераўтварыўся ў кабінетнага чыноўніка. Знаёміўся з воінскімі часцямі і злучэннямі краіны, гутарыў з афіцэрамі, салдатамі. Сёння Яўген Мікульчык з цеплынёй расказвае пра тыя паездкі, сустрэчы і ўвогуле пра сваё жыццё.**

***— Яўген Васільевіч, дзе вашы карані? У якой сям'і вы нарадзіліся?***

— Нарадзіўся я ў вёсцы Міжрэчча Пухавіцкага раёна. Мае бацькі, Васіль Піліпавіч і Антаніна Сямёнаўна, былі сялянамі. Бацька працаваў калгасным ветэрынарам, маці — на палявых работах. Сям'я была вялікая — 11 чалавек. Працавалі з ранніх гадоў.

***— Кажуць, самыя моцныя ўражанні — дзіцячыя. Вам было 9 гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна...***

— Раніцай 22 чэрвеня 1941 года мае аднавяскоўцы выганялі коней, кароў і гусей на пашу. Гэта была нядзеля. Калі я прачнуўся, мама плакала. Кажа: «Дзеткі, уставайце. Вайна». Вось што засталося ў памяці аб той трагічнай раніцы. Праз пяць-шэсць дзён у нашай вёсцы з'явіліся немцы. Пачалі рабаваць двары, забіраць жывёлу. Гэта былі жудасныя дні пачатку фашысцкай акупацыі.

***— А што вас, яшчэ зусім хлопчыка, падштурхнула пайсці ў партызаны?***

— Партызаны і падпольшчыкі з'явіліся таму, што людзі не маглі цярпець, што вырабляюць на нашай зямлі фашысты. Я быў сувязным партызанскага атрада імя Чапаева. Мне давалі розныя заданні. Хадзіў у разведку ў Пухавічы, Мар'іну Горку, Турын, у іншыя месцы, дзе сталі варожыя гарнізоны. Сачыў за тым, як ахоўваюцца масты, палявыя аэрадромы. Здаралася, ідзеш, як раптам: «Ком, кіндар!» Немцы. Пачынаюць правяраць, абшукваць, ажно да лапцяў. Добра, калі нічога не нясеш з сабой. А бывала, нясу лекі, якія партызанам перадаваў праз мяне аптэкар Ануфрый. Партызанскі сувязны, разведчык — вельмі адказная і рызыкоўная справа. Стралялі, на маіх вачах гінулі людзі. Я таксама пад кулямі быў. І не адзін раз.

Аднойчы пайшлі на разведку ў Мар'іну Горку, дзе стаяў варожы гарнізон. Каб не выклікаць падазрэнняў у немцаў, у сумку нам паклалі яек. Спынілі патрулі, давай правяраць. Яечкі адразу выпілі, а нас адкінулі ў бок — «Вэк!» — і сталі страляць з пісталета. На шчасце, міма. Мы зайшлі ў гарадок, паглядзелі, што там адбываецца. Потым пабылі да вакзале: сачылі, куды цягнікі ходзяць. Па дарозе ў Пухавічы сустрэлі немцаў. Яны рамантавалі дарогу: укладвалі камяні. Нас, вядома, спынілі, але хутка адпусцілі. У Пухавічах мы нарваліся на начальніка паліцыі. Кожны паход быў вельмі небяспечным: цябе маглі або параніць, або ўвогуле забіць. Мама заўсёды казала: «Калі ты ідзеш і адчуваеш, што ззаду немцы, не азірайся». Яны не любілі, калі ім глядзелі ў вочы.

***— Стольківедаем пра зверствы гітлераўцаў, але ўсё роўна цяжка ўявіць: няўжо яны маглі выстраліць у дзяцей?***

— Вядома, маглі. Аднойчы мы купаліся ў Свіслачы. Побач праязджалі немцы. Яны пачалі страляць па тых, хто купаецца. Дзве нашы дзяўчынкі, Нінка і Ленка, былі забіты. А вось яшчэ адзін выпадак. Мужыкі касілі сена. Ехалі немцы. Усіх расстралялі. Сярод гэтых мужыкоў быў і мой дзядзька. Толькі ажаніўся...

**«Я неяк падлічыў: за сорак гадоў службы пераязджалі 31 раз! Сібір, Далёкі Усход, Забайкалле, Прыкарпацце...»**

***— На валаску ад смерці былі і вы...***

— З 30 красавіка па 3 мая 1944 года нашу зону блакіравалі фашысты, каб знішчыць партызан брыгады «Полымя», куды ўваходзіў атрад. Побач з нашымі зямлянкамі быў вырыты дот, куды мы з сям'ёй і схаваліся. Тата пайшоў у балота. А мы сядзелі моўчкі: ведалі, што побач немцы (па ботах распазнавалі). Тры дні правялі пад зямлёй — як дзеці падзямелля. Бацька прыйшоў за намі адразу пасля адыходу гітлераўцаў. Калі вылезлі з-пад зямлі, страцілі прытомнасць. Потым пайшлі з бацькам шукаць старэйшага брата (ён быў у партызанскім атрадзе). Ідзём, а па дарозе трупы ляжаць. Падышлі да месца дыслакацыі атрада. Бачым, каля вогнішча сядзяць партызаны. Брат паранены ў руку, дзядзька Аляксей — у правае плячо. Яны і расказалі, што нашу вёску спалілі гітлераўцы. Загінула трое старых. Астатнія сышлі ў лес, у тым ліку мая сям'я. Калі бацька і старэйшы брат пасля вызвалення Беларусі пайшлі на фронт, мы з мамай засталіся ў спаленай вёсцы. Цягалі бярвёны. Калі мужчыны прыйшлі, пачалі будаваць хатку. Яна і дагэтуль стаіць.

***— А не страшна было?***

— Як не страшна... Адзін раз пайшоў у Вялікія Лукі, дзе гарнізон стаяў. Далі вядро, каб з Колем Карнільчыкам пазбіралі бульбу, а разам з тым даведаліся, як ахоўваецца гэты гарнізон. І так, па-дзіцячы забаўляючыся, збіралі бульбу і назіралі за тым, што робіцца навокал. Страшна было, але выжылі.

***— Вы прайшлі шлях ад камандзіра ўзвода да члена ваеннага савета — начальніка палітычнага ўпраўлення Сібірскай ваеннай акругі, ад курсанта да генерал-лейтэнанта. Ці пашкадавалі хоць раз, што абралі афіцэрскую прафесію?***

— Я свядома выбраў гэтую прафесію. Магчыма, на гэта паўплывала вайна. Мне заўсёды падабалася глядзець на афіцэраў, камандзіраў. Армію я палюбіў якраз з тых часоў. Быць афіцэрам — вялікі гонар. Не менш пачэсна і тое, што па маіх слядах пайшлі і сыны: адзін — падпалкоўнік, другі — старшы лейтэнант.

***— Дзе б вы ні былі па доўгу службы, побач з вамі знаходзілася верная жонка. Сапраўды сям'я — самы надзейны тыл вайскоўца?***

— Безумоўна! У лістападзе мы з жонкай Аленай Міхайлаўнай адзначым 60 гадоў шлюбу. А ведаем адно аднаго яшчэ больш: родам з суседніх вёсак. У нас два сыны, чатыры ўнукі і ўжо трое праўнукаў. Дома, у вёсцы, у нас вялікая бібліятэка — каля тысячы экзэмпляраў кніг. Алена Міхайлаўна ўсё жыццё працавала ў бібліятэцы — дзе б мы ні былі. Колькі памятаю, увесь час падпісваліся на кнігі. Пераязджаючы, перавозілі сваю бібліятэку з сабой. Я неяк падлічыў: за сорак гадоў службы пераязджалі 31 раз! Сібір, Далёкі Усход, Забайкалле, Прыкарпацце...

***— Вы амаль 10 гадоў узначальвалі Беларускі саюз афіцэраў. Ездзілі ў вайсковыя часці, выступалі перад афіцэрамі, у тым ліку юнакамі. Падзяліцеся вопытам, як выхаваць сучаснага патрыёта?***

— Яго неабходна выхоўваць з маленства: сям'я, школа, грамадства, дзяржава. І вельмі важны ў гэтай справе прыклад старэйшага пакалення. Чалавек вучыцца, працуе і глядзіць на тых, хто побач. Вялікую працу ў справе выхавання патрыятызму выконваюць БРСМ, піянерская арганізацыя. Увогуле, дзейнічае сістэма мер, накіраваных на выхаванне чалавека-патрыёта, абаронцы сваёй Радзімы і свайго народа. Усё ўжо створана, не трэба нічога прыдумляць. Галоўнае, гэта павінна быць не казённа і суха, а ад душы.

***— А ў сваёй сям'і вы строгі выхавальнік? Увогуле, які генерал-лейтэнант дома?***

— Не, сам па сабе я не строгі чалавек. Люблю працаваць на зямлі. Саджу, кашу, палю, паліваю, збіраю... Сёлета на дачы пасадзілі бульбу, гуркі, памідоры, за якімі патрэбен догляд. Нічога не павінна быць паказнога, усё павінна быць натуральным. Вечарам — шпацыр.

**«Партызанскі сувязны, разведчык — вельмі адказная і рызыкоўная справа. Стралялі, на маіх вачах гінулі людзі. Я таксама пад кулямі быў. І не адзін раз».**

***— Вы, напэўна, сумуеце па актыўнай грамадскай працы?***

— Сумую. Вельмі сумую. Я люблю ездзіць, рухацца, быць сярод людзей, выступаць перад школьнікамі, студэнтамі, курсантамі. Любая грамадская праца павінна быць выключна жывой, прывабнай. Тады туды будуць ісці і маладыя, і дарослыя, і старыя. Шкадую, што сышоў. Мог яшчэ працаваць. Здароўе падвяло...

***— Што найбольш цэніце ў людзях?***

— Прыстойнасць, шчырасць, прастату, павагу да чалавека. Але без памылак не пражывеш. Калі б усё вярнуць назад, на апошнім этапе я многае не так рабіў бы. Хоць дапамагаў, здаецца, кожнаму — ад салдата да генерала.

**Веранiка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота з асабістага архіва Яўгена Мікульчыка.**


**З жонкай Аленай Міхайлаўнай і сынамі Ігарам і Валерыем, якія, дарэчы, пайшлі па слядах бацькі — сталі афіцэрамі.**

## Да слова

**Яўген Мікульчык узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, шматлікімі медалямі. Нядаўна на святочным кіцелі генерал-лейтэнанта ў адстаўцы з'явіўся ордэн Пашаны, які Прэзідэнт краіны ўручыў яму напярэдадні 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Віншуем!**

## ИЗМЕНЕНИЕ И ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану»,**
*опубликованной в газете «Звязда» № 55 от 24.03.2015*

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад», доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений и дополнений в проектную декларацию «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2 очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану», опубликованную в газете «Звязда» № 55 от 24.03.2015.

**Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 7 квартир на 8, 12, 15, 21, 23 и 24 этажах, в том числе:**

- 4 (четыре) однокомнатные квартиры общей площадью от 45,36 до 45,56 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 300 долларов США**;
- 2 (две) двухкомнатные квартиры общей площадью 55,8 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 300 долларов США**;
- 1 (одна) двухкомнатная квартира общей площадью 68,66 кв.м стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 250 долларов США**.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере **30% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – до конца строительства (сентябрь 2015 года) в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

При **единовременной** оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную **100 долларам США.**

Стоимость 1 кв.м общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора. Стоимость 1 кв.м общей площади квартир указана без учета выполнения внутренних отделочных работ.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься со 02.07.2015. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие настоящей.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д.4, офис 107, каб. 1, тел. (017)234-16-98, (044)795-44-44. **Сайт компании: www.uks-m.by.**

# ЧАМУ АБІТУРЫЕНТЫ НЕ МОГУЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЬ ПЛОШЧУ КУХНІ?



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Таму ў залежнасці ад той ступені аб'ектыўнасці, якую ўдасца захаваць пры ўвядзенні вуснай часткі, мы будзем яе ўводзіць», — заявіў журналістам Дзмітрый Ліванаў.

А для беларускіх абітурыентаў настае самы трывожны час. У першую чаргу трэба дачакацца сваіх балаў ЦТ, а потым паспрабаваць супаставіць іх з вынікамі сваіх патэнцыяльных канкурэнтаў. Многія ўдзельнікі ЦТ не разумеюць, чаму тэставыя работы правяраюцца так доўга.

— Таму што працэс праверкі стрымлівае верыфікацыя, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Сучаснае праграмнае забеспячэнне не гарантуе стапрацэнтнай якасці пераводу рукапіснага тэксту ў электронны фармат. Таму на верыфікатараў ускладзена задача — прасачыць за правільнасцю распазнавання тэхнікай сімвалаў на бланках. Хачу падкрэсліць, што робіцца гэта выключна ў інтарэсах абітурыентаў. Акуратнасцю яны, на жаль, не вылучаюцца, а многія і ўвогуле замест друкаваных літар выкарыстоўваюць прапісныя. Прыкладна кожны дваццаты абітурыент допускае падчас рэгістрацыі хаця б адну памылку. Камп'ютар можа прыняць лічбу «3» за лічбу «8» ці «1» за «7», калі яна напісана неакуратна. А чалавек гэта бачыць і папраўджвае памылку, якая можа абітурыенту вельмі дорага каштаваць. Ці, напрыклад, камп'ютар можа няправільна прачытаць прозвішча абітурыента, таму і сертыфікат будзе выпісаны потым з памылкай у прозвішчы ці ў пашпартных звестках.

Але ёсць і тыя, хто проста абражае арганізатараў ЦТ...

Але ўмяшацца ў працэс праверкі тэставых заданняў верыфікатары не могуць, бо праграмнае забеспячэнне запамінае любое зробленае імі выпраўленне. Кожны верыфікатар працуе пад сваім паролем. Прычым верыфікацыя праводзіцца два-тры разы рознымі людзьмі і фактычна адзін кантралюе другога. А ў сховішчы ёсць яшчэ і папяровы бланк адказаў, які можна ў спрэчнай сітуацыі звярыць з электроннай выявай.

На верыфікацыі ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў задзейнічаны пераважна дзяўчатыстудэнткі. У інстытуце пераканаліся, што дзяўчаты больш падыходзяць для манатоннай работы. Да прэтэндэнтаў на дадатковыя заробкі прад'яўляліся два асноўныя патрабаванні. Яны не могуць удзельнічаць сёлета ў цэнтралізаваным тэсціраванні і не павінны курыць. Работа па верыфікацыі патрабуе максімальнай канцэнтрацыі ўвагі, таму рабочая змена доўжыцца толькі чатыры гадзіны. З 9 гадзін раніцы да 21 гадзіны за камп'ютарнай тэхнікай змяняюцца тры змены.

> **«Абітурыенты дрэнна валодаюць абстрактным мысленнем. У школе трэба больш увагі надаваць заданням з так званым камптэнтасным падыходам».**

Адным з самых распаўсюджаных міфаў з'яўляецца меркаванне, што можна быць абсалютна недасведчаным у пэўнай галіне ведаў і, разам з тым, на тэсціраванні «натыкаць» на мінімальны прахадны бал.

— Я з упэўненасцю магу сказаць, што калі проста расставіць «галачкі» наўздагад, атрымаць прахадны бал немагчыма, — абвяргае гэтую думку **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** — Тым больш мы ў гэтым годзе павялічылі колькасць заданняў катэгорыі B, дзе трэба даваць свой уласны адказ. У той жа час колькасць заданняў, дзе неабходна проста паставіць «галачку», скарацілася. Так што абітурыенту давядзецца самастойна рашаць задачы і прыклады. Верагоднасць адгадвання істотна зменшылася. І ўвогуле, гэта легенда, што можна прыйсці, расставіць крыжыкі і атрымаць станоўчую адзнаку, фантазіі бацькоў і іх дзяцей...

Яшчэ адна распаўсюджаная прэтэнзія апанентаў ЦТ — немагчымасць праверыць на тэсціраванні творчыя здольнасці абітурыентаў.

— Як самыя простыя, так і больш складаныя заданні патрабуюць ад абітурыента на ЦТ пэўнай творчай дзейнасці, — не пагаджаецца Мікалай Фяськоў. — Няўжо заданне, дзе трэба ўстанавіць залежнасці відавога складу расліннасці ад тыпу глебы, тэмпературных паказчыкаў і колькасці вільгаці, не ўтрымлівае элементаў творчасці? Між іншым, ці ёсць увогуле патрэба ў праверцы так званых творчых здольнасцей абітурыента менавіта на экзамене? Скажам, курсант аўташколы падчас іспытаў па ваджэнні аўтамабіля павінен прадэманстраваць экзаменатару навык кіравання транспартным сродкам, а не бездакорна растлумачыць і паказаць на схеме правілы яго паркоўкі на праезнай частцы вуліцы. Па такім жа алгарытме праходзяць любыя іспыты па фіксацыі канчатковага выніку навучання.

Прывяду яшчэ адзін прыклад. Абітурыентам на ЦТ прапанавалі вызначыць плошчу прамавугольніка. Простае заданне выканалі 85% ад агульнай колькасці ўдзельнікаў. З заданнем на вылічэнне плошчы кухні справіліся ўжо толькі 72%. Калі ж абітурыентам прапанавалі вызначыць плошчу прамавугольнага кавалка стальнога ліста, які адрэзалі ад вялізнага рулона металу, з заданнем справілася толькі 44% удзельнікаў ЦТ. Між іншым, усе тры заданні — аднаго ўзроўню складанасці. На мой погляд, справа ў тым, што абітурыенты дрэнна валодаюць абстрактным мысленнем. Лічу, што ў школе трэба больш увагі надаваць заданням з так званым камптэнтасным падыходам.

Некаторыя абітурыенты не задаволены тым, што арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання не дазваляюць азнаёміцца са сваёй тэставай работай ужо пасля яе праверкі.

— Тэставыя тэхналогіі не прадугледжваюць азнаямленне ўдзельнікаў тэсціравання са сваімі работамі — гэта агульнасусветная практыка. Мы абапіраемся на вопыт польскай, галандскай, расійскай і іншых сістэм тэсціравання, — тлумачыць Мікалай Фяськоў. — Цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта масавая форма праверкі ведаў. Уявіце сабе, што тэсціраванне па дзяржаўнай мове адначасова праходзяць больш за 70 тысяч чалавек. Як можна кожнага з іх азнаёміць з экзаменацыйнай работай? Гэта нават фізічна немагчыма.

Што да парушэнняў падчас правядзення ЦТ, то іх у гэтым годзе рэгіструецца няшмат. На выніках васьмі прадметаў 12 чалавек былі выдалены з прычыны допушчаных парушэнняў. Трое з іх — за выкарыстанне на экзамене шпаргалак. Адзін пераблытаў бланкі. Астатнія — за тое, што прынеслі ў экзаменацыйную аўдыторыю мабільныя тэлефоны.

Выяўленне мабільнага тэлефона за заўсёды азначае толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі. Прычым для арганізатараў ЦТ не мае значэння: званіў тэлефон ці не, карыстаўся абітурыент сваім мабільнікам падчас экзамену ці проста трымаў яго ў сваёй кішэні.

Тыя, хто парушыў правілы ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, не змогуць здаць прапушчаны экзамен у рэзервовы дзень — 2 ліпеня. Дарэчы, **рэгістрацыя на тэсціраванне ў рэзервовы дзень распачалася сёння і будзе доўжыцца па 29 чэрвеня (у суботу і нядзелю абітурыентаў чакаюць з 9.00 да 18.00, у астатнія дні — да 19.00).** Звяртацца з дакументамі, якія пацвярджаюць прычыну няяўкі на ЦТ у асноўны дзень, трэба ў Белдзяржуніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт і Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт. Месцам правядзення ЦТ 2 ліпеня вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Здаць тэст у рэзервовы дзень змогуць і абітурыенты, якія прыйшлі у пункты правядзення ЦТ, але не змаглі дапісаць тэст па стане здароўя (такія факты рэгістраваліся непасрэдна ў месцы здачы экзамену).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

**Кожны год у чэрвені на Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў абрушваецца шквал званкоў і лістоў ад абураных абітурыентаў і іх бацькоў. Спачатку тэлефоны абрываюць маладыя людзі, якія забыліся зарэгістравацца на ЦТ і аформіць пропускі на экзамен у вызначаныя тэрміны. Потым высвятляецца, што некаторыя з абітурыентаў здалі свой пашпарт у пасольства і жадаюць прайсці на экзамен па іншым дакуменце, напрыклад, па пасведчанні кіроўцы, або па ксеракопіі пашпарта. Некаторыя ўмудраюцца аднесці свой пашпарт у пасольства адразу пасля здачы апошняга тэста, вось толькі не ведаюць цяпер, як даведацца пра атрыманыя балы, бо не здагадаліся выпісаць свае пашпартныя звесткі. Але ёсць і тыя, хто проста абражае арганізатараў ЦТ, дэманструючы пры гэтым поўную недасведчанасць у пытаннях правядзення прыёмнай кампаніі.**

*«У мяне столькі пытанняў, што працэй перафармуляваць іх у адно: «Калі вы пачняце працаваць для народа, а не супраць яго? Лепш не нараджацца таму чалавеку, які здае ЦТ», — піша адзін з такіх аўтараў.*

*«Працуйце больш хутка і старанна. 24 гадзіны ў суткі, 7 дзён у тыдзень. Ніякіх перапынкаў. Хопіць бакі адлежваць! Ганьбіце ганаровае імя грамадзяніна Беларусі сваёй абуральнай марудлівасцю», — павучае арганізатараў ЦТ яшчэ адзін аўтар.*

*«Самае сумнае, што мы вымушаны на ўсе такія звароты адказваць, замест таго, каб засяроджвацца на сваёй асноўнай рабоце, пакуль яшчэ працягваецца тэсціраванне і праверка работы яго ўдзельнікаў», — канстатуе дырэктар інстытута Мікалай Фяськоў.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ IT-тэхналогіі

# З МОРА Ў АКІЯН

## Чалавецтва асвойвае новыя аб'ёмы інфармацыі

**Больш як тры сотні вучоных, праграмістаў і кіраўнікоў найбуйнейшых IT-кампаній з 8 краін свету сабрала I міжнародная навукова-практычная канферэнцыя BIG DATA and Predictive Analytics, якая прайшла на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.**

Сёння галіна Big Data развіваецца сямімільнымі крокамі, але пакуль яшчэ не паспявае за велізарным аб'ёмам інфармацыі, створанай чалавецтвам. На Facebook размешчана больш за 500 мільярдаў фота. Кожную хвіліну на YouTube выстаўляецца 300 хвілін відэа. Але ў першую чаргу гаворка ідзе не пра тэксты, фота і відэа. Мора інтэрнэт-звестак ператварылася ў бязмежны акіян са з'яўленнем датчыкаў, здольных перадаваць інфармацыю, напрыклад, пра тое, што акружае чалавека з гаджэтам. Чалавецтву неабходна сістэматызаваць гэтыя звесткі, каб імі карыстацца. Ужо можна забыцца пра тэрабайты. Асвойваюцца новыя велічыні: петабайт, эксабайт і зетабайт. Эканоміка, банкаўская дзейнасць, вытворчасць, маркетынг, тэлекамунікацыі, вэб-аналітыка, медыцына — усе гэтыя і многія іншыя галіны маюць патрэбу ў апрацоўцы і аналізе велізарных аб'ёмаў атрыманай і новай інфармацыі, якая вельмі моцна адрозніваецца па сваёй структуры.

У сучасным свеце чалавек безабаронны — інфармацыя пра яго лёгка знаходзіцца і лёгка збіраецца. **Паверэны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Скот РОЛАНД** адзначае, што, магчыма, у будучыні з'явіцца неабходнасць на заканадаўчым узроўні вызначаць межы для тэхналогій Big Data. Але ўжо сёння ўсе разумеюць: для развіцця сучаснай эканомікі свабодны доступ да інфармацыі — гэта рухавік, без якога развіваць бізнес немагчыма. Самыя паспяховыя кампаніі свету Google, Facebook, Apple займаюцца вялікімі аб'ёмамі інфармацыі.

Менавіта ў вырашэнні задач бізнес-прагназавання тэхналогія Big Data найбольш ярка прадэманстравала свае магчымасці. Тэхналогіі вялікіх баз звестак генеруюць для брокераў неабходныя справаздачы і аналітычныя прагнозы, у аснове якіх ляжыць велізарная колькасць інфармацыі з розных крыніц. Міжнародны вопыт сведчыць: арганізацыі, якія пачалі выкарыстоўваць тэхналогію Big Data, атрымалі істотную канкурэнтную перавагу, таму што змаглі прымаць рашэнні на падставе своечасовай, актуальнай, дакладнай і поўнай інфармацыі.

Задачы, якія стаяць у галіне Big Data, патрабуюць сумеснай працы сотняў і сотняў спецыялістаў, якіх яшчэ неабходна падрыхтаваць. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі з'яўляецца ў краіне бясспрэчным лідарам па падрыхтоўцы ў галіне апрацоўкі вялікіх аб'ёмаў інфармацыі. З 2013 года БДУІР сумесна з амерыканскай кампаніяй BEZNext праводзіць навучанне па тэматыцы «Big Data and Predictive Analytics».

У 2015—2016 навучальным годзе ўніверсітэт адкрывае новую спецыяльнасць, звязаную з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі: «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)». Гульнявы сектар у Беларусі развіваецца імклівымі тэмпамі...

— БДУІР правёў апытанне сярод кампаній, якія спецыялізуюцца ў гульнявой сферы, — расказаў **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Паступіла заяўка на падрыхтоўку некалькіх сотняў спецыялістаў. Праўда, пакуль што ёсць адно «але»: мы набіраем на платнае навучанне, паколькі бюджэтныя арганізацыі не замовілі ў гэтай галіне спецыялістаў. Плануецца набраць 30 чалавек, аднак калі будзе шмат ахвотных, то, магчыма, мы перададзім платныя месцы з іншых (менш запатрабаваных) спецыяльнасцяў.

— У БДУІР ужо падрыхтавана некалькі груп спецыялістаў з выпускнікоў магістратуры ў галіне Big Data, якія выконваюць разам з партнёрамі з ЗША сумесныя праекты, — дадаў **прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай працы Сяргей ДЗІК.**

У рамках канферэнцыі быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж БДУІР і галандскай кампаніяй Invisi. Паводле яго, Invisi і кафедра праектавання інфармацыйна-камп'ютарных сістэм факультэта камп'ютарнага праектавання БДУІР распрацоўць для студэнтаў навучальны курс у галіне Business Intelligence. Мяркуецца, што той будзе складацца з 16 лекцый, падзеленых на 4 катэгорыі. Студэнты даведаюцца, што такое Data Warehousing, вывучаць праектаванне і арганізацыю захоўвання вялікіх аб'ёмаў інфармацыі, спасцігнуць падыходы і прынцыпы працы бізнес-аналітыкі, адкрыюць для сябе ETL-працэсы і многае іншае. Па выніках курса тыя, хто прайшоў навучанне, атрымаюць сертыфікаты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

Міхаіл АРЦЕМ'ЕЎ:

# «БЕЛАРУСКІЯ ВУЧОНЫЯ МАЗГАВІТЫЯ І ПРАЦАЗДОЛЬНЫЯ»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Мы чакалі чалавека ў строгім пінжаку, гальштуку «пад самую шыю» і з чорным скураным партфелем. Як-ніяк доктар хімічных навук, загадчык лабараторыі нанахіміі Белдзяржуніверсітэта, самы цытуемы беларускі навуковец. А ён аказаўся па-еўрапейску зручна і проста апранутым, па-беларуску ветлівым і шчырым з намі, сваімі суразмоўцамі. Міхаіл Арцем'еў расказаў «Звяздзе», для чага трэба даваць волю сваім вучням, якім чынам лепей скарыстоўваць вандроўкі за мяжу і чаму варта працаваць у роднай краіне.**

— Так бы мовіць, знешне наша навука не такая прыгожая і прывабная, як гэта бачыцца прыхільнікам серыяла «Тэорыя вялікага выбуху», — жартуе Міхаіл Валянцінавіч і паказвае сваю лабараторыю. — У нас ёсць некалькі цэнтрыфуг, мяшалак і спектрометр, з дапамогай якога можна вызначаць колер нанакрышталяў і іх колькасць. Не ўсе даследаванні мы можам рабіць самі. Некаторыя праводзім, напрыклад, у нашых партнёраў у Германіі, Іспаніі, Расіі і іншых краінах. Але абсталяванне, якое вы бачыце, толькі бляклае аздабленне. Сапраўдная навука знаходзіцца ў галаве кожнага навукоўца.

***— Раскажыце, калі ласка, над чым зараз працуюць у лабараторыі...***

— Асноўныя аб'екты нашых даследаванняў — гэта наначасціцы розных матэрыялаў, якія могуць выкарыстоўвацца для стварэння тэхнікі, напрыклад, у дысплэях новага пакалення. Некалькі месяцаў таму кампанія Samsung анансавала першы ў гісторыі тэлевізар на нанакрышталях. Экран сучаснага тэлевізара складаецца з мікраскапічных кропак чырвонага, сіняга і зялёнага колераў. Перад кожнай з іх стаяць спецыяльныя затворы з вадкіх крышталёў. Яны ці пускаюць святло, ці не. Калі ўсе тры адкрытыя — вока гэта бачыць як белае. Так створаны сучасныя лінзы. Кампанія Samsung вынайшла новую тэхналогію. Яна замест святлафільтраў усталявала нанакрышталі, якія свецяцца тымі ж трыма колерамі, калі падсвечваць іх ультрафіялетам. Так званы эфект люмінесцэнцыі. Мы ствараем новыя матэрыялы з унікальнымі ўласцівасцямі такога кшталту. Кампанія Samsung штогод аб'яўляе грантавы конкурс на фундаментальныя прарыўныя праекты з арыгінальнымі навуковымі ідэямі, якія калі-небудзь у няблізкай перспектыве змаглі б прынесці прыбытак. Мы збіраемся паўдзельнічаць у ім і распрацоўваем новыя матэрыялы для тэлевізараў апошняга пакалення.

***— А дзе яшчэ могуць выкарыстоўвацца наначасціцы?***

— У звышадчувальнай дыягностыцы захворванняў. Гэтым займаецца не толькі лабараторыя нанахіміі БДУ, але і шматлікія навуковыя групы ў свеце. Цяпер такія даследаванні праходзяць у межах флюарэсцэнтнага імунааналізу. Бярэцца нейкі клетачны матэрыял, напрыклад, кроў, і высвятляецца, ёсць у ёй нездаровыя клеткі ці няма. Для гэтага ўводзяць спецыяльны маркер — малекулу-фарбавальнік. Да яго прышываецца бялковая малекула, так званае антыцела, якое дакладна распазнае сваю клетку і пасля свеціцца пад ультрафіялетам патрэбным колерам.

Каля 15 гадоў таму было прапанавана замест іх выкарыстоўваць нанакрышталі. Таму што, у адрозненне ад фарбавальнікаў, мы можам мяняць колер часціц, рухаць так званую паласу люмінесцэнцыі па шырокім спектральным дыяпазоне. Акрамя таго, гэта паскарае працэс вызначэння шкодных клетак ад месяца да некалькіх дзён. Але з іншага боку, наначасціцы непрадказальныя. Невядома, як яны сябе павядуць у арганізме чалавека. Дагэтуль іх тэсціравалі толькі на жывёлінах.

**«Для мяне важна, каб усё было гарманічна: праца, сям'я, адпачынак, сябры. Апошняе асабліва важна. Я добра разумеў, што калі з'еду з Беларусі, то страчу іх».**

***— Гучыць эвалюцыйна!.. Калі зірнуць праз прызму гісторыі, наколькі магчымы і патрэбны былі нанадаследаванні сто гадоў таму? Ці гэта выключная прывілея сучаснасці?***

— Некалькі стагоддзяў таму карыфеі ад навукі працавалі ў адзіночку. За гэта ім ніхто не плаціў, таму ў навукоўцаў павінны былі быць пабочныя даходы.

Сучасная навука пабудавана на зусім іншых прынцыпах. Па-першае, яна вельмі дарагая. Інструмент, які на нанаметровым узроўні дазваляе вызначыць элементны склад часціц і з дапамогай якога калегі ў Іспаніі даследуюць нанакрышталі з нашай лабараторыі, каштуе некалькі мільёнаў еўра. Не кожны можа сабе такое дазволіць. Па-другое, навука стала надзвычай высока спецыялізаванай. Увогуле, вынаходствы з прыстаўкай «нана» — гэта выключна міждысцыплінарныя даследаванні. Калі раней Н'ютан сам ставіў эксперыменты і вопыты, то цяпер нават у межах адной групы зрабіць усё самім нерэальна.

Чалавецтва назапасіла столькі ведаў, што атрымаць іх усе адразу фізічна непадуладна. Таму ўніверсальных вучоных сёння амаль няма. У кожнага ёсць спецыялізацыя. Толькі хтосьці разважае больш шырока і бачыць сваю дзейнасць глабальна, а хтосьці думае пра невялікія задачы.

***— Тое ж самае адбываецца не толькі ў навуцы, але і ў культуры...***

— Бадай, што так. І ў спорце таксама. Па-трэцяе, існуе неабходнасць фактычна штодзённа тлумачыць заказчыкам, а ў нашым выпадку гэта найчасцей дзяржава, навошта патрэбны гэтыя даследаванні. Чаму падаткаплацельшчык павінен аддаваць свае грошы на тое, чым займаюцца навукоўцы. Калі заказ робіць фірма, то афармляецца так званая падача гранта. Па ім сродкі выдзяляюцца на канкрэтныя праекты па стварэнні новых прыкладных тэхналогій. А ёсць фундаментальная навука, і яе найчасцей фінансуе дзяржава і толькі ў невялікай частцы — бізнес. Бо яна — базіс, на якім будуецца ўся эканамічная моц любой краіны. На фундаментальнай навуцы базіруюцца новыя тэхналогіі прыкладной навукі.

***— Без чаго фундаментальная навука не можа існаваць?***

— Без людзей, якія любяць сваю працу, без аптымізму, адкрытасці і камунікабельнасці. Без добразычлівасці да сваіх калег і нават канкурэнтаў. А яшчэ без удзелу навукоўцаў у канферэнцыях. На іх адбываецца ў першую чаргу абмен інфармацыяй. Мы пачынаем разумець, што робяць іншыя групы, узаемна ўзбагачаемся і пры гэтым выкарыстоўваем магчымасць прарэкламаваць сваю працу і краіну ўвогуле. Гэта важна не толькі з пункту гледжання рэнамэ дзяржавы і беларускай навукі, таму што ў працэсе глабалізацыі апошняе вылучыць даволі няпростая задача, але і з боку камунікацыі паміж вучонымі. Такім чынам завязваюцца кантакты, ідзе абмен ідэямі. У адных яны ёсць, а другія згодны іх рэалізаваць. Імкненне зрабіць сумесны праект часта выліваецца ў новыя даследчыя вынікі. Калі гэтага абмену не адбываецца, то навука ператвараецца ў правінцыяльную. Яна не можа выйсці на сусветны ўзровень. Навукоўцы вынаходзяць веласіпед ці яшчэ горш — займаюцца лжэнавукай, бо не атрымліваюць належнай крытыкі ад іншых школ.

Да гэтага ж пытання адносяцца публікацыі ў навуковых часопісах — пагалоска для кожнага вучонага. У постсавецкіх краінах накшталт Беларусі і Расіі большасць вучоных знаходзіцца ўжо ў сталым узросце і ім складана адшукаць сабе месца ў ранжыроўцы па колькасці цытавання. Тут пытанне перш за ўсё моўнае. У савецкі час працы друкаваліся па-руску, на Захадзе былі вядомы з іх толькі самыя выбітныя. Пры гэтым даследаванні ў СССР рабіліся важныя, але на іх ніхто не спасылаўся. Моладзь, якая працуе ў нашай лабараторыі зараз, у гэтым плане вельмі мабільная. Яна накіравана на тое, каб напісаць артыкул па-англійску і першай надрукаваць яго ў замежным часопісе.

**«Калі раней Н'ютан сам ставіў эксперыменты і вопыты, то цяпер нават у межах адной групы зрабіць усё самім нерэальна».**

***— Ці атрымліваецца ўдзельнічаць у замежных канферэнцыях?***

— Дзяржава нас забяспечвае ў асноўным зарплатай, абсталяваннем, рэактывамі, а таксама камандзіроўкамі ў краіны блізкага замежжа. Часам атрымліваецца наведаць міжнародныя канферэнцыі за кошт унутраных сродкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на базе якога мы працуем. Калі такой магчымасці няма, то выкарыстоўваем грошы з атрыманых грантаў, пры іх наяўнасці. Аднак увогуле сітуацыя з удзелам у вядучых міжнародных навуковых канферэнцыях вельмі складаная, асабліва для маладых вучоных, аспірантаў.

***— Як фінансуецца навука ў іншых краінах?***

— У іх вядзенне фундаментальнай навукі адбываецца па конкурснай грантавай форме. Калі прафесар Германіі, які мае поўную прафесарскую зарплату за кошт выкладання ва ўніверсітэце, жадае займацца даследчай дзейнасцю, ён афармляе заяўку на грант і фарміруе адначасова даследчую групу. Далей камісія, якая складаецца з вучоных-спецыялістаў з некалькіх дзяржаў, адбірае найлепшыя праекты ў межах зададзенага напрамку на найбліжэйшыя гады і фінансуе іх. Гэта жорсткая сістэма, але дзейсная.

***— Але давайце вернемся да нашых рэалій. Я ведаю, што ў 1990-я вы маглі з'ехаць з Беларусі, але засталіся і працягнулі тут працаваць...***

— Я адношуся да пакалення, чыё станаўленне прыйшлося на перыяд перабудовы, калі ўмовы жыцця былі не самымі простымі. Таму шмат хто са знаёмых мне аспірантаў БДУ ў той час з'ехаў на Захад. Некаторыя з іх сёння — вядучыя прафесары ў найлепшых універсітэтах свету. Увогуле, беларускія вучоныя запатрабаваныя, таму што вельмі мазгавітыя і працаздольныя. Мы бяром фантазіяй і неардынарнасцю мыслення. А навукоўцы майго ўзроўню, якім у 1990-я было каля 30 гадоў, з цяжкасцю маглі ўвайсці ў складзеную замежную навуковую сістэму, дзе хапае сваіх маладых талентаў.

***— У той час і вы ездзілі вучыцца за мяжу...***

— Так, у 1991 годзе быў 8 месяцаў на стажыроўцы ў Масачусецкім тэхналагічным інстытуце. Ён уваходзіць у пяцёрку найлепшых універсітэтаў свету. У мяне была магчымасць застацца ў Амерыцы. Але я вярнуўся, бо ў Мінску ў мяне ўжо былі маладая жонка і дзіця. Ды і навука не займае 100% жыцця. Для мяне важна, каб усё было гарманічна: праца, сям'я, адпачынак, сябры. Апошняе асабліва важна. Я добра разумеў, што калі з'еду з Беларусі, то страчу іх. Так, у мяне будзе шыкоўная праца і болей чым прыстойныя ўмовы жыцця, а блізкіх людзей — не будзе.

***— Вы засталіся і сталі загадчыкам лабараторыі, бачыце навуковую «кухню» знутры. Як думаеце, што важна, каб беларуская навука развівалася надалей?***

— Мне б хацелася, каб у нас раслі свае навуковыя групы і школы. Для гэтага неабходна, каб моладзь пераймала тыя веды, якімі мы ўжо валодаем. Для вучонага лепшае прызнанне, акрамя Нобелеўскай прэміі, калі поспехі вучня, якога ён вёў ад першых курсаў інстытута да дысертацыі, пераўзыходзяць яго ўласныя.

***— А калі ваш вучань вырашыць з'ехаць і працаваць у іншай краіне, як вы да гэтага паставіцеся?***

— Нармальна. Маладыя і таленавітыя шукаюць месца для поўнай самарэалізацыі. Я разумею магчымасці нашай лабараторыі, таму калі яны перарастаюць іх, усё разумею і адпускаю. Адзіны крытэрый для мяне, як навуковага кіраўніка, — гэта творчы рост чалавека, яго жаданне выйсці на новы ўзровень. Ці можна ў такой сітуацыі адмовіць таленту ў жаданні стаць лепшым?

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МПОВТ», г. Минск, ул. Притыцкого, 62** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимости расположенные по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62, в составе одного лота:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь, м² | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| Административно-бытовой корпус (Литер Ж 4/к) | Здание административно-хозяйственное | 613,3 | 500/С-31573 |
| Здание административно-бытового корпуса № 2 (Литер Г 4/к) | Здание административно-хозяйственное | 799 | 500/С-31575 |
| Складской корпус – финский модуль (Литер Д 1/м) | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 873 | 500/С-31574 |
| Здание сборочного корпуса – финский модуль № 2 Литер Е 1/М | Здание неустановленного назначения | 1389 | 500/С-31570 |

**Обременения:** площади зданий сданы в аренду (16 арендаторов). Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

**Сведения о земельном участке**:
Кадастровый номер: *500000000006007513*. Площадь: *0.4555 га,* из них *0,1547 га* с ограничениями в использовании земель – охранная зона сетей и сооружений канализации, охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения. Целевое назначение: *Земельный участок для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и зданий специализированных иного назначения.* Земельный участок предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 31 августа 2053 года. Годовая арендная плата: *57 389 817 BYR.*

**Начальная цена с НДС 20% – 25 097 184 000 белорусских рублей.**

*Задаток 5% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».*

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона. |

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 05.02.2015

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.07.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **27.07.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактная информация:** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## Вольга ЗАБЕЛІЧ:

# «ДОБРА ТАМ, ДЗЕ МЫ ЁСЦЬ»



**Прэзентацыя дакументальнага цыкла фільмаў «Пра Беларусь з акцэнтам» адбылася ў снежні мінулага года. На тэлеканале «Мір» паказалі пяць першых серый. Праект паспеў не толькі пазнаёміць гледачоў з гісторыямі іншаземцаў, для якіх Беларусь стала другой радзімай, але і атрымаць прызнанне прафесійнага журы ў намінацыі «Лепшая тэматычная праграма» на тэлевізійным конкурсе «Тэлевяршыня». Мы сустрэліся з яго аўтаркай Вольгай Забеліч, каб даведацца, чым прываблівае замежных грамадзян жыццё ў нашай краіне, з якімі героямі аўдыторыя яшчэ зможа пазнаёміцца ў новых серыях і ці сапраўды добра там, дзе нас няма?**

***— Вольга, раскажыце, як з'явілася сама ідэя зрабіць такі праект?***

— Мінулы 2014-ы быў Годам гасціннасці. І кожны тэлеканал хацеў па-свойму выказацца па тэме. А паколькі мы расказваем пра Беларусь ва ўсім свеце (такая асаблівасць і галоўная задача Беларускага прадстаўніцтва міжнароднай тэлерадыёкампаніі «Мір»), то вырашылі развіць канцэпцыю, дзе пра нас гаварыць іншыя людзі. Хто? Вядома, іншаземцы, бо яны прыязджаюць у нашу краіну, застаюцца і бачаць самі, якое жыццё. Мы ж, улічваючы беларускі менталітэт, часцей лічым, быццам усё тут дрэнна і нічога мы не маем, а вось недзе «за мяжой», безумоўна, лепш... Нам жа хацелася, каб героі ў кадры былі са свабоднымі поглядамі на жыццё ў Беларусі. Прычым мы бралі прыклады тых іншаземцаў, якія змаглі знайсці сябе ў нашай краіне. У нас былі рэстаратары, юрысты, кухар, тыя, хто займаецца сельскай гаспадаркай, і гэтак далей. Імёны некаторых з іх, магчыма, і на слыху, але мы імкнуліся расказаць іх гісторыі не толькі беларусам, але і свету.

***— І якая яна, Беларусь, калі глядзець на яе вачамі вашых герояў?***

— Сярод герояў праекта — розныя людзі. Ёсць тыя, хто пражыў у Беларусі дваццаць гадоў, і яны памятаюць час, калі ў крамах былі пустыя паліцы. Як, займаючыся сельскай гаспадаркай, людзі элементарна не маглі набыць тэхніку. І каму знаёмы такія сітуацыі, тыя здольныя параўноўваць: так было, і вось што маем цяпер. Часам чуеш, як усё ацэньваецца з пазіцыі «ў савецкія гады ўсюды быў парадак, а сёння...». Нашым людзям уласцівая настальгія. Паглядзіце, колькі сёння ідзе па тэлебачанні тых жа рэтра-серыялаў. Пачуццё мінулага вельмі моцна яшчэ сядзіць у людзях. Моладзь ужо зусім інакш разважае. І тыя іншаземцы, якія прыехалі ў Беларусь 5 ці 7 гадоў таму, ведаюць зусім іншую рэчаіснасць. Яны параўноўваюць і адзначаюць, што стала больш, напрыклад, тых жа кавярняў, але ніхто не кажа пра пустыя паліцы. Была ў нас гісторыя сірыйца, які прыехаў у нашу краіну з сябрам. І назад дадому ён не адважыўся вярнуцца, каб не было сорамна перад бацькамі. Цяпер у яго ўжо свая справа, жонка беларуска, дзеці і свой дом. Сённяшняе жыццё яго задавальняе. Плюс да ўсяго, ён з'язджаў са спакойнай Сірыі, а потым там распачаўся ваенны канфлікт. Таму яго сям'я вырашыла, што іх дом цяпер тут, і яны застануцца ў Беларусі назаўжды.

***— За час працы над праектам што вас найбольш уразіла, здзівіла?***

— Калі чалавек адважваецца пераехаць у чужую краіну — для мяне гэта ўчынак, на які не кожны здатны. Адна справа, калі людзі прыязджаюць працаваць сюды па кантракце і могуць вярнуцца. Хаця з'ехаць ёсць магчымасць ва ўсіх. Аднак той факт, што людзі мяняюць сваё жыццё і Беларусь становіцца той краінай, дзе яны знаходзяць сабе месца пад сонцам, адкрываюць сваю справу, не можа не ўражваць. Атрымліваецца, наша краіна выйграе «канкурэнцыю» з іх радзімай. Многія іншаземцы, прыязджаючы да нас, упэўнены, што тут вялікі рынак для розных відаў дзейнасці. Той жа кухар з Італіі на сваёй радзіме — звычайная з'ява, а ў нас італьянскі кухар — штучны тавар! Таму ёсць людзі, якія за такога роду прызнаннем і едуць. Кожны з іх адзначае, што менавіта ў Беларусі яны маюць магчымасць здабыць вопыт, якога не атрымаеш больш нідзе.

***— Як вы думаеце, чаму атрымліваецца так, што мы самі часта незадаволены беларускай рэчаіснасцю, а іншаземцаў жыццё ў нашай краіне прываблівае?***

— Па-першае, мне здаецца, што беларусы вельмі схільныя да песімізму, маюць заніжаную самаацэнку. А яшчэ яны часам давяраюць не заўсёды кампетэнтнаму меркаванню. З развіццём інтэрнэту любы чалавек можа даведацца шмат, але ж не варта забываць пра тое, колькі ў віртуальнай прасторы «смецця», не вартага ўвагі. Погляды на некаторыя рэчы фарміруюцца на ўзроўні размоў і чуткак.

Мы былі ў Германіі, дзе жывуць нашы сваякі, і я бачыла эмігрантаў. Безумоўна, сярод іх можна сустрэць паспяховых людзей. Але ёсць і тыя, у каго ўмовы жыцця і працы такія ж, як і ў большасці беларусаў. Атрымліваюць сярэднюю зарплату, працуючы ў краме, плацяць за жыллё і адкладаюць нешта на падарожжа, скажам, у Парыж. Проста там гэта працэй, бо можна сесці на цягнік і праз тры гадзіны ўжо быць на месцы. Вось і ўся розніца па вялікім рахунку. А нашы людзі ўспрымаюць жыццё за мяжой стэрэатыпна. Не варта думаць, быццам у іншай краіне вас чакаюць гарады мільянераў і рай на зямлі.

***— Гісторыі якіх людзей вы раскажаце ў серыях, запланаваных для паказу?***

— У нас будзе сірыец, які застаўся ў Беларусі і развівае тут свой рэстаранны бізнес. Сярод нашых герояў ёсць таксама жанчына з Венесуэлы, якая працуе ў пасольстве і жыве тут ужо сем гадоў. Раскажам пра італьянскага кухара, пра англічаніна, які жыве ў Беларусі і кіруе аддаленым бізнесам. Усяго гледачоў чакае пяць серый: у кожнай будзе расказана дзве гісторыі.

***— Раскрываючы герояў у працэсе здымак, вы заўважылі, чым яны адрозніваюцца ад беларусаў?***

— Нашы героі — гэта людзі, якія некаторы час пражылі ў Беларусі. Зразумела, што да нейкіх асаблівасцяў яны ўжо прызвычаіліся і разумеюць, як можна і як нельга сябе паводзіць. Калі мы абмяркоўвалі з імі будучыя здымкі, то, вядома, агучвалі свае ўмовы наконт таго, што нам патрэбна, і ўсе ішлі на кантакт. І я б не сказала, быццам яны адрозніваюцца нечым ад нас ментальна. Проста гэтыя людзі, як самі некаторыя адзначалі, абеларусіліся. Тая ж Марыя Рохас з пасольства Венесуэлы ўзгадвала, што толькі прыехаўшы ў Беларусь і кантактуючы з людзьмі, яна заўважала розніцу. Маўляў, беларусы больш закрытыя, у адрозненне ад венесуэльцаў, якія пры першай сустрэчы размаўляюць з вамі так, быццам вы знаёмыя ўсё жыццё. А нам патрэбен час, каб разгледзець чалавека, перш чым яму давярыцца і прыняць у сваю кампанію. Спачатку наша гераіня думала: а можа, змяніцца? У выніку вырашыла не рабіць гэтага, таму што такая яе асаблівасць, нацыянальная рыса. Была ўпэўнена, што рана ці позна ёй адкажуць узаемнасцю, і спадзяванні апраўдаліся.

> **«Той факт, што людзі мяняюць сваё жыццё і Беларусь становіцца той краінай, дзе яны знаходзяць сабе месца пад сонцам, адкрываюць сваю справу, не можа не ўражваць».**

***— Скажыце, якой бачыцца будучыня Беларусі, калі параўноўваць вашы прадчуванні і думкі на гэты конт удзельнікаў праекта?***

— Думаю, галоўнае — зберагчы тое, што мы маем. Мы з мужам часта размаўляем пра тое, колькі сёння магчымасцяў адкрывае для цябе свет. Аднак, сустракаючыся з людзьмі, якія жывуць за мяжой, і размаўляючы з імі адкрыта, я разумею: няма сёння месца на зямлі, дзе б ты адчуваў сябе ў бяспецы, не баяўся за сваіх дзяцей... Раю на зямлі не існуе. Чалавек здабывае сабе на хлеб потам і працай і шчасце сваё шукае, працуючы над сабой. І мая задача ў гэтым праекце была якраз у тым, каб не ідэалізаваць жыццё ў нашай краіне, а паказаць яго сапраўдным, якое яно ёсць. Можна думаць, быццам добра там, дзе нас няма... Але дзе гарантыя, што там не стане горш з нашым прыходам?

***— Калі самі вяртаецеся аднекуль з-за мяжы, то аналізуеце, дзе жыццё лепшае?***

— Я не вялікая вандроўніца. Толькі на адпачынак летам выязджаем і да родных мужа, якія жывуць у Германіі. Паўтаруся, для мяне подзвіг, калі чалавек бярэ і едзе некуды. Прычым яшчэ магу зразумець, калі людзі шукаюць сваё шчасце ў еўрапейскіх краінах. А як выходзяць замуж і пераязджаюць у Турцыю, Егіпет, дзе сур'ёзна адрозніваюцца звычаі, менталітэт?.. Ніколі не паверу, пачуўшы, што нехта з'ехаў за мяжу, застаўся там жыць і не ўспамінае пра радзіму. Мне здаецца, гэта самападман. Бо, я перакананая, усе людзі сумуюць па родных мясцінах. Мой брат жыве ў Ірландыі амаль два гады. Ён прызнаецца, што там ты не адчуваеш адкрытасці і блізкасці. Кожны сам па сабе. Вы сустрэліся на нейтральнай тэрыторыі, а потым разышліся хто куды. Як прывыкнуць да таго, што навокал усё чужое і не тваё?

Заўсёды вяртаюся ў Мінск з радасцю. Прылятаючы ў аэрапорт, адчуваю спакой, разумею, што нарэшце я дома. Я люблю з'ехаць кудысьці на пэўны час, а потым вярнуцца і паглядзець на горад, на людзей іншымі вачыма.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

## На арэлях лета — з любімай газетай!

### КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»

**на III квартал або II паўгоддзе 2015 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце**
**ДА 14 ЛІПЕНЯ 2015 ГОДА**
**ў рэдакцыю на адрас:**
**220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**




Сярод падпісчыкаў 16.07.2015 г. будзе разыграна 7 падвесных крэслаў-гамакоў і суперпрыз — садовыя арэлі. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 26.07.2015 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30.09.2015 г. пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2015 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» чытайце ў №101 газеты «Звязда» за 30.05.2015 г.

**Тэлефон для даведак (017) 284 44 04.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 01.06.2015 ПА 30.09.2015.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №2568 ад 25.05.2015, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь

### ПРЫЕМНАЯ НАВІНА —

цэны на падпіску на газету «Звязда» на другое паўгоддзе засталіся ранейшымі!

### Месца сустрэчы — «Вянок дружбы»

**Шаноўныя сябры! 27 чэрвеня «Звязда» ладзіць сустрэчу з чытачамі на фестывалі «Вянок дружбы» ў Бабруйску. Месца сустрэчы — плошча Леніна каля мастацкай галерэі. Вы зможаце больш даведацца пра газету, пагутарыць з яе супрацоўнікамі, прыняць удзел у віктарыне і выйграць прыз. А кожны, хто ў гэты дзень падпішацца на «Звязду», атрымае падарунак ад рэдакцыі!**

### 7 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2015 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)

______________________ **на III кв. або 2–е паўг. 2015 года**

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) [ ] (індэкс) ______________________

______________________

______________________

**Удачы ў розыгрышы!**




## ШТУЧНЫ МАЛАХАЙ — ПЛЕХ ЗАКРЫВАЙ!

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**Вечка (назоўнік ніякага роду) —** верхняя частка пасудзіны, скрынкі; накрыўка. Напрыклад: вечка куфра. Можна падысці да куфра і падняць вечка.

**Плех (адно са значэнняў) —** голае месца сярод поля, лесу. «Сямтам паднімаліся ў неба стромкія яліны і сосны. Іх пакінулі знарок — абсемяняць аголены плех і заводзіць новы лес», — чытаем у Якуба Коласа. Дарэчы, другое значэнне слова «плех» — лысіна.

**Малаха́й —** шапка з «вушамі», падбітая футрам. Слова, дарэчы, мае калмыцкія карані.

**Кудме́нь —** традыцыйны беларускі абярэг. Кудмені засцерагалі нашых продкаў ад няшчасцяў і злых духаў.

**Штучны (прыметнік) —** ненатуральны, зроблены накшталт сапраўднага. «Бакалы, вазы і кілішкі са штучнага хрусталю пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі», — пісаў Іван Шамякін.

**Ваўня́ны (прыметнік) —** зроблены з валасянога покрыва авечак (воўны). Ваўняныя ніткі, ваўняная сукенка, ваўняны касцюм або шалік.

**Дуля з макам —** зусім нічога (не даць, не атрымаць). Беларусы яшчэ скажуць: гула асмаленая, кукіш з маслам, фіга на талерцы, трасцы з макам, трасцы з хваробой, трасцы з халерай, курыную сісю́ і тую не ўсю. Рускі сінонім — *фига с маслом.*

**Выйсці з сябе —** страціць самавалоданне, моцна раззлавацца. Беларускі аналаг — лезці на сцяну, не знаходзіць сабе месца, не памятаць сябе. Рускі — *выйти из себя, прийти в ярость, вспыхнуть.*

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*astashkevich@zviazda.by*

■ Дзень нараджэння

## У ГАСЦЯХ — ЯК ДОМА

### Дзіяна Арбеніна едзе ў Мінск

**Святкаванне дня нараджэння лідара гурта «Начныя снайперы» Дзіяны Арбенінай заўсёды становіцца сапраўднай падзеяй для многіх яе фанатаў. Па даўняй традыцыі, якая налічвае ўжо больш за дзесяцігоддзе, спявачка адзначае гэты дзень на сцэне. І дорыць сапраўднае свята рок-н-ролу ўсім прыхільнікам сваёй творчасці.**

У 2015-м магчымасць раздзяліць з любімай артысткай яе свята змогуць таксама ў беларускай сталіцы. Нагадаем, Дзіяна Арбеніна нарадзілася ў Валожыне 8 ліпеня. Калі дзяўчынцы споўнілася тры гады, яе сям'я пераехала спачатку ў Барысаў, дзе жыла нейкі час, а потым з'ехала ў Расію.

Як адзначаюць арганізатары, 7 ліпеня на радзіме спявачкі, у Беларусі, гледачоў чакае асаблівы вечар. Сама Дзіяна зазначыла: «Калі я прыязджаю ў Мінск, то па-асабліваму сябе адчуваю. Хоць і кажуць, што радзіма — гэта месца, дзе ты жывеш, аднак тыя гады, што правяла ў Беларусі, я добра памятаю. І на канцэртах там у мяне заўсёды асаблівая атмасфера, нібыта я дома».

Калі ёсць жаданне трапіць на канцэрт, то спяшайцеся набыць квіткі ў клубе Re:public, дзе пройдзе мерапрыемства, і ў касах горада.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

# ПАНЯДЗЕЛАК, 29 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.10** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05, 20.00 Меладрама «Нежаночая справа».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05 Меладрама «Маша».**
**13.10, 15.35 Меладрама «Плямяшка». 1-я — 4-я, заключная, серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.40** Форум.
**22.40 Серыял «След».**
**0.45** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**10.35** Азбука густу.
**11.10** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**12.00** Зразумець і абясшкодзіць.
**12.30 Баявік «Моцны арэшак».**
**14.45 Баявік «Моцны арэшак 2».**
**17.55, 0.55 Серыял «Атэль «Вавілон».**
**19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** КЕНО.
**21.40** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**22.35 Серыял «Косці».**
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**23.55 Серыял «Быць чалавекам».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранарак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.25, 19.00, 23.25** Калейдаскоп.
**8.10, 12.35, 19.10, 23.35** «Размовы пра духоўнае».
**8.20 «Пацалунак Сакрата». Серыял. Фільм чацвёрты «Чысты лёд».**
**10.00** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.30** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**11.25** «Наперад у мінулае».
**11.50** М/ф.
**12.45 «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх». Баявік.**
**14.20** «АРТіШОК». Музычны гурт «Pe1ikt».
**14.45** «Таямніца душы». Ікона Мінскай Божай Маці.
**15.15** «Планета Бурштын». Дак. фільм.
**16.45 «Дняпроўскі рубеж». Драма.**
**19.20 «Ваш сын і брат». Кінааповесць.**
**20.45** «Калыханка».
**21.05** «Партызаны супраць Вермахта». 1-я і 2-я серыі. Дак. фільм.
**22.00 «Замах». Серыял. 1-я і 2-я серыі.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 8.10, 00.35** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015. Вынікі дня.
**7.50, 12.35** Спорт-мікс.
**8.30** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
**10.30** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Белшына» (Бабруйск) — «Дынама» (Мінск).
**12.55** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**15.00** Тэніс. Уімблдон.
**23.00** Час футбола.
**23.40** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Джульбарс і Дзіна. Салдаты службы «Д».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Танцуй!». Аб'яўленне пераможцы.
**0.45** «Вячэрні Ургант».
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40 Серыял «Салдаты 6».**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Эліксір маладосці».
**14.50** «Дарагая перадача».
**15.00** «Чыстая праца».
**15.50** «Іншая краіна». «Там, дзе Еўропа сустракаецца з Азіей».
**16.50** «Вялікі горад».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Эксперымент Зямля».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».

**23.30 Маст. фільм «Камедыянт».**
**1.20** «Дакументальны праект»: «Вялікія тайны старажытных скарбаў».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30, 2.25 Маст. фільм «Сумка інкасатара».**
**11.15 Маст. фільм «Тры таполі на Плюшчысе».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 1.30** Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
**14.15, 4.10 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Блажэнная».**
**21.10, 23.15 Серыял «Грач».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 17.10** «Уся Расія».
**12.15 Маст. фільм «Амністыя».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55** «Рассудзяць людзі».
**21.55, 23.10 Серыял «Усё толькі пачынаецца».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Суд прысяжных».
**11.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**12.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.15 Серыял «Горад спакус».**
**14.50** «Ядзім дома».
**15.20, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**21.15 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.00** «Анатомія дня».
**23.40 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.40, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.15, 19.45 Серыял «Мяжа цені».**
**8.15, 13.55, 14.45, 16.25, 19.25** «Хатняя крама».
**8.20 Драма «Апакаліпсіс».**
**10.35, 18.10** «Аналітычная праграма».
**10.45 Трылер «Голдфінгер».**



**12.45** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Ключы ад бездані».**
**14.15** Дак. серыял «Апавяданні пра жывёл».
**15.00 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.35 Серыял «Мёртвая зона».**
**18.20 Серыял «Вострыя казыркі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Далёка-далёка».**
**23.30 Серыял «Байкі са склепа».**

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 15.00, 3.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 10.30, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00** Серыял «Тата навырост».
**11.00** Трылер «Стукач».
**13.15, 15.30** Серыял «Ералаш».
**13.30** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Летні фрэш».
**16.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**19.00** Скетчком «Сям'я 3D».
**20.00** Серыял «Сваццi 2».
**21.10** Фэнтэзі «Апошні дракон: У пошуках магічнай жамчужыны».
**23.05, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».

### КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Наглядальнік».
**11.15** «Я мару пра Джыні, дзяўчыну з каштанавымі валасамі». Маст. фільм.
**12.50** «Лінія жыцця». Аляксандр Асмолаў.
**13.50** Да 85-годдзя з дня нараджэння Барыса Рыцарава. «Вучань лекара». Маст. фільм.
**15.10** «Новая анталогія. Расійскія пісьменнікі». Алена Чыжова.
**15.35, 2.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**15.50** «Сорак першы». Маст. фільм.
**17.15** «Алег Стрыжэнаў». Дак. фільм.
**18.00** Невядомая Еўропа. «Шартр, або Чаму Парыж варты імшы».
**18.30** Жыццё цудоўных ідэй. «Сэрца на далоні».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!».
**19.30** «Алег Басілашвілі. Пра сяброў-таварышаў, пра час і пра сябе». Дак. фільм. Частка 1-я.
**20.00** Вялікі конкурс.
**21.00** «Жывое слова».
**21.40** «Заўтра не памрэ ніколі». Дак. серыял. «ГМА — навука з генам страху».
**22.10** «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы». Маст. фільм. 1-я серыя.
**23.35** Мастсавет.
**23.40** Глядзім... Абмяркоўваем... «Дзённік Шахеразады». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. Паўтор ад 2009 года.
**6.45, 7.50, 11.40, 12.40, 15.15, 17.30, 21.40, 23.00, 23.35, 0.45, 2.20, 3.40** Музычная настальгія.
**7.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Андрэй Міронаў.
**8.50** М/ф «Музычныя казкі».
**9.00** «Быў час». 2009 год.
**10.00** Маст. фільм «І чорт з намі!».
**12.00** «Акулы пяра». Наталля Мядзведзева. 1995 год.
**13.00** Фільм-канцэрт «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**15.00** М/с «Прыгоды Рэкса».
**16.00** Маст. фільм «Дзёрзкасць».
**18.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Буйная гутарка».
**20.40** М/ф «Хлопчык і вобласка».
**20.45** М/ф «Кракадзіл».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.30** «Прэс-экспрэс» 1995 год.
**1.00** Маст. фільм «Крок з даху».
**2.40** М/ф «Як вожык і медзведзяня сустракалі Новы год».
**2.45** М/ф «Як неслі стол».
**4.00** «Колба часу».
**5.00** Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і яго групы «Акварыум». 1990 год.

### EUROSPORT

**9.30** Барацьба.
**10.00, 15.00** Тэніс. «Матс пойнт».
**10.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
**15.30** Лёгкая атлетыка. ЗША.
**17.00** Футбол. Старэйшая ліга футбола. «New York City FC» (ЗША) — «Нью-Ёрк Рэд Булз» (ЗША).
**18.15** Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Portland Timbers» (ЗША) — «Seattle Sounders FC» (ЗША).
**19.30, 21.30, 0.45** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. 1/4 фіналу.
**21.00** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**21.15** WATTS.
**0.30** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**2.15** Аўта- і мотаспорт.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Няўдачлівыя».
**8.15** Камедыя «Вайна гузікаў».
**10.45** Камедыя «Горка».
**12.25** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.10, 19.45, 22.50, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Мамчын сынок».
**18.20** Камедыя «Таксі 3».
**20.20** Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
**23.10** Камедыя «Каханне жыве тры гады».
**1.15** Камедыя «Модная штучка».
**4.00** Камедыя «Хросныя бацькі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50** «Дачныя гісторыі».
**8.15, 19.00, 1.30** Серыял «Забароненае каханне».
**9.45, 3.40** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.35, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.30, 16.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 16.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.15** Маст. фільм «Трэці лішні».
**15.05, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**17.55** Серыял «Тайны следства».
**20.40, 0.00** Серыял «Сямейны дэтэктыў».
**22.20** «Зорныя гісторыі».
**23.15** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**2.50** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.00** Камедыя «Той самы чалавек».
**7.25** Драма «Заганныя сувязі».
**8.55** Камедыя «Мой маленькі анёл».
**10.30** Трылер «Дар».
**12.30** Драма «Снежань».
**14.10** Прыгоды «Залаты Компас».
**16.05** Драма «Прыгавор».
**18.00** Драма «Рамэа і Джульета».
**20.00** Камедыя «Ромавы дзённік».
**22.00** Драма «Мяжа рызыкі».
**23.50** Камедыя «Дом Хэмінгуэй».
**1.25** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**3.40** Драма «Паляванне».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «На здрадзе».
**7.50** Драма «Узломшчык».
**9.20** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**10.40** Баявік «Брат».
**12.45** Камедыя «Набожная Марта».
**15.00** Баявік «Брат 2».
**17.05** Камедыя «З 8 сакавіка, мужчыны!».
**18.50** Камедыя «Дублёр».
**20.20** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**21.50** Трылер «Уцёкі».
**23.55** Камедыя «2 дні».
**1.30** Драма «Падарожжа аўтастопам».
**3.05** Камедыя «Сезон цудаў».
**4.40** Фантастыка «Кантакт».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 10.55** Мегазаводы.
**6.45, 2.35** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30** Займальная навука.
**7.55** Топ-10 мегамонстраў.
**8.40, 19.30** Дагістарычныя монстры Гітлера.
**9.25, 14.00** Ізумруд за 400 мільёнаў долараў.
**10.10, 14.45** Разбагацей або памры на капальні.
**11.40** Скарбашукальнікі.
**12.30** Расплаўленыя грошы.
**13.15, 22.30, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**15.35** Прыручыць дракона.
**16.20** Цар кракадзілаў.
**17.10, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**17.55** Непаражальныя канструкцыі.
**18.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**20.15** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**21.00, 0.45, 3.45** Страчаны лінкар Гітлера.
**21.45, 1.30, 4.30** Абаронцы культурнай спадчыны.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Рэальнае паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Разбуральнікі легенд.
**9.40, 13.50** Гаражная каманда.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на склады.
**13.00, 0.40, 6.24** Дамы на дрэвах.
**14.40, 16.20, 19.40, 4.00, 5.36** Хуткія і гучныя.
**15.30** Як уладкаваны Сусвет.
**17.10, 4.48** Махінатары.
**18.50** Эфект Карбанара.
**20.30** Аэрапорт знутры.
**22.10** Рыбацкія легенды.
**23.00** Выжыць разам.
**23.50** Аляска: сям'я з лесу.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Паляўнічыя на рэліквіі.

# АЎТОРАК, 30 ЧЭРВЕНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.55, 20.00 Меладрама «Нежаночая справа».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05 Серыял «Вангелія». Заключная серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.55 Драма «Снайперы. Каханне пад прыцэлам».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Буйным планам.
**0.45** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**10.10** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**11.25, 21.40** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.20, 22.35 Серыял «Косці».**
**13.20, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.10** «Хачу ў тэлевізар».
**15.45** «Comedy woman».
**17.55, 0.55 Серыял «Атэль «Вавілон».**
**21.00** Рэальны свет.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.30 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**23.55 Серыял «Быць чалавекам».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.30, 18.50, 0.30** Калейдаскоп.
**8.10, 21.55 «Замах». Серыял.**
**9.40, 16.00** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Рыжы, сумленны, закаханы».
**10.05, 16.25 «Рыжы, сумленны, закаханы». Фільм-казка.**



**12.40** «Ваш сын і брат». Кінаповесць.
**14.10 «Ніхто, акрамя нас». Драма.**
**19.00 «Камісар». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.00** «Партызаны супраць Вермахта». Дак. фільм.
**23.20** С. Пракоф'еў. «Маддалена». Опера Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
**0.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанага дзеяча навук Беларусі, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук Фёдара Фёдарава.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.15, 7.50, 00.20** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Спорт-мікс.
**8.10** Час футбола.
**9.00** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Італія — Беларусь.
**10.50** Футбол. Чэмпіянат свету (U-20). Матч за трэцяе месца.
**12.50** Першыя Еўрапейскія гульні. Баку-2015.
**15.00** Тэніс. Уімблдон.
**20.00** Спорт-кадр.
**23.30** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10, 0.05** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10, 1.00** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Старэйшая дачка».**
**23.05 Серыял «Рані».**
**1.50** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Няпрошаныя госці».**
**10.40 Серыял «Салдаты 6».**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Наша справа».
**14.00** «Эліксір маладосці».
**14.55, 23.25 Серыял «Турысты».**
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы»: «Падводныя монстры».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.05** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**1.05** «Дакументальны праект»: «Жыццю насуперак».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 2.50 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**11.20 Маст. фільм «Блажэнная».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.00** Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
**14.15, 4.25 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**16.25, 1.05** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Маст. фільм «Арфа для каханай».**
**21.10, 23.15 Серыял «Грач».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.35** «Дыяспары».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30 Маст. фільм «Каханне з прывілеямі».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Мая планета».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**20.55** «Рассудзяць людзі».
**21.55, 23.10 Серыял «Усё толькі пачынаецца».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Суд прысяжных».
**11.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**12.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**13.15 Серыял «Горад спакус».**
**14.50** «Справа густу».
**15.20, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Новае жыццё сышчыка Гурава. Працяг».**
**21.15 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.00** «Анатомія дня».
**23.40 Серыял «Пятніцкі. Глава другая».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.10, 19.35, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 19.40 Серыял «Мяжа цені».**
**8.20, 18.15 Серыял «Вострыя казыркі».**
**9.20, 13.55, 15.45, 16.30, 19.20, 20.55** «Хатняя крама».
**9.40 Серыял «Тайны Ніра Вульфа».**
**10.30, 23.30** «Хобі TV».
**11.00 Драма «Вясна, лета, восень, зіма... і зноў вясна».**
**12.50** «Кінаблакнот».
**13.00 Серыял «Ключы ад бездані».**
**14.15** Дак. серыял «Апавяданні пра жывёл».
**14.45 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.15** «Золата маўчання».
**16.40 Серыял «Мёртвая зона».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Камедыя «Час палюбоўнікаў».**
**23.00 Серыял «Байкі са склепа».**

## ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 15.00, 3.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Скетчком «Сям'я 3D».
**11.00** Фэнтэзі «Апошні дракон: У пошуках магічнай жамчужыны».
**12.50, 15.30** Серыял «Ералаш».
**13.30** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Летні фрэш».
**16.00, 20.00** Серыял «Сваціз 2».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Халасцякі ў адрыве».
**23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15** «Рэгтайм Бэнд Аляксандра». Маст. фільм.
**13.05** «Сусветныя скарбы культуры».
**13.20** «Эрмітаж-250».
**13.50, 22.10** «Клуб самагубцаў, або Прыгоды тытулаванай асобы». Маст. фільм.
**15.10** «Новая анталогія. Расійскія пісьменнікі». Барыс Акунін.
**15.40, 21.00** «Жывое слова».
**16.20, 20.00** Вялікі конкурс.
**17.20** «Астравы». Яўген Баўэр.
**18.00** Невядомая Еўропа. «Зянон Веронскі, або З'ява грамадскіх цудаў».
**18.30** «Жыццё цудоўных ідэй». «Эвалюцыйныя бітвы, або Страсці па Дарвіне».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!».
**19.30** «Алег Басілашвілі. Пра сяброў-таварышаў, пра час і пра сябе». Дак. фільм.
**21.40** «Заўтра не памрэ нікалі». Дак. серыял. «Землятрусы: прагноз, якога няма?».
**23.35** Мастсавет.
**23.40** «Рэгтайм Бэнд Аляксандра». Маст. фільм.
**1.30** «Зорка Маір. Фёдар Салагуб». Дак. фільм.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Акулы пяра». Наталля Мядзведзева. 1995 год.
**6.40, 9.15, 11.30, 15.40, 17.00, 17.35, 20.25, 21.40, 23.00, 23.35, 0.45, 1.50, 5.40** Музычная настальгія.
**7.00** Фільм-канцэрт «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
**9.00** М/с «Прыгоды Рэкса».
**10.00** Маст. фільм «Дзёрзкасць».
**12.00** The Best of «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «Буйная гутарка».
**14.40** М/ф «Хлопчык і воблака».
**14.45** М/ф «Кракадзіл».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».
**17.30, 23.30** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**18.00** «Тэатральны раман». Маскоўскія тэатры ў 80-я гады...
**19.00** Маст. фільм «Кветкі для Олі».
**20.45** М/ф «Медзведзяня і кот, які жыве ў рэчцы».
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 4-я частка. Паўтор ад 2009 года.
**1.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Андрэй Міронаў.
**2.50** М/ф «Музычная казкі».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «І чорт з намі!».

## EUROSPORT

**9.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
**15.00** Конны спорт. Скачкі. Агляд тыдня.
**15.15** WATTS.
**16.15** Тэніс. «Матс пойнт».
**16.45, 1.00** Футбол. Кубак свету. Жанчыны. 1/4 фіналу.
**20.45** Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
**21.00** Бокс.
**23.00** All Sports.
**23.30** Ралі. За кулісамі ERC.
**0.00** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**0.30** Аўтагонкі. Нарысрынг.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.10, 17.35, 22.05, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Вайна гузікаў».
**8.35** Камедыя «Канікулы Дзюкабю».
**10.50** Камедыя «Мамчын сынок».
**12.30** Камедыя «Таксі 3».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (шоу)».
**14.25, 15.10, 19.45, 22.50, 0.50, 2.55** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Каханне жыве тры гады».
**18.20** Камедыя «Дзённік кар'ерысткі».
**20.20** Камедыя «Блізнюк».
**23.10** Камедыя «Спатканне ўсляпую».
**1.15** Камедыя «Горка».
**4.00** Камедыя «Модная штучка».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.50, 3.30** «Дачныя гісторыі».
**8.15, 19.00, 1.40** Серыял «Забароненае каханне».
**9.40, 3.55** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.30, 4.40** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.25, 17.00** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.15, 16.05** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.10, 18.00** Серыял «Тайны следства».
**14.10, 3.05** «Простыя складанасці».
**14.40, 22.25** «Зорныя гісторыі».
**15.35, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**20.40, 0.10** Серыял «Сямейны дэтэктыў».
**23.20** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

## ТБ1000

**5.40** Прыгоды «Залаты Компас».
**7.30** Трылер «Дар».
**9.25** Драма «Сем гадоў у Тыбеце».
**11.40, 1.50** Драма «Полак».
**13.40** Дэтэктыў «Начны цягнік да Лісабона».
**15.30** Камедыя «Ромавы дзённік».
**17.25** Драма «Знаёмцеся, Джо Блэк».
**20.20** Драма «Паляванне».
**22.15** Меладрама «Сямейка Джонсаў».
**23.55** Драма «Прыгавор».
**4.00** Драма «Сховішча».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Баявік «Небяспечныя гастролі».
**8.10** Драма «Доўгія праводзіны».
**10.10** Камедыя «Нянька».
**12.00** Драма «Узломшчык».
**13.40** Драма «Туман».
**16.20** Трагікамедыя «Не думай пра белых малпаў».
**18.30** Драма «Нябесны суд».
**20.20** Драма «Дыялогі».
**22.00** Драма «Нябесны суд. Працяг».
**1.50** Камедыя «Зімовы сон».
**3.50** Драма «Царскае паляванне».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 10.55** Мегазаводы.
**6.45, 2.35** Зрабі або памры.
**7.10** Гульні розуму.
**7.30** Займальная навука.
**7.55, 19.30** Страчаны лінкар Гітлера.
**8.40, 14.00, 20.15** Абаронцы культурнай спадчыны.
**9.25** Непаражальныя канструкцыі.
**10.10, 14.45** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**11.40** Скарбашукальнікі.
**12.30** Расплаўленыя грошы.
**13.15, 22.30, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**15.35** Паляванне на рачную пачвару.
**16.20** Лясное царства.
**17.10, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Код небяспекі.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Шырокі погляд.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Рэальнае паранармальнае.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 13.50** Хуткія і гучныя.
**12.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**13.00, 6.24** Ашалелая рыбалка.
**14.40, 5.36** Хаос у дзеянні.
**15.30, 18.00** Як уладкавана Зямля.
**16.20** Недружалюбны Сусвет.
**17.10** У пагоні за каметай.
**19.40** Неба ў агні. Планета дзень за днём.
**20.30** Космас навыварат.
**22.10** Поўны фарсаж.
**23.00** У пагоні за класікай.
**23.50** Дом для аўто.
**0.40, 1.55** Эфект Карбанара.
**1.05** Бар на заказ.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**4.00** Калекцыянеры аўто.
**4.48** Махінатары.
**7.12** Top Gear у Батсване.

## Не прапусціце

# «ВЫПУСКНЫ» Ў «АКАДЭМІІ ТАЛЕНТАЎ»

**Яркае музычнае шоу «Акадэмія талентаў. Чацвёрты курс» набліжаецца да завяршэння. На працягу 12 тыдняў прадзюсары працавалі з самымі годнымі маладымі выканаўцамі. З тымі, хто прайшоў сур'ёзны адбор і ўвесь гэты час даказваў, што заслугоўвае права быць студэнтам на праекце. Падчас апошняга этапу ўдзельнікі выконвалі арыгінальныя кампазіцыі, напісаныя прадзюсарамі. І па выніках іх выступленняў былі вызначаны пераможцы.**



Да далейшага спаборніцтва дапушчаны Лявон Гзыран і Мерыем Герасіменка (прадзюсар Яна Станкевіч), Ян Яраш і Амара (прадзюсар Дзмітрый Фаміч), а таксама Ганна Рай і дуэт «К-2» (прадзюсар Павел Клышэўскі).

Усяго больш за шэсць месяцаў творчая група праекта разам з вакалістамі і прадзюсарамі працавалі над тым, каб эфіры «Акадэміі талентаў. Чацвёрты курс» былі яркімі і запамінальнымі.

«Калі ў першым і другім сезонах фармат толькі зараджаўся, выстройваўся, то трэці і чацвёрты сезоны ўжо дапоўніліся новымі і цікавымі дэталямі, ператварыўшыся ў адточаную форму. З'явіліся традыцыі і новыя правілы. Так, напрыклад, у чацвёртым сезоне вельмі важную, а часам і вырашальную ролю адыгрываў Леанід Шырын. Статус прафесара дазволіў яму расставіць усе кропкі над «і» ў некаторых спрэчных момантах, што дапамагала нам, прадзюсарам, у вырашэнні складаных задач, — заначыў рэжысёр праекта Аляксандр Патапаў. — Наш калектыў пражыў на праекце маленькае жыццё, напоўненае сапраўднымі эмоцыямі. «Акадэмія талентаў» аказалася сур'ёзным выпрабаваннем не толькі для ўдзельнікаў, бо прадзюсары перажывалі за сваіх падапечных не менш іх саміх. І рабілі ўсё магчымае, каб падтрымаць канкурсантаў у гэтай нялёгкай барацьбе. А мы ў сваю чаргу імкнуліся праўдзіва паказаць усё нашым гледачам».



У суботу 27 чэрвеня гледачоў чакае яшчэ адно арыгінальнае шоу, а саміх канкурсантаў — чарговае выпрабаванне. Прадзюсары і прыхільнікі ўдзельнікаў праекта даведаюцца, наколькі крэатыўныя хлопцы і дзяўчаты. Кожнаму ўдзельніку будзе дадзена поўная свабода дзеянняў у стварэнні арыгінальнага нумара, і толькі на самім выступленні настаўнікі праекта змогуць убачыць, што прыдумалі іх падапечныя. Будзем чакаць, чым жа здзівяць нас студэнты «Акадэміі талентаў. Чацвёрты курс», каб праз тыдзень усім разам вызначыць пераможцу. Фінальнае шоу на канале АНТ адбудзецца 4 ліпеня — толькі тры ўдзельнікі будуць змагацца за права стаць пераможцам. Найлепшага выберуць гледачы падчас галасавання. Таму актыўна падтрымлівайце любімых удзельнікаў «Акадэміі талентаў», іх лёс у вашых руках.

Па традыцыі пераможца атрымае грашовы прыз у памеры 100 мільёнаў рублёў і магчымасць супрацоўнічаць з адным з самых лепшых прадзюсараў краіны

алімпіец
ЗВЯЗДА
Выпуск № 5 (33)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

EuroBasket WOMEN 2015 HUNGARY-ROMANIA

# ЗА КРОК ДА ФІНАЛУ

## Жаночая зборная Беларусі выйшла ў паўфінал Еўрабаскета

**Чвэрцьфінальны матч нашай каманды супраць зборнай Літвы склаўся па сцэнарыі галівудскага трылера. Спачатку развіццё сюжэта без асаблівай інтрыгі (нядрэннай перавагай завалодалі беларускі пасля першай паловы сустрэчы), пасля чаго галоўныя героі паглыбляюцца ў сумненні, узнікае барацьба з самімі сабой і ворагамі-сапернікамі, што прыводзіць да нечаканай развязкі.**

У трэцяй чвэрці літоўскія баскетбалісткі дабавілі перцу ў гульню, якога, здаецца, не хапала на пачатку матча. Але моцны адрэзак сапернiц — 14:4 — ацверазіў падапечных Анатоля Буяльскага, і да пачатку заключнай чвэрці нашы баскетбалісткі ўсё ж такі захавалі больш-менш камфортны зачын. Але па законах жанру ў канцы матча ў барацьбу ўступілі нервы, стомленасць; абарона беларусак перастала быць эфектыўнай, а саперніцы пачалі трапляць — хоць з-пад кольца, хоць з-за дугі.


Рэакцыя галоўнага трэнера зборнай Беларусі Анатоля БУЯЛЬСКАГА на перамогу падапечных.

Дарэчы, у трохачковых кідках наша каманда відавочна саступала літоўкам (1 да 6). Прычым, амаль што палова ўсіх спроб здабыць важныя ачкі з далёкай дыстанцыі належала Кацярыне Сныцінай. Яна ж ледзьве не пазбавіла сваю каманду, а заадно і тысяч балельшчыкаў, паўфіналу Еўрабаскету і алімпійскай надзеі, за некалькі секундаў да фінальнай сірэны запусціўшы мяч у аўт. Перавага ў два ачкі, 1,5 секунды гульнявога часу і атака саперніц — чым не развязка ў стылі трылера? У гэты момант граматна спрацавалі Настасся Верамеенка і Марыя Папова, чыя падвоеная абарона сарвала атаку сапернiцам і дазволіла выдыхнуць Анатолю Буяльскаму, а разам з ім тысячам нашым заўзятарам. Зборная Беларусі зноў у паўфінале чэмпіянату Еўропы — і з пропускам у алімпійскую кваліфікацыю!

Ужо сёння падапечныя Анатоля Буяльскага згуляюць супраць зборнай Сербіі, якая два гады таму абыгрывала нашых дзяўчат на другой групавой стадыі Еўрабаскета. Дзве вопытныя каманды, якія гуляюць амаль у тым жа складзе, вырашальная стадыя топ-турніру — усё нагадвае пра рэматч! Самы час дэманстраваць, што на памылках вучацца...


У чвэрцьфінальным матчы Таццяна ЛІХТАРОВІЧ (першая злева) набрала 14 ачкоў і стала адным з самых выніковых гульцоў каманды.

Дзмітрый ГЕРЧЫКАЎ:

# «У ПАЎФІНАЛЕ ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПАДДАВАЦЦА НА БЕГАНІНУ СЕРБАК»

**Вядомы спартыўны каментатар аналізуе матч беларускай зборнай супраць каманды Літвы, тлумачыць недарэчную памылку Кацярыны Сныцінай і распавядае, якi баскетбол варта чакаць у гульні з сербскімі баскетбалісткамі.**

***— Матчы супраць чэшак, чарнагорак, літовак — ва ўсіх гэтых сустрэчах быў пэўны пералом і вельмі напружаная канцоўка. Чаму ў нашай зборнай не атрымліваецца спакойна давесці перавагу да перамогі?***

— Самае простае тлумачэнне — гэта жаночы баскетбол. Калі мужчыны, выступаючы на такіх буйных турнірах, практычна ніколі не ўпускаюць перавагу ў 15-20 ачкоў, то ў жанчын дастаткова камандзе прапусціць рывок 5:0 (а гэта ўсяго толькі адзін далёкі кідок і адзін сярэдні), і пачынаецца паніка. Таму ў жаночым баскетболе і лічыцца, што камандзе, якая саступае 7-8 ачкоў, у канцоўцы прасцей, чым саперніцам. Гэта амаль што аксіёма.

***— Ці не было ў цябе адчування, што, калі б у літовак было яшчэ дзве-тры хвіліны, гэтай перамогі магло б і не быць?***

— Не. Бо я разумею, што ў гэтыя дзве-тры хвіліны маятнік мог хіснуцца ў іншы бок. Пару разоў саперніцы не трапілі ў кольца, наадварот, праходзiць ўдзяк у нас — і атрымліваем той жа вынік. Па першай палове матча я быў упэўнены, што гэтай перавагі хопіць, каб абыграць саперніц. А ў другой мне вельмі не спадабалася судзейства. Тое, як нашых баскетбалістак нагрузілі фаламі, дарэчы, і падарвала настрой каманды. Дзякуючы штрафным літоўкі падцягнуліся, вось і атрымалася такая нервовая канцоўка. Да ўводу мяча ў гульню Кацi Сныцінай у мяне было стойкае адчуванне, што беларускі кантралююць гульню.

***— Паспрабуй тады патлумачыць яе памылку.***

— Секунднае зацьменне. На імгненне страціла канцэнтрацыю, магчыма, стамілася... Вопытны гулец, якi выступаў у моцных чэмпіянатах, проста так, на роўным месцы, не памыляецца. Зноў-такі, жаночая псіхалогія. Мужчына-баскетбаліст у гэтай жа сітуацыі, упэўнены, паступіў бы больш прагматычна.

***— Гульня Сныцінай не насцярожвае? То ўвогуле нічога не атрымліваецца, то нешта заляціць, удалы блок, пасля зноў незразумелыя дзеянні...***



— Дык яна на працягу ўсёй сваёй кар'еры так гуляе. Вось такая манера ў баскетбалісткі. Калісьці Каця амаль у адзіночку ўмудралася абыгрываць лепшы на той момант клуб Еўропы, УГМК з Екацярынбурга. Выступаючы за «Волагду», «адгружала» ім 35 ці 36 ачкоў. А ў іншы дзень мела статыстыку 1-14. Ну, не ідзе, і ўсё — тут ніяк не ўгадаеш.

***— Дрэнная рэалізацыя трохачковых можа перашкодзіць нам у матчы з Сербіяй?***

— Для нас гэта не будзе ключавым фактарам, для саперніц — так. Калі ў сербак залятае, з імі цяжка змагацца. З іншага боку, у іх такая каманда — «абыграй і кінь». Прымушаюць сапернiц мяняцца, выходзяць адна ў адну, закідваюць — і, як індзейцы, імчацца на падбор. Такая рухавая, актыўная зборная. У нас жа каманда, якая дэманструе пазіцыйны баскетбол. У матчы супраць сербак галоўнае — не паддавацца на гэтую беганіну, запавольваць гульню, каб саперніцы хадзілі за намі і ў пакутах думалі, што зрабіць у тактычным плане, каб ім элементарна далі разбегчыся. Як толькі ў нас гэта атрымаецца, сербкі хутка развалацца. Я вельмі вылучаю на нашу пару «вялікіх» — Насцю і Лену (Настасся Верамеенка і Алена Леўчанка. — **Аўт.**), якія могуць проста зацiснуць сапернiц. Спадзяюся, што на перыметры, у абароне, згуляе, як у пачатку турніру, Таня Ліхтаровіч, каб нейтралізаваць лідара сербак — Ану Дабавіч. Хочацца, каб менавіта ў гэтым матчы згуляла на ўсе 100% Ліндсэй Хардзінг.

***— Дарэчы, амерыканка ўваходзіць у тваю тройку фаварытаў са зборнай Беларусі на гэтым турніры?***

— Хутчэй не. Без сумненняў, у гэтым спісе Леўчанка і Верамеенка. Супраць літовак, напрыклад, Насця згуляла проста шэдэўральна. Як багіня! Вельмі дапамагае камандзе Маша Папова. Чаго не хапае Хардзінг? Яна шмат карысці прыносіць у нападзенні. У нас ніколі не было такой хуткай, учэпістай разыгрываючай, індывідуальна моцнай у плане набора ачкоў. Аднак у абароне Ліндсэй часта недапрацоўвае, і ее памылкі прымушаюць чатырох астатніх гульцоў выконваць яшчэ больш аб'ём працы. У той жа час тое, як яна без замен праводзіць 38 хвілін на паркеце, атакуе і выратоўвае сітуацыі, якія зайшлі ў тупік, выклікае павагу. Але тут трэба ўлічваць, што з камандай Хардзінг рыхтавалася толькі тры тыдні. Упэўнены, што да алімпійскай кваліфікацыі яна пройдзе паўнавартасную падрыхтоўку са зборнай, і гэта яшчэ больш умацуе нашы шанцы на пуцёўку ў Рыа.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.
zapolskaya@zviazda.by


Ці змогуць беларускі спыніць Ану ДАБАВІЧ і яе каманду?

## Футбол

# БАТЭ СУСТРЭНЕЦЦА З ІРЛАНДЦАМІ

## Беларускія клубы даведаліся пра сваіх сапернікаў па еўракубках

Так, барысаўскі БАТЭ, наш чэмпіён, пачне футбольны еўрашлях з другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў. Сапернікам «жоўта-блакітных» стане аднайменны ірландскі клуб з 37-тысячнага гарадка Дандалк. Аляксандр Ермаковіч, галоўны трэнер барысаўчан, прызнаўся, што «Дандалк» — дружына зусім незнаёмая. Увогуле ж узровень вельмі складана, паколькі ў Беларусі нялёгка сачыць за чэмпіянатам Ірландыі. «Пастараемся раздабыць максімум звестак, відэаматэрыялы. Калі атрымаецца, адправім разведчыка, каб ужывую паглядзець гульню «Дандалка».

На першай стадыі Лігі Еўропы салігорскі «Шахцёр» сустрэнецца з «Гленавонам», клубам з Паўночнай Ірландыі, а жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» — з албанскім «Кукесі». Мінскае «Дынама» распачне сёлетняе выступленне ў еўракубках з другога кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы, дзе сустрэнецца з клубам «Чорна Мора» з Варны, уладальнікам Кубка Балгарыі. Першыя матчы з удзелам беларусаў у Лізе Еўропы пройдуць 2 і 9 ліпеня. БАТЭ з «Дандалкам» згуляюць 14 ці 15 ліпеня.



# «ШАХЦЁР» ЗАСТАЎСЯ БЕЗ НАСТАЎНІКА

## Галоўны трэнер «гарнякоў» Сяргей Бароўскі падаў у адстаўку

Заяву Бароўскага кіраўніцтва клуба прыняла станоўча. Як паведаміў афіцыйны сайт каманды, выконваць абавязкі галоўнага трэнера да завяршэння бягучага сезона будзе Сяргей Нікіфарэнка. У сваім каментарыі Сяргей Бароўскі прызнаўся, што страціў сувязь з камандай, а таму вырашыў, што працаваць далей з «Шахцёрам» няма сэнсу.

Нагадаем, летась Бароўскі з «Шахцёрам» заваяваў Кубак Беларусь і вывеў каманду ў раўнд плэй-оф Лігі Еўропы. У чэмпіянаце краіны салігарчане пакуль ідуць на трэцім месцы.

Якаў ЖУРБІН

# ФУТБАЛІСТ З «ЖАЛЕЗНЫМ МІНУЛЫМ»



**У аднаго з самых перспектыўных футбалістаў зборнай Беларусі Івана Маеўскага добры настрой. Ён сядзіць перада мной у сталічнай кавярні, што ў цэнтры, п'е гарбату, шчыра ўсміхаецца і падрабязна расказвае гісторыю сваёй мудрагелістай спартыўнай кар'еры. Калісьці ён працаваў на заводзе ў Рэчыцы, ляпіў этыкеткі на скрынкі з цвікамі, а нядаўна дэбютаваў за нашу зборную, быў прызнаны адным з самых лепшых паўабаронцаў першынства Польшчы і актыўна «сватаецца» прэсай у гранды тамтэйшага футбола.**

## «З Іспаніяй гулялася спакойна»

***— Іван, ты ўжо паспеў раскласці ў галаве па палічках усё прыемнае, што з табой здарылася за гэтыя паўгода?***

— Так, для мяне гэта нават вельмі прыемныя 6 месяцаў, але на іх я асабліва не зацыкліваюся. Хто ведае, можа да іх я ішоў доўгія 6 гадоў. Калі камусьці здаецца, што ў маёй кар'еры ўсё адбылося вельмі хутка, гэта зусім не так.

***— Многія кажуць, што адчуваюць неперадавальныя эмоцыі, калі ўпершыню трапляюць у нацыянальную каманду краіны. А што цябе найбольш уразіла, калі прыехаў гуляць за Беларусь?***

— Асабліва нічога. Той час, які я правёў у Польшчы, мяне шмат чаму навучыў, і я на многія рэчы гляджу ўжо вельмі спакойна, адэкватна, без здзіўлення. Да таго ж мяне выклікалі ў нацыянальную каманду разам з Аляксандрам Макасём, з якім доўга гуляў за «Партызан» і «Мінск». На зборы мы жылі ў адным пакоі, разам харчаваліся. Пры гэтым атмасфера ў зборнай адразу была камфортнай і простай. Гэта вельмі дапамагло.

***— І матч з Іспаніяй ты таксама ўнутрана ўспрымаў больш-менш спакойна?***

— Неспакойна мне было, калі выходзіў на размінку. Мы працавалі разам з Максам Валадзько, і ў першыя хвіліны я нават не мог аддаць яму дакладную перадачу на два метры. Вось тады я хваляваўся, а падчас гульні, прызнаюся шчыра, адчуваў сябе спакойна.

## «З дзяцінства хварэю за італьянскі «Ювентус»

***— Ты неяк сказаў, што трапіў у зборную, на якую яшчэ нядаўна глядзеў па тэлевізары. А ці атрымлівалася ў дзяцінстве ўжывую назіраць за матчамі нацыянальнай каманды?***

— Не, мая Рэчыца знаходзіцца далёка ад Мінска, і дабірацца было вельмі складана. Аднак я стараўся глядзець трансляцыі дома, не прапускаць ніводнага матча каманды. Памятаю, што мне вельмі падабалася гульня Максіма Рамашчанкі, Аляксандра Хацкевіча, таго ж Валянціна Бялькевіча, Аляксандра Кульчыя. Генадзь Туміловіч быў вельмі забаўным, своеасаблівым, але добрым варатаром.

***— Вынікі матчаў у нататнік не запісваў?***

— Не, гэта было б перабор. Праўда, футбол я любіў заўжды. Калі б 7 гадоў таму наведалі нашу кватэру ў Рэчыцы, убачылі б мой пакой, цалкам завешаны карткамі, плакатамі з футбольных часопісаў. Сярод іх пераважалі выявы нацыянальных зборных і турынскага «Ювентуса» — маёй любімай каманды. Меў тры майкі гэтай каманды з прозвішчамі Дэль П'ера, Недведа і Індзагі. Пастаянна глядзеў Лігу чэмпіёнаў. З нецярпеннем чакаў, калі ж надыдуць 21:45 (традыцыйны час пачатку матчаў гэтага турніру. — **Аўт.**), і хлопчыкі пад гімн будуць трэсці вялікім палотнішчам у цэнтры поля. Многія матчы запісваў на відэакасеты. Самы любімы з іх адбыўся ў 2003-м. Тады «Ювентус» перамог мадрыдскі «Рэал» з лікам 3:1 і выйшаў у фінал.

Амаль увесь вольны час я праводзіў з мячом на вуліцы. У нашым двары так склалася, што адна палова падтрымлівала «Юве», а другая — англійскі «Манчэстэр Юнайтэд». І мы, як балельшчыкі гэтых камандаў, надзявалі майкі адпаведных клубаў і ладзілі паміж сабой матчавыя сустрэчы. Поле знаходзілася ў двары. Самастойна рабілі вароты, але камунальнікі іх разбіралі. На жаль, у гэтых матчах мы часцей саступалі. Яшчэ памятаю, на нашай гульнявой пляцоўцы ніколі не было расліннасці, а нядаўна прыехаў дадому і ўбачыў на ёй даволі высокую траву. І за тры дні, якія я правёў на радзіме, ні разу не бачыў, каб нехта там гуляў. Хаця цяпер лета, надвор'е нядрэннае... Неяк сумна ад гэтага.



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Проста ў пачатку «нулявых» дзеці не ведалі, што такое «УКантакце»...***

— І што такое мабільны тэлефон, планшэт, камп'ютарныя гульні... У мяне тады была гульнявая прыстаўка «Дэндзі», потым з'явілася «Сега». Вось на іх я адрываўся.

***— Мясцовая каманда «Ведрыч-97» у цябе карысталася павагай?***

— Так, я таксама хадзіў на іх матчы. Заспеў тыя часы, калі яна збірала на стадыёне шмат людзей. Але ў гэты клуб мяне не ўзялі і нават не разглядалі маю кандыдатуру.

***— Для футбаліста крыўдна, калі каманда з роднага горада не звяртае на яго ўвагу...***

— У камандах нярэдка не цэняць сваіх выхаванцаў. Падобная сітуацыя была і ў Рэчыцы. На сваіх хлопцаў там асабліва не разлічвалі.

***— А пасля тваіх першых поспехаў, напэўна, загаварылі: «Ой, дык гэты ж Ваня — наш рэчыцкі выхаванец!».***

— Такія размовы былі, калі я пераходзіў з калінкавіцкай «Вертыкалі» ў мінскі «МТЗ-РІПА». У мясцовых газетах пісалі аб тым, што наш рэчыцкі хлопец перайшоў у мінскую каманду з Вышэйшай лігі. Пісалі — і пісалі. Ставіўся да гэтага спакойна. Калісьці я там сапраўды трэніраваўся, аднак на гэтым усё скончылася. Скажу толькі адно: усё, чаго я дасягнуў, здзейснілася дзякуючы маёй веры, дапамозе блізкіх, у прыватнасці, маёй маці, якая ўвесь час мяне падбадзёрвала. Я не наведвальнік начных клубаў і бараў. Стараюся ўвесь час траціць на трэніроўкі. Не апошнюю ролю ў маёй біяграфіі адыграла і шанцаванне. На маім шляху трапляліся выключна добрыя людзі, якія дапамагалі. У Калінкавічах гуляў Руслан Белаш, які мне добра дапамог з працягам кар'еры. Мы і сёння з ім у добрых стасунках. Ну і, безумоўна, важнае значэнне для мяне мае трэнер Юрый Пунтус. Менавіта ён узяў мяне ў «МТЗ-РІПА». Калі б не Пунтус, я наўрад ці сядзеў бы зараз у кавярні і размаўляў з вамі.

***— А дзе б ты быў?***

— Цяжка сказаць. Быў перыяд, калі я разважаў наконт свайго жыцця. Увесь час займаўся футболам, пасля хадзіў да рэпетытараў, потым не паступіў на вочную форму навучання ў Мінск. У выніку паступіў на «завочку» . Спорт дапамог уладкавацца на працу. Спачатку працаваў на рынку, пасля — на метызным заводзе ў Рэчыцы. У працоўнай кніжцы было запісана «укладчык-упакоўшчык». Я займаўся тым, што клеіў этыкеткі на каробкі для цвікоў і ставіў іх на драўляны паддон. І так усю змену. Спачатку ўсё рабіў уручную, але праз месяц перайшоў на аўтаматычную ўпакоўку. Калі мне прапанавалі паехаць гуляць у другую лігу ў Калінкавічы, я не разважаў — пагадзіўся адразу. Я проста хацеў гуляць у футбол.

***— Многія футбалісты на заводскіх спаборніцтвах заканчваюць сваю кар'еру, а ты наадварот, з іх пачынаў.***

— Гэта былі звычайныя турніры паміж цэхаў. Як толькі ўладкаваўся, мы адразу паехалі на нейкія спаборніцтвы ў Гомель. Выступалі за нас звычайныя людзі, хоць сярод іх былі і тыя, хто таксама калісьці займаўся футболам. Памятаю, што гулялі ўсе нармальна, карэктна. Ніхто нікога па нагах не біў.

***— Цікава, а завод цябе чаму-небудзь навучыў?***

— Дзякуючы яму я зразумеў, што гэта сапраўды цяжкая праца, і грошы людзям проста так не дастаюцца.

***— У другой лізе многія гуляюць выключна за ідэю. Тваё выступленне за калінкавіцкую «Вертыкаль» табе не здаецца рамантыкай?***

— Калі я толькі там пачынаў, у мяне ў вачах замест зрэнак былі сэрцайкі. Я ў камандзе, і гэта супер! Грошы галоўным для мяне не былі. Хацелася трэніравацца, бегаць, гуляць. Галоўнае, каб мне далі 100 тысяч на харчаванне, і ўсё будзе добра. Астатняе было ўсё роўна. Калі ездзіў на дызелі ў Калінкавічы, да якіх трэба было дабірацца 3 гадзіны, маці збірала мне валізкі з ежай. Яна дапамагала мне заўжды. І нават тады, калі ў Мінску былі праблемы з грашыма, яна дасылала мне іх пераводам, і я хадзіў па іх у галоўпаштамт.

***— Пераход у сталічны «МТЗ-РІПА» наогул стаўся для цябе космасам?***

— Безумоўна. Я толькі нядаўна бачыў па тэлевізары, як гэтая каманда заваявала Кубак Беларусі, а тут Юрый Пунтус прапанаваў кантракт. Пры гэтым жадання трапіць выключна ў сталічную каманду ў мяне не было. Жыў тады паводле правіла: «Як будзе, так і будзе».

***— Пасля аднаго фізічнага практыкавання ў Калінкавічах ты літаральна не мог хадзіць. А што было самым складаным у новай камандзе?***

— Для мяне ўсе практыкаванні напачатку былі складаныя, бо з імі ніколі не сутыкаўся. І калі папрасілі зрабіць доўгую перадачу, я стаяў і думаў: «А што будзе, калі не атрымаецца?» Я толькі падыходзіў да мяча, а нага ўжо дрыжэла.

## «У Польшчы легіянераў па галоўцы не гладзяць»

***— У Польшчу ты пераехаў толькі ў студзені. А ці былі магчымасці гуляць за замежны клуб раней?***

— Мяркую, што не. Па чутках, мной цікавілася каманда з Казахстана, але ніякай канкрэтыкі з гэтым варыянтам не было. Нармальная прапанова з'явілася гэтай зімой. Я быў на адпачынку, мне патэлефанаваў агент і сказаў, што ёсць варыянт паехаць у польскую каманду «Завіша» з Быдгашчы. Амаль адразу пагадзіўся. У выніку падпісаў кантракт.

***— Дарэчы, наконт агентаў. Ведаю, далёка не ўсе трэнеры іх любяць.***

— Не трэба ўсіх футбольных агентаў мераць на адзін капыл. Многае таксама залежыць ад футбалістаў. Чым перашкаджае агент, калі ён можа знайсці табе варты варыянт для працягнення кар'еры? Тут усё залежыць ад цябе. У Польшчы замежнікаў па галоўцы не гладзяць. Там стаўленне да іх не такое як у нас. Калі ты нешта зрабіў не так, як трэба, цябе проста могуць неўзлюбіць мясцовыя хлопцы, і далей будзе цяжка. А таму, калі ты маеш пастаўленую мэту перад сабой, галаву на плячах — трэніруйся, старайся. Так, будзе складана, але з часам прагрэс прыйдзе, і яго заўважаць.

***— Пасля выступлення за «Фрайбург» Віталь Радзівонаў у інтэрв'ю казаў мне наступнае: «Не ведаючы мовы, можна лёгка стаць ізгоем у камандзе. Напачатку могуць прабачаць, а калі заўважаць нежаданне вывучаць мову...». Згодны?***

— Так, і я заўважыў, што нашы легіянеры ў сваіх інтэрв'ю часта робяць акцэнт менавіта на мове. Ведаеце, чым мне падабаецца трэнер Жазэ Маўрыньё? Ва ўсіх краінах, дзе ён працуе, ён імкнецца размаўляць з футбалістамі на мясцовай мове. Калі мяне прадстаўлялі камандзе, я, безумоўна, хваляваўся. Зайшоў у раздзявальню, са мной усе віталіся і казалі «чэсць» («вітаю» па-польску. — **Аўт.**). Мне паказалі маё месца, і я сеў. Мяне ніхто не ведае, я нікога не ведаю і рускую мову ніхто не ведае. Ніхто нічога не кажа. Выглядала гэта крыху пацешна. Ну а пасля хтосьці з хлопцаў загаварыў са мной па-англійску. Калектыў мяне прыняў, ніхто не ігнараваў. Кантактую з усімі.

***— Але з польскай і англійскай мовамі ў цябе цяпер не так усё дрэнна. Нават інтэрв'ю на іх даеш.***

— Я не ўтойваю, што добра вучыўся ў школе. Адзнакі былі высокія. А польская мова для мяне — гэта нейкі мікс беларускай, рускай, і ўкраінскай. І даецца яна мне даволі лёгка. Зразумела, многае залежыць ад слоўнікавага запасу. Буду старацца яго пашыраць. А тое, што мне кажуць, пішуць у газетах, я нядрэнна разумею. Вось і на ўстаноўках перад гульнёй дапамогай перакладчыка ўжо не карыстаюся.

***— Ты ўжо добра знаёмы з польскімі фанатамі?***

— На мой погляд, яны даволі адэкватныя балельшчыкі. Заўжды цябе падтрымаюць, але могуць і пакрытыкаваць.

***— Якое самае дзіўнае месца, дзе давялося даваць аўтограф?***

— Аднойчы разам з сябрам елі марожанае ў гандлёвым цэнтры, і да нас падышоў дарослы мужчына, пачаў казаць кампліменты, папрасіў аўтограф. Чуць падобную падтрымку было вельмі прыемна. Між іншым, у самім горадзе таксама часта падыходзяць аматары, распытваюць, зычаць добрай гульні.

***— Любімае месца для адпачынку ўжо знайшоў?***

— Быдгашч сам па сабе даволі прыгожы горад. У ім няма шматпавярховікаў. Ён утульны, прыемны, хоць і па насельніцтве немаленькі. На экскурсіі і прагулкі насамрэч не так шмат часу. І калі ў цябе адзін выхадны, ён пралятае вокамгненна. Я толькі здолеў выбрацца і прагуляцца па Познані. І тое толькі тады, калі далі два дні на адпачынак. Так, я наведаў многія польскія гарады, але ў мяне пакуль склалася ўражанне збольшага аб іх стадыёнах. А яны там насамрэч выдатныя.

***— Па выніках сезона «Завіша» пакінуў Экстралігу і ты цяпер можаш перайсці ў іншую каманду. Цябе «сватаюць» у розныя клубы, а сам бы дзе хацеў пагуляць?***

— У камандах, якія будуць удзельнічаць у еўракубках. Я двойчы ўдзельнічаў у кваліфікацыі Лігі Еўропы, і гэты вопыт мне вельмі спадабаўся. Таму мне вельмі хацелася б яго зноў паўтарыць. Разлічваю, што цягам гэтага тыдня ўсё вырашыцца.

***— Як лічыш, польскі чэмпіянат — гэта тыя спаборніцтвы, у якіх ты хацеў бы «асесці», пагуляць яшчэ гадоў пяць?***

— Калі б так склалася, я быў бы не супраць. Там адназначна вельмі прыемна гуляць у футбол. Што тычыцца ўзросту, мне зараз 27, і гэта той час, калі футбаліст павінен гуляць. Гэта час росквіту. А вось пра жыхарства за мяжой я пакуль не задумваўся. Усё ж такі, як мне нехта нядаўна сказаў, галоўнае — не месца, дзе ты жывеш, не колькасць пакояў у кватэры. Галоўнае, каб там жыла сям'я.

***— А табе з дзяўчынай прыходзіцца жыць на дзве краіны.***

— Так, аднак шмат што залежыць ад таго, дзе я зараз буду гуляць. Але было б вельмі добра, каб Даша ў Польшчы была разам са мной.

***— Упэўнены, многае з таго, што ты запланаваў, ужо здзейсніў. А ці засталіся ў цябе яшчэ дзіцячыя мары, якія вельмі б хацелася ажыццявіць?***

— Вялікіх мар у мяне не было. Усе з часам здзейсніліся. Але ёсць адно жаданне, якое б вельмі хацелася выканаць. Я ўжо даўно слухаю рэп-выканаўца Эмінема. І было б вельмі добра патрапіць на ягоны канцэрт. Толькі ў Еўропе ён, на жаль, не выступае.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
taras@zviazda.by

# ЯДЗІМ, РАДУЕМСЯ... ХУДЗЕЕМ!



Аляксандр даведаўся пра лішнюю вагу і гатовы паспрабаваць рацыянальны рух пад прафесійным наглядам.

**Аўтар і вядучы праграмы «Урачэбныя тайны плюс» доктар Цярэшчанка, які і раней выдатна расказваў ды паказваў, як жыць-пажываць, каб хвароб не было, каб здароўя прырасло, на гэты раз вырашыў пайсці «ў народ».**

На тэлеканале НТБ-Беларусь паспяхова завяршыўся спецпраект Аляксандра Цярэшчанкі «Тое, што доктар прапісаў!». Беларускія гледачы з цікавасцю сачылі за «васьмёркай смелых» — мужчынамі і жанчынамі рознага ўзросту, якія вырашылі заняцца сваім здароўем пад пільным позіркам тэлекамер і самога Цярэшчанкі.

Удзельнікаў праекта падзялілі на тры групы: з лішняй вагой; тых, каму прапануюць павышаныя фізічныя нагрузкі, і 50+. Умовай удзелу ў праекце быў штодзённы кантроль за сваім станам і выкананне рэкамендацый урачоў па рацыянальным харчаванні з уключэннем у рацыён прадукцыі Exponenta. На падставе вынікаў аналізаў, кансультацый ўрачоў-спецыялістаў і фітнес-трэнераў для кожнага ўдзельніка была распрацавана персанальная картка харчавання і фізічных нагрузак з улікам тых адхіленняў у здароўі, якія былі спачатку выяўлены. Фінал праекта, які нядаўна быў таксама паказаны ў тэлеэфіры, уразіў і арганізатараў, і ўдзельнікаў.

З самага пачатку васьмёрка смелых здала аналізы крыві. Высветлілася, што нават у маладых і стройных ёсць пэўныя адхіленні ў здароўі, а таму першае, што ўсім нам «доктар прапісаў» — рэгулярнае медыцынскае абследаванне. Неабходна хоць бы раз на год здаваць элементарныя аналізы і кансультавацца з урачом-тэрапеўтам, каб выяўляць магчымыя парушэнні на самым раннім этапе.

«Наогул мы хацелі дабіцца, галоўным чынам, змены стэрэатыпаў у паводзінах большасці беларусаў — паказаць, што правільнае харчаванне і аптымальная фізічная нагрузка дапамогуць палепшыць агульны стан здароўя, наша самаадчуванне», — кажа Аляксандр Цярэшчанка. Харчаванне павінна быць багатым на бялок, агародніну, садавіну, ненасычаныя тлушчы, да якіх адносяцца алеі. Фізічная нагрузка — прыемная для канкрэтнага ўдзельніка праекта, што стала магчымым дзякуючы падключэнню да праекта аквапарка «Лебядзіны», дзе прапаноўваўся як фітнес, так і водныя працэдуры.

...У кожнага ўдзельніка свой план «новага жыцця». Скінуць лішнюю вагу не было самамэтай у гэтым выпадку, аднак удзельнікі «важкай» групы заўважна пастрайнелі! Самы лепшы вынік — мінус 15 кг. Дарэчы, цяпер, калі праект завершаны, а карысныя звычкі засталіся, некаторыя працягваюць фіксаваць зніжэнне вагі.

Паводле слоў **галоўнага тэрапеўта Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вольгі МАРШАЛКІ,** праект дапамог зразумець, што ёсць здароўе і наколькі яго захаванне залежыць ад нас саміх.

— Асноўныя парушэнні ў харчаванні беларусаў звязаны са злоўжываннем жывёльнымі тлушчамі і недахопам у рацыёне поліненасычаных тлустых кіслот, якія ёсць у марской рыбе, алеях, арэхах, — кажа **вядучы навуковы супрацоўнік РНПЦ гігіены Ірына КЕДРАВА.** — У працэнтных суадносінах ненасычаныя тлушчы павінны пераважаць у параўнанні з жывёльнымі. Шмат спажываем мы і рафінаваных прадуктаў, якія валодаюць вялікай спажывўнай каштоўнасцю і не змяшчаюць пры гэтым вітамінаў, мінеральных рэчываў, харчовых валокнаў. Адсюль высокая распаўсюджанасць сардэчна-сасудзістых захворванняў, а яшчэ і лішняя вага, звязаны з ёю цукровы дыябет 2 тыпу, а таксама анкалагічныя хваробы.

Прынамсі, харчаванне ўдзельнікаў праекта дапаўняла малочная прадукцыя для аздараўлення Exponenta, якая прадаецца ва ўсіх буйных гіпермаркетах краіны. Гэта не проста малако, сыр, тварожная маса і кісламалочныя напоі з напаўняльнікам ці без яго. 250 г напою Exponenta Active змяшчае столькі бялкоў, амінакіслот і прабіётыкаў, колькі чатыры шклянкі малака. Карацей кажучы, арганізму гарантуецца атрыманне неабходнай колькасці хутказасваяльнага бялку жывёльнага паходжання і карысных амінакіслот, зніжэнне тлушчу ў рацыёне і нармалізацыя стрававання... Увогуле, калі паслухаць усіх удзельнікаў тэлепраекта, то кожны з іх проста на сёмым небе ад шчасця ад атрыманых вынікаў, кожны шкадуе, што прафесіяналы, якія тры месяцы былі побач, вымушаны адпусціць іх у «свабоднае плаванне».

Удзельніца праекта Вольга кажа, што страціла 10 кг і вага працягвае зніжацца. Гэта і не дзіўна. Яна выконвала ўсе рэкамендацыі і, згодна з асабістым раскладам, наведвала ў аквапарку водныя працэдуры, якім адводзіла па чатыры гадзіны за «сеанс», так што дадому вярталася бліжэй да поўначы, калі ўжо не да вячэры. 24-гадовы Раман прызнаецца, што «падзапусціў» сябе (яго вага да праекта — 125 кг!), паколькі абсалютна не сачыў за тым, што і як паглынае. Пачаў сачыць і... на сёння амаль 15 кг мінус. Аляксандр заўважае, што ў яго жыцці з'явілася звычайная радасць, пазітыўныя эмоцыі. Элеанора Уладзіміраўна з групы «50+», якая страціла звыш 10 кг, дагэтуль не можа паверыць у сваё шчасце і надзвычайную папулярнасць сярод знаёмых. Фактычна стала «зоркай», у якой кожны пытаецца «як табе гэта ўдалося?». Сапраўды, жанчыны пасля 45-ці цудоўна ведаюць, як год ад года кілаграмы пачынаюць проста ліпнуць і трымаюцца мёртвай хваткай. 26-гадовая хударлявая Ірына была ўпэўнена, што сюрпрызаў чакаць не варта. Але памылілася. Вынікі першапачатковых аналізаў аказаліся не надта добрымі — выявілася, напрыклад, нястача вітаміну D. Аднак праз тры месяцы сітуацыя была ўжо амаль ідэальнай, так што дзяўчына не збіраецца збочваць з указанага шляху. Самы важкі вынік страты вагі паказала Аксана — мінус 15 кг цягам трох месяцаў, аднак на сёння ўжо ўсе 18! Калі яна ўбачыла прапанаваную ёй дыету з 6-разовым ужываннем ежы, то падумала, што праз тры месяцы вага яе дакладна не на парадуе. Фітнес жа быў для дзяўчыны проста пакараннем — так ніяўтульна яна спачатку сябе адчувала.

Дарэчы, самае галоўнае ў фізічных нагрузках — станоўчыя эмоцыі. Не трэба ставіць перад сабой нейкія завоблачныя мэты, нагрузкі не павінны быць катаргай, а ўсяго толькі тым стылем жыцця, які спрыяе фізічнаму і псіхічнаму здароўю.

Застаецца дадаць, што сачыць за сабой сучаснаму чалавеку выдатна дапамагаюць разумныя прылады — у кожным доме сёння могуць быць не толькі электронны тэрмометр, танометр, вагі, але і шэраг іншых прыстасаванняў кантролю за медыцынскімі паказчыкамі, напрыклад, крокамер, тлушчааналізатар.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*



## ■ На заметку



### ПЯЦЬ АРГУМЕНТАЎ У АБАРОНУ БУЛЬБЫ

**Дыетолагі ніколі не кажуць, што бульба — гэта проста крухмал і «пустыя» калорыі, тым больш не забараняюць цалкам яе ўжыванне. На тое ёсць пяць прычын.**

**Першая — калій.** У буйной бульбіне — прыкладна палова дзённай нормы гэтага мікраэлемента для здаровага чалавека. Калій перашкаджае абязводжванню, паніжае ціск, дапамагае спартсменам дабівацца спартыўных мэт. Калі ў гэтым пытанні вы робіце стаўку на бананы, то ведайце, што яны не настолькі багатыя на калій, як бульба.

**Другая — харчовыя валокны.** Калі ўжываць бульбу з лупінай, то вы іх атрымаеце (адна буйная бульбіна — чвэрць дзённай нормы). Харчовыя валокны не толькі падаўжаюць насычэнне, але паляпшаюць страваванне, спрыяюць рабоце кішэчніка, зніжаюць узровень халестэрыну.

**Трэцяя — вітамін С.** Лупіна ад буйной бульбіны падорыць нам каля 30 мг, што складае амаль палову дзённай нормы. Вітамін С — антыаксідант, і гэтым усё сказана.

**Чацвёртая — марганец.** Адна бульбіна дасць нам трэць дзённай нормы. А патрэбен марганец для перапрацоўкі бялку, вугляводаў і халестэрыну, ён таксама ўдзельнічае ў фарміраванні касцей.

**Пятая — вітамін $B_6$.** Удзельнічае ў сінтэзе бялкоў, нейрамедыятараў, рэгуляцыі цэнтральнай і перыферычнай нервовых сістэм, дапамагае сінтэзаваць бялкі, гемаглабін, прастагландзіны, зніжае ўзровень халестэрыну і паляпшае ліпідны абмен. Буйная бульбіна — каля 45 працэнтаў дзённай нормы.

Застаецца дадаць, што бульба абавязкова павінна быць у рацыёне, але не штодня. Пералічаныя карысныя рэчывы можна ўсё ж такі атрымліваць не толькі з ёю. Ну, і самае галоўнае — як есці гэту гародніну? Запякайце ў лупіне з аліўкавым алеем і любімымі духмянымі травамі.

### ПАМЯТАЕМ ПРА БАЛАНС

**Важную ролю пры дадатковых фізічных нагрузках адыгрывае здаровае харчаванне, якое павінна ў поўным аб'ёме пастаўляць арганізму энергетычныя і арганічныя рэчывы, ваду, мінеральныя рэчывы, макраэлементы, вітаміны, клятчатку, пекціны і іншае. Трэба мець на ўвазе, што заняткі фізічнай культурай і спортам патрабуюць павышанага спажывання карысных рэчываў. Таму ўмацаваць здароўе без здаровага харчавання нерэальна.**

У арганізме чалавека знаходзіцца велізарная колькасць відаў арганічных малекул, але для падтрымкі здароўя дастаткова і 24-х арганічных рэчываў — 9 незаменных амінакіслот, дзве тлустыя кіслаты і 13 вітамінаў. З неарганічных рэчываў нам неверагодна патрэбны 15 — кальцый, фосфар, натрый, хлор, калій, ёд, жалеза, магній, медзь, цынк, кобальт, хром, марганец, малібдэн і селен.

Рацыён харчавання павінен:

- адпавядаць энергазатратам арганізма;
- быць збалансаваным — змяшчаць у дастатковай колькасці бялкі, тлушчы, вугляводы, вітаміны, ваду, мінеральныя рэчывы;
- змяшчаць прадукты як жывёльнага (гэта паўнавартасны бялок з усімі незаменнымі амінакіслотамі, вітамінамі і інш.), так і расліннага (незаменныя тлустыя кіслоты, харчовыя валокны і інш.) паходжання.

Сёння актыўна развіваецца фармакалогія здаровага чалавека — прэпараты з ліку амінакіслот, полівітамінныя комплексы, гепатапратэктары, імунакарэктары, адаптагены расліннага, жывёльнага і нават грыбнога паходжання і г.д., аднак, каб вызначыцца, што патрэбна менавіта вам, неабходна кансультавацца са спецыялістамі.


**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Независимая строительная экспертиза

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельоблстрой», 8(0232) 57 92 53**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 350/U-165292, (готовность строения – 51%, общая площадь – 530,4 кв.м) по начальной цене – 552 000 000 рублей с НДС.<br>- Паровой котел ДЕ 6,5 ГМ по начальной цене – 75 456 000 рублей с НДС, паровой котел ДЕ 6,5 ГМ по начальной цене – 75 456 000 рублей с НДС, паровой котел ДЕ 6,5 ГМ по начальной цене – 75 456 000 рублей с НДС, паровой котел ДЕ 6,5 ГМ по начальной цене – 75 456 000 рублей с НДС.<br>Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007005738 площадью 0,1761 га. | 853 824 000 | 85 382 400 |
| Адрес объекта продажи | Гомельская обл., г. Гомель, ш. Кореневское, 6Б | | |
| Срок подачи заявления | **По 06 июля 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** | | |
| Дата, время, место проведения аукциона | **08 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46,оф. 2** | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС- Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» | | |
| Условие пользования | Объекты продаются в собственность. | | |
| Условия продажи | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи.<br>Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. | | |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**



**Центр Промышленной Оценки**
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Стародорожский механический завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**

**по продаже здания насосной станции,**

**общ. площадью 153,9 кв.м, инвентарный номер 645/С-7621, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. 8 Марта, д. 2а.**

**Начальная цена с НДС – 114 912 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 0,0376 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения и обслуживания насосной станции).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **5** (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.05.2015 г.*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **09.07.2015** в 14.00 по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Кривошеина, д. 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.07.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, оф. 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029-183-69-71.**

■ Хто каго?

# «ХАЙ МІНАЮЦЬ ЗІМЫ, ВЁСНЫ, НЕ ЗАКРЭСЛІВАЙЦЕ ВЁСКУ...»

**Спачатку — анекдот: адзін доктар на пачатку лета частку адпачынку ўзяў, на паляванне паехаў. Праз нейкі час вяртаецца — незадаволены, злы. «Зусім не пашчасціла, — кажа калегам, — за два тыдні нікога не забіў...» Адна з медсястрычак тут як тут: «А я гаварыла, што лепш вам у бальніцы застацца!..»**




Дай Бог, не ў вашай! І не ў нашай! Бо тады, вядома ж, не да жартаў будзе. А так... Чаму б не пасмяяцца? Як, дарэчы, і з чарговага здымка? Кіньце позірк (на верхні) і разам са **спадарыняй Валянцінай Гудачковай з Жыткавіч** падумайце:

*Што нам кажа фота гэта?*
*Зорка — стала для партрэта:*
*У ціхім лузе, сонным ранкам...*
*Гэта модна — фота ў рамку!*

А потым — на сцяну... Хоць у працоўным кабінеце, хоць у зале, хоць у кухні... І, магчыма, нават з подпісам. А ўжо вартым смеху ці вартым слёз — выбар за вамі. Наша справа — прапанаваць. Спачатку — і па традыцыі — больш сумныя.

«Мой дзед быў заядлы паляўнічы, прычым настолькі, што кінуў гэты занятак, хіба састарэўшы... Тады ж іншаму чалавеку і ў іншую вёску свайго сабаку перадаў, — узгадвае **спадар Мікалай Старых з Гомеля.** — Але ж праўду людзі кажуць, што воўка ў плуг, а ён — у луг. Так і той сабака: разам з новым гаспадаром трапіў неяк у нашу вёску і тут жа — да дзеда. У двор уляцеў, да кожнага падскочыў, рукі аблізаў — быццам павітаўся, быццам падзякаваў нам за ўсё добрае, што тут меў. Дык можа, і гэтая каroўка глядзіць у той бок, дзе жыла раней, дзе нарадзілася, дзе прайшлі яе найлепшыя гадкі?»

І далей — ужо рыфмаваным радком — дадае:

*На родны Двор Лысуха паглядае,*
*Свае гады былыя ўспамінае,*
*Як гаспадар, калі ён быў здаровы*
*І сілу меў яшчэ трымаць карову,*
*Садавіною частаваў,*
*У яслі сена ўволю клаў...*
*Няма яго на гэтым свеце.*
*А ў тым двары — гуляе вецер.*

Бывае, на вялікі жаль. І не толькі з дваром, а з цэлымі вёскамі:

*Новы Двор даўно не новы,*
*А забыты Богам край:*
*Сем сяліб — адна карова,*
*Вось і ўвесь сялянскі рай.*
*Ціха ў вёсцы сёння стала,*
*Бы ў прытулку для старых.*
*...Малака ў Малюты мала,*
*Але ж хопіць на ўсіх, —*

Піша так **спадарыня Ніна Бурко з вёскі Капланцы, што на Бярэзіншчыне.** Піша аб тым, што добра ведае: у іх у раёне больш за 30 вёсак, «дзе людзей як кот наплакаў: тры бабулі ды дзед Якаў». А то і менш...

Ды і ў аграгарадках, як лічыць **Ніна Мацвееўна**, моладзь не сказаць каб з ахвотай пускае карані, бо на зямлі, вядома, гарбатым стаць лёгка, а вось багатым — наўрад...

Хоць сітуацыя, на думку чытачкі, магла б змяніцца. У прыватнасці, «калі б мясцовыя ўлады дапамагалі ўсіх каровак з уласных падворкаў поўнасцю забяспечваць кармамі, вясковыя статкі не змяншаліся б, як у нашых Капланцах — са 120 галоў да 19».

І сапраўды, паводле **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска:**

*Быў калісьці гэты Двор*
*Мнагалюдны, новы...*
*Ды дажыў з нядаўніх пор*
*Да адной каровы.*

«Баліць душа за нашу вёску, — піша і **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** — выміраюць яны, знікаюць. Разам з імі знікае велізарны пласт нашай культуры, з карты Беларусі сціраюцца назвы, часам вельмі арыгінальныя».

Адсюль:

*Мой чыноўнікам дакор:*
*«Хто закрэсліў «Новы Двор»*
*Як неперспектыўны?»*
*...Наламалі з гэтым дроў:*
*У сяле — няма кароў,*
*Знік і люд актыўны.*

Трэба разумець, актыўны да працы? Бо іншых «актывістаў» **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна** на здымку ўбачыў:

*Да чаго ж мы дажылі?!*
*Тут — нібыта ў песні:*
*Як карову не звялі,*
*Дык ланцуг панеслі!*

Ланцуга і сапраўды няма. Што ёсць, — піша **спадар Анатоль:**

*Пяцьдзясят я ўжо адзначыў —*
*Не дзіця наіўнае.*
*І на здымку тым не ўбачыў*
*Анічога дзіўнага.*
*Але ўсё ж — нібы ўкалола,*
*Кінула ў холад,*
*Бо апошняя карова*
*Хоча збегчы ў горад.*

Чаму? Версія адказу на гэтае пытанне ад **спадарыні Валянціны Козыр з Мінска:**

*— І чаму я тут стаю? —*
*Хто ні ідзе — пытаецца.*
*— Я — чакаю старшыню,*
*Які дзесь хаваецца,*
*Бо не можа адказаць,*
*Дзе ж мне ночку начаваць?*

Недзе за кадрам, як трэба разумець, **спадарыня Валянціна** ўбачыла наступствы стыхіі: разбураную ферму, знесены дах...

Што можа быць яшчэ горш, мяркуе **спадарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна.** Ад яе ж і для пачатку — анекдот. Маўляў, чаму карова такая сумная? Таму што аніякага, можна сказаць, інтыму не мае — хіба раз на год.

Адсюль:

*Пабыла карова*
*У вёсцы Новы Двор.*
*Вельмі спадабаўся*
*Ёй бычок Бугор.*
*І цяпер дадому*
*Ногі не нясуць,*
*За Бугром каровы*
*Усё-ткі лепш жывуць!*

І сапраўды:

*Для вяскоўцаў гэта тэма —*
*Набалелая праблема:*
*«Больш здавайце малака!» —*
*А як здаць? Няма быка...*
*Кажуць:*
*«Ёсць асеменатар».*
*Толькі дзе ж ён, распракляты?*
*У Новы Двор пайшоў «паддаць» —*
*Трэці тыдзень не відаць!*

Піша так **спадар Валерый Гаўрыш.**

З яго ж канверта радкі:

*Чаго чакае і чаму*
*Лыска ля дарогі?..*
*Няма, бач, з кім,*
*Няма і каму*
*Ёй наставіць рогі.*

Бяда! Яшчэ адну — прычым зусім нечаканую — убачыў на здымку (можна зноў на яго зірнуць) **спадар Мікола Кісель:**

*Вельмі строгі тут адбор,*
*Як на конкурс прыгажосці:*
*У каго пралазяць косці,*
*Той трапляе ў Новы Двор.*

Адчуваеце, наколькі празрыста арганізаваны «кастынг»? Ніякіх падстаў для махлярства і для падтасовак: прайшоў праз «брамачку», значыць, у Двары, а не — выбачай...

Хоць заблытацца (на думку **спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля**) можна таксама:

*Дзе праўда тут, а дзе мана?*
*Карове звышзадача:*
*У Новы Двор зайшла б яна,*
*Ды сконфузіўся, няйначай?*
*Не разбярэцца аніяк,*
*Хоць лопні ты, хоць трэсні:*
*Які бязмен, які вар'ят*
*Тут назву перакрэсліў?*

І каб яе адну...

Зноў жа — анекдот: «Гэтая вёска — святая», — казаў адзін мужык другому. «Чаму?» — «Ды начальства на ёй крыж паставіла».

Ці толькі палову крыжа, як на гэтым здымку. І якраз для таго, каб кароўка, паводле **спадара Міколы Кісяля**, магла сказаць:

*Я чакала пойла*
*Тут дзянёчак кожны,*
*Думала, што стойла...*
*А тут знак дарожны!*

Яго, вядома ж, убачылі многія. Але толькі **спадар Анатоль Гарачоў** расказаў:

*Мне знаёмая гэта карціна:*
*Як зірну на яе — вар'яцею!*
*На асфальце пасецца скаціна,*
*Што здзіўляе —*
*пакрыху таўсцее...*

І не толькі ж (таўсцее). Як заўважае **спадарыня Валянціна Козыр:**

*Ні кала і ні двара*
*Ў Зоркі ў маладосці...*
*А надоі ўзняла,*
*Дык прыдбала штосьці:*
*Злева — кол і справа — кол,*
*Зверху — шыльда: Новы Двор!*
*Хіба ж не багатая*
*Зорачка рагатая?!*

Яшчэ і якая! «Паглядзіце!» — усклікаюць, прынамсі, **сужэнцы Астроўскія** з Мінска:

*...Колькі дрэўцаў ля дамоў,*
*Колькі тут прастору!*
*Для людзей і для кароў*
*Чым не санаторый?*

А вось чаргі — няма, каб пуцёўкі купіць. Не едзе народ, не заводзіць кароў... З таго ж канверта канстатацыя факта:

*Ля мястэчка Новы Двор*
*Проста велічны прастор!*
*На гектары муравы*
*Дзве буйныя галавы.*

Слушная думка: дык, можа, не выпускаць іх? Трымаць у хляве?

Успамін з нагоды. У аднаго тутэйшага дзядка пыталі пра кароў: маўляў ці трымае? «А навошта яе трымаць, — адказаў, — выпусціў, ды хай сабе ходзіць». — «То хаваеце?» — «А навошта хаваць?.. Калі нехта захоча ўкрасці, то дакладна ўкрадзе!..»

Так і не даведаліся, як трэба спытаць, ёсць у гаспадарцы кароўка альбо няма? А калі ёсць, то (на думку **сужэнцаў Астроўскіх**):

*Прагрэс нам кажа: людзі, годзе*
*Трымаць каровак на прыродзе.*
*Прыбытак можа большы быць,*
*Калі на комплексах карміць!*

І там жа — даіць, паіць...

Зрэшты, гэтую тэму трэба пакінуць спецыялістам — хай яны абмяркоўваюць. Мы ж, завяршаючы чарговы конкурсны агляд, прапануем яшчэ некалькі подпісаў. Ад **спадарыні Валянціны Гудачковай:**

*Быў калісьці Двор вясёлы:*
*Што ні год, то навасёлы,*
*Шчыравалі на палетках*
*І дарослыя, і дзеткі...*
*Ды паціху ўсё звялося,*
*Толькі фота засталося.*

І з таго ж канверта:

*Калі час прыходзіць новы,*
*То і другія пабудовы*
*(пра кароў — няма размовы):*
*Усё катэджы, гаражы...*
*Хай мінаюць зімы, вёсны,*
*Не закрэслівайце вёску!*
*Будзе вёска — будзем жыць!*

Нехта, магчыма, спрачаўся б з такой высноваў, мы — не будзем. Мы акурат на восьм гэтай жыццесцвярджальнай ноце скончым чарговы агляд. Застаецца падвесці вынікі? Калі ласачка: на папярэднім здымку (гл. «Звязда» за 5 мая) двое вайскоўцаў некуды беглі з дзіцячымі вазкамі. Дык вось, найлепшыя радкі пра іх, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, напісалі **сужэнцы Астроўскія, спадарыні Марыя Грышчанка з Дзяржынска і Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны, спадары Мікалай Старых з Гомеля, Мікола Кісель з Мінска, Валерый Гаўрыш з Чавусаў... І Анатоль Гарачоў.**

З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе бясплатнай квартальнай падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» накіроўваецца ў вёску Даўнары, што на Іўеўшчыне. Хочаце, каб да вас? Не пытанне: уважліва глядзіце на чарговы конкурсны здымак, прыдумвайце кароткі (не больш за восем радкоў) дасціпны подпіс, дасылайце ў рэдакцыю. Шанцы на выйгрыш ёсць!

**Валянціна ДОЎНАР.**
dounar@zviazda.by

**Ад яе ж** заўсёдныя прабачэнні тым, чые прапановы не вытрымалі строгага конкурснага адбору, і заўсёдная просьба: пішыце! Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Приорбанк** RZB Group

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2015 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 апреля 2015 | на 1 апреля 2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 1 066 493 | 893 929 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 5 155 | 3 386 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 1 038 107 | 1 106 072 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 786 906 | 718 031 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 1 703 731 | 674 638 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 16 102 229 | 12 605 629 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 1 180 906 | 1 604 265 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 3 927 | 772 |
| 10 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 1 560 496 | 1 330 427 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 8 726 | - |
| 14 | Деловая репутация | | | - | - |
| 15 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | 78 |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 1 256 116 | 818 998 |
| **17** | **ИТОГО активы** | **11** | | **25 712 792** | **19 756 225** |
| **18** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 165 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 5 649 329 | 5 382 913 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 14 068 434 | 10 033 533 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 509 119 | 198 012 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 14 231 | 14 800 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 1 891 252 | 1 135 433 |
| **26** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **22 132 365** | **16 764 856** |
| **27** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 412 279 | 412 279 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 1 267 410 | 956 198 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 711 614 | 670 123 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 1 166 678 | 929 642 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 3 557 981 | 2 968 242 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | 22 446 | 23 127 |
| 35 | Всего собственный капитал | 121 | | 3 580 427 | 2 991 369 |
| **36** | **Итого обязательства и собственный капитал** | **12** | | **25 712 792** | **19 756 225** |
| 37 | Капитал дочерних юридических лиц | | | - | - |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2015 года

«Приорбанк» Открытое акционерное общество

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | на 1 апреля 2015 | на 1 апреля 2014 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 840 532 | 519 437 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 361 255 | 253 317 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 479 277 | 266 120 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 355 612 | 274 999 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 54 558 | 40 727 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 301 054 | 234 272 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 1 514 | 270 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (12 513) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 95 256 | 11 618 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными инструментами | 206 | | 160 436 | 64 096 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 446 495 | 122 432 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 314 395 | 214 660 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 582 130 | 394 815 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 35 366 | 24 078 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 275 428 | 249 711 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 85 286 | 35 878 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **190 142** | **213 833** |
| 18 | Доля в прибыле (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыле (убытке) совместноконтролируемых юридических лиц | | | - | - |
| **20** | **ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | | | **190 142** | **213 833** |
| 19 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 199 387 | 212 185 |
| 20 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | (9 245) | 1 648 |

Председатель Правления С.А. Костюченко

Главный бухгалтер В.В. Манцивода

Финансовая отчетность банка в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: http://www.priorbank.by/r/news/accounting/quarter_cons/quarter_2015/quarter_04_15/

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Государственное предприятие**

**«УКС Фрунзенского района г. Минска»**

**в дополнение и изменение к ранее опубликованным проектным декларациям**

**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.

Тел./факс 204-67-99, 256-64-18.

**Режим работы** – 8.45 – 18.00, обед 13.00 – 14.00; пятница 8.45–16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Проектом предусмотрено строительство 10-этажного жилого дома № 22 по генплану, расположенного во Фрунзенском административном районе г. Минска, на территории бывшей деревни Сухарево.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 4 трёхкомнатные квартиры: № 27, № 31, № 35, № 7 (с индексацией).

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве трёхкомнатной квартиры – **14 700 000** белорусских рублей.

Начало строительства – 25.11.2014 года, окончание – сентябрь 2015 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102, тел. 256-64-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) лица, с кем заключается договор;
- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трёх) банковских дней с даты получения договора.

Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв.м общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 16 июля 2015 г. повторных торгов по продаже конфискованного имущества

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| **Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества** | **Начальная цена, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| Земельный участок с кадастровым номером 622087800001000129 площадью 0,1032 га, расположенный по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Садоводческое товарищество «Весна» (категория: земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов; целевое назначение: земельный участок для садоводства в садоводческом товариществе «Весна») | 24 498 000 | 2 449 000 |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится **16 июля 2015 г. в 15.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 01.07.2015 по 13.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

Утерянное страховое свидетельство ФСООО «Белкоопстрах» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВА № 1879429 **считать недействительным.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Речицкий текстиль», г. Речица, Гомельская область, ул. Наумова, 131** |

**Предмет аукциона**
**Объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Комсомольская, 2:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь, кв.м | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Ткацкий цех №1** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 1240,5 | 311/С – 30576 |
| **Склад химикатов** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 118,8 | 311/С-30578 |
| **Административное здание** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 383,5 | 311/С-30581 |
| Обременения | Площади здания частично обременены договорами аренды. | | |
| **Цех ОТК** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 954,3 | 311/С-30582 |
| Обременения | Площади здания частично обременены договорами аренды. | | |
| **Склад** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 19,6 | 311/С-30584 |
| **Трансформаторная подстанция** | Здание специализированное энергетики | 41,1 | 311/С-30585 |
| Составные части и принадлежности: | Пять металлических ёмкостей. | | |
| **Насосная** | Здание специализированное коммунального хозяйства | 26,5 | 311/С-30586 |
| **Здание красильного цеха** | Здание красильного цеха | 595,7 | 311/С-30596 |
| **Здание котельной** | Здание котельной | 317,4 | 311/С-30597 |
| Составные части и принадлежности: | Металлическая труба. | | |
| **Центральное отопление, инв. № 176** | Сооружение специализированное энергетики | 444,65 м | 311/С-46243 |
| Составные части и принадлежности: | Три колодца. | | |
| **Канализационная система, инв. № 377** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 249,96 м | 311/С-46244 |
| Составные части и принадлежности: | Девять колодцев. | | |
| **Благоустройство** | Сооружение неустановленного назначения | - | 311/С-46537 |
| Составные части и принадлежности: | Сооружение благоустройства, состоящее из асфальтобетонного покрытия площадью 4559 кв.м, железобетонного водоёма и железобетонного водоёма пожарного. | | |
| **Сведения о земельном участке:** | пл. 2.0517 предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов обрабатывающей промышленности с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | |

**В том числе:**
- линия электропередач (алюминиевая в оболочке в земле, инв. №367)
- забор железобетонный (инв. 712)
- забор железобетонный (инв. №715)

| Наименование | Инвентарный номер | Наименование | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| Котел паровой | №289192 | Подогреватель пароводяной ПП2-9-7-4 | №714 |
| Котел паровой Е 1-9 | №28919 | Насос ВК1/16 (центробежный) | №54 |
| Электродвигатель | №531 | Насос | №5270 |
| Электродвигатель | №532 | Насос центробежный | №529 |
| Электродвигатель | №2024 | Насос КС12/50 | №530 |
| Электродвигатель | №2025 | Насос подпиточный | №612 |
| Химводочистка | №14 | Насосная установка к28/500 | №713 |
| Водонагреватель | №3899 | Дымосос ДН-3 | №53 |
| Водонагреватель | №5877 | Дымосос | №55 |
| Водонагревательная установка | №289188 | Вентилятор ЦУ-70 | №425 |
| Охладитель | №289189 | ГРУ (газово-распределительный узел) | №291 |
| Колонка ДА-5 | №289140 | Вентиляционная камера | №57 |
| Охладитель | №289191 | Вентилятор ВЦП-8 | №423 |
| Водонагреватель | №10035 | Лифт грузовой грузоп. 500 кг | №35 |

**Начальная цена с НДС 20% – 1 367 114 100 белорусских рублей.**

**Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **28.07.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **24.07.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71, E-mail: auction@cpo.by, www.cpo.by.** |

